**«Калі муж мне падарыў дарагі фотаапарат, я вырашыла, што выдаткаваныя грошы трэба неяк адпрацаваць. Так я пачала здымаць сваіх знаёмых у вобразе герояў карцін славутых мастакоў».** СТАР. 3

**Мікалай Атраховіч — унук слыннага літаратара Кандрата Крапівы. А яшчэ — журналіст са стажам. Ён расказвае пра стасункі са знакамітым дзедам, «пісьменніцкія» гены і ўласны шлях у прафесію.** СТАР. 3

**У якім выпадку чалавек сутыкаецца са стапрацэнтнай верагоднасцю заражэння ВІЧ-інфекцыяй? Што робіцца для прафілактыкі ў гэтым выпадку?** СТАР. 5


Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

1 СНЕЖНЯ 2012 г. СУБОТА № 232 (27347) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА


# ПАКУЛЬ СВІСЛАЧ НЕ СТАЛА

г. Мінск

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАТРАБУЕ Ў СЦІСЛЫЯ ТЭРМІНЫ ЗАВЯРШЫЦЬ МАДЭРНІЗАЦЫЮ ДРЭВААПРАЦОЎКІ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка даручыў завяршыць мадэрнізацыю і рэалізацыю інвестпраекта на ААТ «Барысаўдрэў» да 7 лістапада 2013 года. Адпаведнае даручэнне кіраўнік дзяржавы даў, наведваючы гэтае прадпрыемства ў ходзе рабочай паездкі ў Мінскую вобласць.**

Зараз на прадпрыемстве рэалізуецца інвестпраект па рэканструкцыі і развіцці вытворчасцяў пліткавых драўняных матэрыялаў і лесанарыхтоўкі з укараненнем комплексу энергазберагальных мерапрыемстваў. Першапачаткова тэрмін уводу ў эксплуатацыю новай вытворчасці планаваўся на снежань 2009 года, аднак ён да гэтага часу цалкам не рэалізаваны. «Давайце дамовімся па тэрмінах — 7 лістапада будучага года тут павінна быць «цукерачка», — паставіў задачу Прэзідэнт.

Кошт інвестпраекта складае 80,6 млн еўра. Як далажылі кіраўніку дзяржавы, дзякуючы рэалізацыі праекта, ужо праз два гады аб'ёмы вытворчасці павінны ўзрасці ў вартасным выражэнні больш чым у пяць разоў — да Br533 млрд. Таксама ў разы павялічыцца экспарт вырабленай прадукцыі (з $3 млн да $32 млн) і яго доля ў аб'ёме рэалізаванай прадукцыі (з цяперашніх 38% да 54%).

Запалкавая фабрыка ў Барысаве заснавана ў 1901 годзе і з'яўляецца адным з найстарэйшых прадпрыемстваў дрэваапрацоўчай галіны. У склад ААТ «Барысаўдрэў» уваходзяць лесанарыхтоўчая, дрэваапрацоўчая і мэблевая вытворчасці. Асноўнай прадукцыяй прадпрыемства з'яўляюцца драўнянавалакністыя пліты, клееная фанера, запалкі, мэбля.

Аляксандр Лукашэнка дэталёва агледзеў тэрыторыю прадпрыемства, вытворчыя памяшканні. Пры гэтым ён звярнуў асаблівую ўвагу на пытанні экалогіі: на беразе ракі, які фактычна мяжуе з вытворчай тэрыторыяй, сабралася шмат розных адходаў і смецця. «Трэба разбірацца з гэтымі эколагамі. Яны, напэўна, больш за мяжой бываюць, чым у краіне», — сказаў Прэзідэнт, звяртаючыся да Старшыні КДК Аляксандра Якабсона. Прэзідэнт запатрабаваў, каб у гэтым пытанні быў наведзены належны парадак: «Гэта трэба зрабіць за зіму». Ён таксама звярнуў увагу на рацыянальнае выкарыстанне тэрыторыі прадпрыемства.

Аляксандр Лукашэнка ў цэлым раскрытыкаваў урад і кіраўніцтва прадпрыемстваў за правал праграмы па мадэрнізацыі дрэваапрацоўкі. «Гэтыя гіганцкія праекты ў дрэваапрацоўцы звязаныя з дыверсіфікацыяй нашай эканомікі. Я прыняў такое рашэнне, каб мы менш залежалі ад «старэйшага брата», Захаду, амерыканцаў, а зазямліліся на свае рэсурсы: будматэрыялы, цэмент, сельскую гаспадарку, калійныя ўгнаенні, у тым ліку дрэваапрацоўку. Увесь праект мадэрнізацыі дрэваапрацоўкі правалены», — падсумаваў кіраўнік дзяржавы.

Прычынамі гэтага правалу Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся ў намесніка старшыні канцэрна «Беллеспаперапрам» Сяргея Іванова. Ён у сваю чаргу адзначыў, што «прадпрыемствы не былі гатовыя да падобнай работы». Зацягванне тэрмінаў, на яго думку, таксама звязана са слабасцю праектных арганізацый Беларусі. СТАР. 2

## ЦЫТАТА ДНЯ

**Намеснік міністра інфармацыі Дзмітрый ШАДКО:**

*«Віртуальная прыёмная», або Адзіны дзяржаўны партал для зваротаў грамадзян, ствараецца па даручэнні Прэзідэнта. Гэта першы агульнадзяржаўны праект, звязаны з укараненнем электронных формаў дакументааабароту. Такая сістэма дазволіць аналізаваць увесь паток лістоў, якія паступаюць, а таксама выяўляць найбольш праблемныя трэнды. Па сутнасці справы, гэта абсалютна новы ўзровень маніторынгу і канкрэтны крок па кірунку да электроннага ўраду, стварэннем якога заклапочана і Беларусь, і краіны-суседзі».*

## НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 2° |
| Віцебск | + 3° |
| Гомель | + 4° |
| Гродна | + 1° |
| Магілёў | + 3° |
| Мінск | + 2° |

## Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 1.12.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8560,00 | ▼ |
| Еўра | 11150,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 278,00 | ▲ |
| Укр. грыўня | 1045,21 | ▼ |

■ Парламенцкі дзённік

## СВАБОДНАЯ РАЗМОВА

**Менавіта так спікер верхняй палаты беларускага парламента Анатоль РУБІНАЎ назваў магчымасць сенатараў выступіць перад калегамі па найбольш актуальных пытаннях краіны або рэгіёна. На другім пасяджэнні першай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання «свабодная размова» была прысвечана дзвюм тэмам: міжнароднай дзейнасці парламентарыяў і праблемам гарбарна-абутковай галіны. Пасля гэтага сенатары разгледзелі яшчэ 13 пытанняў.**

### Пра новую рэальнасць

— Наша задача ў тым, каб новы склад Савета Рэспублікі рабіў усё магчымае для абароны нацыянальных інтарэсаў Беларусі, выкарыстоўваючы свае традыцыйныя інструменты: заканатворчасць і актыўную міжнародную дзейнасць, — звярнуўся да дэпутатаў **Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Уладзімір СЯНЬКО**.

Ён адзначыў, што прыярытэтам для парламентарыяў застаецца дзейнасць у інтэграцыйных утварэннях, створаных на постсавецкай прасторы. Асаблівае месца ў дзейнасці Савета Рэспублікі займае развіццё беларуска-расійскіх адносін. «Мы задаволены дасягнутай дынамікай узаемадзеяння з расійскім парламентам», — сказаў Уладзімір Сянько. СТАР. 2




## У БЕЛАРУСІ ВЫБРАЛІ «СЯМ'Ю ГОДА»

**30 лістапада ў Беларускім дзяржаўным акадэмічным музычным тэатры адбыўся суперфінал рэспубліканскага конкурсу «Сям'я года».**

За званне лепшай змагаліся сем сем'яў з усёй рэспублікі — з Пінска, Полацка, Гомеля, Мастоў, Магілёва, Жодзіна і Мінска. Падобны конкурс у нашай краіне праводзіцца ўпершыню. Галоўным яго арганізатарам выступіла Міністэрства працы і сацыяльнай абароны. Узначаліла журы Надзея Ермакова, якая з'яўляецца старшынёй Беларускага саюза жанчын.

Усе мы разумеем, што самы каштоўны рэсурс любой дзяржавы — людзі. А самае каштоўнае для кожнага чалавека — яго сям'я, яго родныя і блізкія. Сувязі з сям'ёй, бацькамі і блізкімі нам людзьмі пранізваюць усё наша жыццё. Менавіта гэта для кожнага з нас застаецца галоўнай каштоўнасцю ў жыцці. Для таго, каб яшчэ больш умацаваць прэстыж сям'і, павысіць яе сацыяльны статус, развіваць сямейныя каштоўнасці і традыцыі, і быў заснаваны новы конкурс.

Ён складаўся з двух этапаў: першы этап — рэгіянальны, які быў праведзены ў кожнай вобласці і г. Мінску; другі — рэспубліканскі. Асноўнымі крытэрыямі, якія дазвалялі ўдзельнічаць у конкурсе, з'яўляліся наступныя: гэта павінны былі быць поўныя сям'і, якія выхоўваюць не менш за двое дзяцей. Стаж шлюбнага жыцця, узрост бацькоў і дзяцей, прафесійная дзейнасць, адукацыя значэння не мелі. У фінале конкурсу былі прадстаўлены розныя сям'і: маладыя, шматдзетныя, з дваімі дзецьмі, але пры гэтым кожная сям'я мае свае значныя дасягненні і поспехі. Ёсць творчыя, спартыўныя сем'і, сем'і, якія вывучаюць гісторыю свайго роду, ёсць і сямейныя дынастыі — дзе прафесія перадаецца з пакалення ў пакаленне.

Фота БЕЛТА.

* * *

Суперфінал сапраўды аказаўся супер! Яркае і відовішчнае шоу, прадуманая конкурсная праграма, канцэрт дзеячаў культуры і мастацтва, феерверк, урачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў — усё было цікавым і відовішчным. Але самая галоўная інтрыга, якая займала ўсіх — і ўдзельнікаў, і гледачоў — заключалася ў тым, хто ж стане «Сям'ёй года»? І вось доўгачаканы адказ — **Гран-пры атрымала сям'я Глазковых з Магілёва** *(на фота)*!

**Дыпломам 1 ступені была ўзнагароджана сям'я Ровенскіх з Мінска. Дыпломам 2 ступені адзначана сям'я Дарошка з Жодзіна. Дыплом 3 ступені атрымалі Галецкія з Гомеля** (дарэчы, пра ўсе сем сем'яў, што ўдзельнічалі ў суперфінале, наша газета ўжо пісала — глядзіце «Звязду» за 20 лістапада).

Сям'я — гэта школа, дзе мы вучымся павазе, разуменню і любові. Мы праходзім праз цяжкасці ў адносінах, вучымся дараваць, прымаць іншага чалавека, прызнаваць свае памылкі. Самае галоўнае — ці будзе сям'я шчаслівай — залежыць ад нас саміх. «Стварайце сваё сямейнае шчасце сваімі рукамі!» — зычаць усе дзевяць членаў сям'і Глазковых.

**Святлана БУСЬКО.**

■ 3 снежня — Міжнародны дзень інвалідаў

## КРОКІ НАСУСТРАЧ

**Жыццё бывае непрадказальным. Здараецца так, што выйшаў паспяховы, здаровы чалавек з вялікімі планамі на жыццё, а вярнуўся... у інваліднай калясцы. Бо ніхто не застрахаваны ні ад ДТЗ на дарозе, ні ад хваробы. У краіне дзейнічае Дзяржаўная праграма аб стварэнні безбар'ернага асяроддзя жыццядзейнасці фізічна аслабленых асоб на 2011-2015 гады. Але не аднымі пандусамі неабходна забяспечваць даступнасць, шлях інвалідаў да звычайнага жыцця.**

### У пошуках памяркоўнасці

Бар'ераў для інвалідаў вельмі шмат. Яны быццам рассыпаны амаль ва ўсіх сферах іх жыццядзейнасці. Нельга забываць і пра даступную інфармацыю, даступнае тэлебачанне, даступныя экстранныя службы, развіццё мовы жэстаў для інвалідаў па слыху, неабходныя інтэрнэт-рэсурсы і друкаваныя выданні для інвалідаў па зроку. Напрыклад, у мінулым месяцы група спецыялістаў органаў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне прайшла навучанне асновам мовы жэстаў. Гэта важны крок насустрач.

Вельмі важная і гатоўнасць самога грамадства прыняць у сваё асяроддзе людзей з абмежаваннямі жыццядзейнасці. Нацыянальнае апытанне, праведзенае гэтай восенню, паказала, што палова рэспандэнтаў пагадзіліся б, каб іх суседам быў чалавек з інваліднасцю. Для 40% цалкам прымальнае сяброўства з такім чалавекам, а 7,6% беларусаў гатовы ўступіць з ім у шлюбныя адносіны. Разам з тым, усяго 25,3% апытаных паказалі, што гатовы ўзаемадзейнічаць з інвалідамі як з калегамі па працы. А 17% беларусаў (нямала!) сказалі, што ніякіх адносін з людзьмі з інваліднасцю яны не збіраюцца падтрымліваць. СТАР. 4

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ЗАКОНЫ ШАРЫЯТУ СТАНУЦЬ АСНОВАЙ КАНСТЫТУЦЫІ ЕГІПТА

Канстытуцыйная асамблея Егіпта прагаласавала за законы шарыяту як падмурак новай канстытуцыі краіны. Такім чынам галоўнай крыніцай права ў дзяржаве павінны стаць мусульманскія догмы, паведамляюць інфармагенцтвы са спасылкай на тэлеканал Al-Arabiya. Галасаванне адбылося на фоне народных пратэстаў (на плошчы Тахрыр у Каіры збіралася да 200 тыс. чалавек), накіраваных супраць пашырэння паўнамоцтваў прэзідэнта Егіпта Мухамеда Мурсі. З моманту звяржэння былога прэзідэнта Хосні Мубарака ў Егіпце ідзе падрыхтоўка да прыняцця новай канстытуцыі. Пасля канчатковага зацвярджэння Канстытуцыйнай камісіяй праекта асноўнага закона ён будзе перададзены на ўхваленне прэзідэнту Мухамеду Мурсі, а затым вынесены на ўсенародны рэферэндум. Пасля рэферэндуму, у выпадку падтрымкі новай канстытуцыі большасцю егіпцян, у краіне павінны прайсці ўсеагульныя парламенцкія выбары.

### «ЕЎРАБАЧАННЕ-2013» ГУБЛЯЕ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ

Грэцыя і Кіпр могуць адмовіцца ад удзелу ў штогадовым музычным конкурсе «Еўрабачанне» з-за крызісу, паведамляе грэцкая газета «Віма». Раней з-за фінансавых цяжкасцяў ад удзелу ў конкурсе, які пройдзе ў шведскім горадзе Мальме з 14 па 18 мая 2013 года, адмовіліся Польшча і Партугалія. Удзел у конкурсе абыдзецца Кіпру прыкладна ў 150 тысяч еўра, і Кіпрская радыёвяшчальная карпарацыя вырашае, ці варта марнаваць гэтыя грошы на конкурс. Кіпр яшчэ не падпісаў дагавор з міжнароднымі крэдыторамі (ЕС, ЕЦБ і МВФ) — на вызначэнне канчатковых параметраў можа спатрэбіцца яшчэ некалькі тыдняў, а ўдзел краіны ў песенным конкурсе можа ўскладніць перамовы. Савет дырэктараў радыёвяшчальнай карпарацыі прыме рашэнне па гэтым пытанні на наступным тыдні.

### ДЭФІЦЫТ ВІТАМІНУ D ПАГРАЖАЕ ДЗІЦЯЦІ КАРЫЕСАМ

Каб прадухіліць карыес, недастаткова рэгулярна чысціць зубы. Навукоўцы Вашынгтонскага ўніверсітэта таксама раяць прымаць вітамін D. Пра карысць вітаміну сведчыць аналіз 24 клінічных выпрабаванняў, праведзеных у Злучаных Штатах, Вялікабрытаніі, Канадзе, Аўстрыі, Новай Зеландыі і Швецыі. У даследаваннях прынялі ўдзел 3000 дзяцей 2-16 гадоў. Аказалася, вітамін D памяншаў рызыку карыесу на 50%. Па словах доктара Піліпа Х'юэла, медыкі ўжо даўно ведалі пра тое, што вітамін D умацоўвае косці. Але гаворка аб прадухіленні карыесу амаль не вялася. Цяпер жа даказана, што вітамін паляпшае мінералізацыю зубоў і костак.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ПАЛЕСЦІНА ПРЫЗНАНА ДЗЯРЖАВАЙ-НАЗІРАЛЬНІКАМ ААН

Генеральная Асамблея ААН большасцю галасоў прыняла рэзалюцыю, якая надае Палесціне статус дзяржавы-назіральніка ў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. За дакумент прагаласавалі 138 краін — членаў Генасамблеі са 193.

Рэзалюцыя «пастанаўляе даць Палесціне статус дзяржавы-назіральніка пры Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, якая не з'яўляецца яе членам». Прызнанне ў якасці дзяржавы дазволіць Палесціне звяртацца ў Міжнародны крымінальны суд у Гаазе з іскамі супраць дзеянняў Ізраіля, у тым ліку запатрабаваўшы вызвалення акупаваных ім тэрыторый.

У дакументе таксама пацвярджаецца права палесцінскага народа на самавызначэнне і незалежнасць у Дзяржаве Палесціна на палесцінскай тэрыторыі, акупаванай з 1967 года. Члены ГА таксама адзначылі неабходнасць неадкладнага аднаўлення блізкаўсходняга мірнага працэсу, які павінен прывесці да «справядлівага, трывалага мірнага пагаднення паміж палесцінскім і ізраільскім бакамі».

КАРАТКА

Прафіцыт рэспубліканскага бюджэту за студзень—кастрычнік склаў Br0,5 трлн., або 0,1 працэнта да ВУП. Даходы рэспубліканскага бюджэту дасягнулі за дзесяць месяцаў Br76,6 трлн., або 79,6 працэнта ўдакладненага гадавога плана. Расходы рэспубліканскага бюджэту склалі Br76,1 трлн., або 79 працэнтаў удакладненага гадавога плана.

Дзяржаўны доўг Рэспублікі Беларусь на 1 лістапада 2012 года склаў Br121,8 трлн. і павялічыўся ў параўнанні з пачаткам 2012 года на Br5,5 трлн., або на 4,7 працэнта. Павелічэнне дзяржаўнага доўгу за кастрычнік бягучага года ў асноўным абумоўлена ростам унутранага доўгу, адзначылі ў Мінфіне.

Паэтапнае скарачэнне рэалізацыі аўтабензіну Нарманль-80 праз аўтазаправачныя станцыі Беларусі плануецца пачаць з 1 красавіка 2013 года. Для павелічэння аб'ёмаў выпуску высокаактанавых бензінаў у ААТ «Мазырскі НПЗ» у снежні 2012 года ўводзіцца ў эксплуатацыю ўстаноўка ізамерызацыі, прызначаная для вытворчасці стабільнага ізамерызату — высокаактанавай дабаўкі аўтамабільных бензінаў. Аб'ёмы вытворчасці аўтамабільнага бензіну AI-92 павялічацца больш як на 200 тыс.т у год.

## ШТО ВАС УРАЗІЛА У БЕЛАРУСІ ПАДЧАС ЯЕ НАВЕДВАННЯ?

### Ірына ФЁДАРАВА, г. Санкт-Пецярбург

— Ад сваіх расійскіх сяброў даводзіцца чуць, што ў Беларусі жывуць значна бядней, чым у Расіі. Шчыра сказаць, мне смешна пра гэта чуць. На мой погляд, далёка не ўсе расіяне заможныя. Пагаджуся, што ў жыхароў Піцера, Масквы зарплаты добрыя, але ў правінцыі — усё інакш. Аднойчы сяброўка запрасіла мяне ў госці да сваіх бацькоў на Пскоўшчыну. Шчыра сказаць, вялікага дастатку там не ўбачыла: бацька вымушаны працаваць на будоўлі ў Маскве, каб пракарміць дваіх яшчэ непаўналетніх дзяцей. У вёсцы — разбітыя дарогі, пустыя будынкі, дзе калісьці былі вытворчыя пабудовы. На наступны год я звазіла яе ў «бедную» Беларусь да сваіх цёткі і дзядзькі, якія жывуць і працуюць у сельскай мясцовасці, маюць асабістую падсобную гаспадарку: парсючка, курэй, агарод. Назад мы ледзьве давезлі хатнія нарыхтоўкі ды далікатэсы, якімі нас нагрузілі. Мая сяброўка была здзіўлена ўзроўнем іх жыцця і дабрабыту, а таксама парадкам і чысцінёй паўсюдна: у вёсцы, на фермах і палях звычайнага беларускага калгаса.

### Крысціна КАНЕЦКАЯ, г. Баксітагорск

— Мая мама — беларуска, нарадзілася на Брэстчыне. У Беларусі я другі раз. Упершыню тут пабывала ў раннім дзяцінстве і мала што помню з тае паездкі. Цяпер жа мне вельмі спадабалася на радзіме маёй маці. Магу з упэўненасцю сказаць, што брэнд Беларусі — гэта чысціня. Як толькі перасякаеш мяжу, адразу відаць, што тут жывуць сапраўдныя гаспадары: добраўпарадкаваныя дарогі, прыгожыя дагледжаныя драўляныя дамы, дыхтоўныя катэджы. Не, не вілы, як на Рублёўцы, а менавіта збудаванні, прыстасаваныя для нармальнага чалавечага жыцця. Мінск таксама прыемна ўразіў — сваімі прасторнымі вуліцамі, шырокімі праспектамі, ветлівымі і гасціннымі людзьмі.

### Сяргей ЦЕЛЕПАЎ, г. Крывы Рог

— Жонка мая з Беларусі, з Магілёўскай вобласці. Калі-нікалі прыязджаем з ёй у госці да сваякоў. Я не заўважаю асаблівых адрозненняў ва ўзроўні жыцця паміж сталічнымі жыхарамі і правінцыялямі. У сучасным аграгарадку, дзе пражывае мая цешча, ёсць усё неабходнае: гандлёвы цэнтр, кавярня, цырульня, спартыўная зала, Дом культуры, лазня. А самае галоўнае, што для мясцовых жыхароў ёсць праца. Няхай зарплата і адрозніваецца ад сталічнай, але пражыць у сельскай мясцовасці на яе можна. Можа, у вас крыху даражэй радыё- і бытавая тэхніка, але ненамнога. Абавязкова купляем, каб узяць з сабой, беларускую вяндліну, каўбасы, сыры. Мясныя і малочныя вырабы ў вас значна смачнейшыя, чым ва Украіне, апошнім часам значна палепшылася і якасць піва.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАТРАБУЕ Ў СЦІСЛЫЯ ТЭРМІНЫ ЗАВЯРШЫЦЬ МАДЭРНІЗАЦЫЮ ДРЭВААПРАЦОЎКІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Навошта тады прынеслі мне ўказ па тэрмінах і іншае, калі вы былі не гатовыя? — заўважыў Прэзідэнт. — Вы павінны былі скончыць у 2009 годзе, а ўжо 2012-ы, і яшчэ два гады. Гэта мінус пяць гадоў. Калі вы не ўмелі і былі не гатовыя, значыць, трэба было запрасіць 5—10 замежнікаў — нам бы гэта танней абышлося». «Можа, нам міністра (**Міністра архітэктуры і будаўніцтва Анатоля Нічкасава**) тут пакінуць? Хай дабудоўвае завод, адказвае за яго, калі ён праваліў будоўлю, — адзначыў Кіраўнік дзяржавы. — Яшчэ Віцебск паглядзім, можа, яму яшчэ туды давядзецца ехаць і арганізоўваць там справу. Раз не можа ў Міністэрстве, значыць, няхай арганізоўвае на месцах».

Гаворачы аб зацягванні тэрмінаў мадэрнізацыі, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што вінаватыя не толькі члены ўрада, кіраўніцтва прадпрыемстваў, але прычынай таго — часцяком і недысцыплінаванасць рабочых. У сувязі з гэтым Прэзідэнт указаў на неабходнасць жорсткага выканання працоўнай дысцыпліны на прадпрыемствах. «Маладыя людзі, здольныя, тыя, якія жадаюць працаваць, павінны прыходзіць і працаваць. Гэта не справа, што Прэзідэнт едзе і прымушае з-пад палкі», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Звяртаючыся да свайго памочніка Пятра Пракаповіча, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што той павінен пастаянна трымаць на кантролі рэалізацыю праектаў у гэтай сферы. А кожнае прадпрыемства, не толькі дрэваапрацоўчае, павінна мець план мадэрнізацыі. «Гэта нават не абмяркоўваецца. Дзе будуць браць грошы, гэта іх (урада) справа з Надзеяй Ермаковай. Не трэба з імі спрачацца, якая павінна быць стаўка і іншае, гэта іх справа. Галоўнае — план дзеянняў, і павінна ісці мадэрнізацыя», — сказаў Прэзідэнт.

У сувязі са шматлікімі фактамі безгаспадарчасці, расхлябанасці, парушэння працоўнай і тэхналагічнай дысцыпліны на прадпрыемствах канцэрна «Беллеспаперапрам» кіраўнік дзяржавы паставіў пытанне прыняцця адміністрацыйных мер па забеспячэнні выканання задання па мадэрнізацыі 8 заводаў, якія засталіся. Прэзідэнт у сувязі з гэтым запатрабаваў увесці забарону на звальненне работнікаў да канца мадэрнізацыі дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў канцэрна, даручыўшы распрацаваць адпаведны праект Дэкрэта.

«Падрыхтуйце Дэкрэт. Да заканчэння мадэрнізацыі і рэканструкцыі забараняецца звальненне работнікаў. Работнік не можа звольніцца з прадпрыемства без дазволу кіраўніка, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Адпусціць — хай сыходзіць, не адпускаць — павінен працаваць. За парушэнне — на прымусовыя работы. Тысячы ўсіх: рабочых, спецыялістаў і кіраўнікоў». «Таму на час мадэрнізацыі катэгарычна забараніць усякія звальненні з 1 снежня», — запатрабаваў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт таксама даручыў прадугледзець у Дэкрэце магчымасць занясення работнікамі скаргаў, якія будзе разглядаць губернатар таго ці іншага рэгіёна. «Таму што розныя бываюць выпадкі. Прымае канчатковае рашэнне губернатар. Але катэгарычна, прынцыпова работнік, службовец і кіраўнік не павінен звольніцца да заканчэння мадэрнізацыі», — сказаў Прэзідэнт.

Акрамя таго, Прэзідэнт даручыў рэгулярна збіраць пасяджэнне штабоў на чале з першым віцэ-прэм'ерам Уладзімірам Сямашкам і губернатарам рэгіёна, дзе знаходзіцца дрэваапрацоўчае прадпрыемства: «І там яны будуць усе пытанні вырашаць. Надзвычайнае рашэнне, але мы ў адваротным выпадку нічога не зробім. Мы выдаткуем грошы і выкінем усё на вецер».

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што часовая забарона на звальненне павінна адносіцца не толькі да работнікаў прадпрыемства, але і будаўнікоў, якія працуюць на гэтай пляцоўцы. «Невыкананне вашых даручэнняў павінна быць выключана. Не выканалі, пакідайце іх тут працаваць», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да Уладзіміра Сямашкі.

«Па кадрах усе пытанні павінны быць вырашаны. Але я яшчэ ў Магілёве і Віцебску пабудаваў. Баюся, што там мы можам страціць палову членаў урада», — заявіў Прэзідэнт. У сувязі з гэтым ён падкрэсліў, што неабходна ва ўсім навесці парадак, у тым ліку і ў пытаннях працоўнай дысцыпліны. «Я ўжо сказаў: Дэкрэт — гэта ваша настольная кніжка», — адзначыў ён.

«Майце на ўвазе, нас пачнуць яшчэ больш папракаць у «дыктатуры», што мы людзей прымушаем, забараняем звальняць, — працягнуў кіраўнік дзяржавы. — Скажу, каб людзі ведалі: вам, кіраўнікам, прыйдзецца ў першым квартале будучага года на гэтых прадпрыемствах усім, каго вы будзеце тут трымаць, забараніўшы звальняцца, давесці заробак да $400-500. Тады людзі скажуць: Прэзідэнт прыняў рашэнне, прымусіў тут працаваць, але нармальная заработная плата. Яна амаль у два разы вырасце ў параўнанні з цяперашняй».

«Таму, так, дысцыпліна жорсткая, і гэта будзе на ўсіх прадпрыемствах. З вас мы пачынаем. Я стаміўся ўсіх угаворваць», — падкрэсліў Прэзідэнт.

У час рабочай паездкі кіраўніку дзяржавы таксама было далажана аб сацыяльна-эканамічным развіцці Мінскай вобласці. Губернатар Барыс Батура расказаў аб рэалізацыі праграм у сельскай гаспадарцы, жыллёвым будаўніцтве, дынаміцы росту валавога рэгіянальнага прадукту, павелічэнні аб'ёмаў экспарту.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

# Майстры пяра вандравалі па Гомельшчыне

**Вынікам творчага візіту на Гомельшчыну павінна стаць кніга, у якой будуць сабраны найбольш яркія ўражанні беларускіх пісьменнікаў пра рэгіён, гісторыі выбітных людзей, якія ўславілі Беларусь. Гэтую думку выказаў першы сакратар Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт, публіцыст Генадзь Пашкоў. Дарэчы, ён падкрэсліў, што пісьменнікі павінны прымаць актыўны ўдзел у грамадска-палітычным жыцці краіны.**

Фота БЕЛТА.

Пісьменнікі ў час наведвання Веткаўскага музея.

— Гэтую тэму, а таксама іншыя праблемы, якія тычацца дзейнасці айчынных літаратараў, мы абмяркоўвалі на сустрэчы з Прэзідэнтам краіны Аляксандрам Рыгоравічам Лукашэнкам. І ў прыватнасці, закранулі пытанні пра некаторую ізаляванасць беларускіх пісьменнікаў ад актуальных праблем жыцця і магчымасцяў, якія былі ў нас раней — ездзіць у творчыя камандзіроўкі па рэгіёнах Беларусі. Менавіта ў такіх паездках аўтары чэрпаюць натхненне, узнімаюць праблемы, знаходзяць новыя тэмы і герояў для сваіх твораў. Таму з мэтай падтрымкі айчынных літаратараў, папулярызацыі беларускай літаратуры кіраўніком дзяржавы было дадзена даручэнне арганізаваць азнаямленчыя паездкі майстроў пяра па абласцях краіны.

Генадзь Пашкоў адзначыў, што раней пісьменнікі пазнаёміліся з жыццём Магілёўскай, Мінскай, Гродзенскай абласцей. Дарэчы, гомельскія ўлады гатовыя падтрымаць многія творчыя ініцыятывы абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі. Пра гэта паведаміла старшыня Гомельскага абласнога Савета дэпутатаў Марына Бондар:

— У прыватнасці, мы можам аказаць садзейнічанне ў рэалізацыі праектаў па падтрымцы маладых і прафесійных літаратараў. У кожным раёне, упэўнена, ёсць таленты, і мы, напрыклад, маглі б ім дапамагчы выдаваць зборнікі паэзіі і прозы. Збіраемся абмеркаваць гэтыя пытанні з кіраўнікамі раёнаў. Не выключаю, што з часам знойдуцца магчымасці адкрыць у буйных гарадах рэгіёна філіялы Гомельскага аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Пісьменнікі сустрэліся з прадстаўнікамі кіраўніцтва паўднёва-ўсходняга рэгіёна краіны, пабывалі з экскурсіяй у палацы Румянцавых і Паскевічаў, азнаёміліся з работай прадпрыемстваў «Спартак», «Малочныя прадукты». Адбылася і сустрэча са студэнтамі Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны, а таксама — з прадстаўнікамі Гомельскага аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі...

Увогуле, падарожжа атрымалася вельмі насычаным на падзеі і сустрэчы. Паэты, празаікі, літаратурныя крытыкі і публіцысты праехалі вобласць, можна сказаць, з поўначы на поўдзень. Яны падзяліліся сваімі ўражаннямі ад вандроўкі.

**Генадзь ПАШКОЎ, першы сакратар Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт, публіцыст, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь:**

— Калі мы пабывалі ў Веткаўскім музеі народнай творчасці, яшчэ раз пераканаліся, якія цікавыя і духоўна багатыя людзі жылі тут. Якія ў іх былі звычкі, завядзёнкі, які цудоўны адметны фальклор! Многія легенды, паданні вартыя адлюстравання ў вершах. Я чалавек, які нарадзіўся на Віцебшчыне, дзяцінства і юнацтва прайшло ў Смаргонскім раёне на Гродзеншчыне, а жонку я знайшоў на Палессі — у Капаткевічах. І я проста ўлюбёны ў гэты край. У мяне ёсць паэма «Легенды Прыпяці» і нямала вершаў, якія нарадзіліся на гэтай зямлі.

**Уладзімір ГАЎРЫЛОВІЧ, празаік, галоўны рэдактар газеты «Гомельские ведомости», старшыня Гомельскага аддзялення СПБ:**

— Апошнія 20 гадоў пісьменнікі жылі кожны ў сваёй прасторы і, шчыра кажучы, былі адарваныя ад дзяржаўных працэсаў. Таму вось такія арганізаваныя паездкі па краіне могуць быць вельмі карыснымі. Увогуле, Год кнігі на Гомельшчыне праходзіць вельмі актыўна. Мы правялі шэраг мерапрыемстваў, творчых сустрэч, напрыклад, літаратурны фестываль у Рагачове, абласны конкурс чытальнікаў, славянскія літаратурныя «Дажынкі». Знакавым для наступнага года стане праект, які мы ажыццявім сумесна з Бранскай абласной пісьменніцкай арганізацыяй Саюза пісьменнікаў Расіі. Гэта будзе конкурс маладых талентаў у розных жанрах, які завершыцца правядзеннем фестывалю і выданнем сумеснай кнігі.

**Іван САВЕРЧАНКА, літаратуразнаўца, доктар філалагічных навук, супрацоўнік НАН Беларусі:**

— Я прыехаў вырашыць і канкрэтныя пытанні аб падтрымцы пісьменнікаў, якія паходзяць з Гомельшчыны. Яшчэ мы дамовіліся аб супрацоўніцтве: аб'яднаць намаганні Саюза пісьменнікаў, НАН і Гомельскага аблвыканкама, каб падрыхтаваць выданне спадчыны Кірылы Тураўскага. Гэта запатрабуе не толькі інвестыцый, але і шмат часу і многа прафесійных высілкаў. Асоба Кірылы Тураўскага — выдатная. Значнасць гэтага праекта для краіны неацэнная. Калі чалавек знаёміцца з высокамастацкімі творамі, ён узбагачаецца духоўна. У яго з'яўляецца гонар за краіну і яе культуру.

**Таццяна АТРОШАНКА, паэтэса:**

— Я толькі год у Саюзе пісьменнікаў, і мне было вельмі прыемна ўпершыню трапіць у такую вандроўку, таму што тут пабачыла сапраўды шмат цікавага і новага. Для мяне самае важнае — гэта людзі, асобы, іх творы, іх вочы... Колькі людзей — столькі прататыпаў твайх твораў. Глядзіш на чалавека — і бачыш, што гэта — герой рамана, а гэта — лірычны герой твайго верша. Безумоўна, такія вандроўкі даюць істотны штуршок для развіцця творчасці. Пісьменнікі існуюць, каб заставалася жывое слова. Кніга павінна быць не нейкім рарытэтам, а спадарожнікам у жыцці чалавека. Для гэтага я і пішу свае казкі, песні, апавяданні, вершы, п'есы...

**Рагнед МАЛАХОЎСКІ, паэт, адказны сакратар часопіса «Маладосць»:**

— Мне пашчасціла — у мяне цалкам беларускамоўная сям'я, і тата, і маці размаўляюць па-беларуску. У Нарачы я заканчваў беларускую школу. Па-беларуску размаўлялі ў тым ліку на ўроках фізкультуры. Мову варта адраджаць. Калісьці я размаўляў з дачкой Аркадзя Куляшова — Валянцінай Аркадзеўнай, яна мне сказала: мова — гэта пашпарт на тэрыторыю. Калі народ губляе мову, гэту тэрыторыю лягчэй заваяваць, захапіць — і неабавязкова сілай, а маральна, духоўна.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## ПАВАРОТ НА ЗІМУ

На працягу дня ў суботу будзе ісці мокры снег і дождж, раніцай на дарогах галалёдзіца, тэмпература паветра ад мінус 1 да плюс 4 градусаў, паведаміла рэдакцыі **спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА**.

А вось у нядзелю атмасферны ціск павялічыцца і ападкаў ужо не будзе. Уначы і раніцай месцамі туман, на дарогах слізка. Тэмпература ўначы на нядзелю 1—6 марозу, удзень — ад мінус 3 да плюс 3 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у панядзелак да нас увогуле завітае зіма. Уначы на паўднёвым захадзе, а ўдзень месцамі пройдзе кароткачасовы снег. Месцамі на дарогах галалёдзіца. Уначы на панядзелак 1—7 марозу, на паўночным усходзе пры прасненнях да мінус 10, удзень — 0 — мінус 5. У аўторак ужо без ападкаў. Уначы чакаецца мінус 3—10, пры прасненнях да мінус 13, удзень — 1—6 марозу.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# СВАБОДНАЯ РАЗМОВА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Ён таксама звярнуў увагу на асаблівы ўклад Савета Рэспублікі ва ўзаемадзеянне паміж беларускімі абласцямі і суб'ектамі Расійскай Федэрацыі. У пачатку 2013 года плануецца правесці першае пасяджэнне сумеснай камісіі верхніх палат парламентаў па міжрэгіянальным супрацоўніцтве ў абноўленым складзе. На пасяджэнні, апроч іншага, будзе разгледжаны план арганізацыі і правядзення форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі.

Парламентам краіны ратыфікавана ўжо больш за 60 пагадненняў у межах Мытнага саюза, нагадаў Уладзімір Сянько. З 1 студзеня гэтага года ўступілі ў сілу 17 пагадненняў, якія з'яўляюцца прававой асновай АЭП. У пятым скліканні парламент працягне работу па ратыфікацыі дагавораў у рамках «тройкі». У гэтыя працэсы ўключылася таксама Еўразійская эканамічная камісія — першы наднацыянальны орган, які атрымаў права прыняцця абавязковых рашэнняў. Да 1 студзеня 2015 года мяркуецца завяршыць ратыфікацыю дагаворна-нарматыўнай прававой базы МС і АЭП і на гэтай падставе стварыць Еўразійскі эканамічны саюз.

«Паспяховы запуск новых інтэграцыйных фарміраванняў стварае новую рэальнасць, якая патрабуе перабудаваць фармат нашага ўзаемадзеяння, — сказаў дэпутат. — Мы бачым, што Еўразійскае эканамічнае супольніцтва як структура цалкам рэалізавала сваю місію. Зараз важна сканцэнтраваць намаганні на ўмацаванні механізмаў МС і АЭП».

Уладзімір Сянько падкрэсліў, што «тройка» з'яўляецца адкрытай для падключэння ў яе працэсы іншых зацікаўленых краін. Асабліва актуальная сумесная праца парламентарыяў СНД у сувязі з уступленнем у сілу 20 верасня дагавора аб зоне свабоднага гандлю, які абапіраецца на нормы і правілы СГА, лічыць сенатар.

Старшыня Пастаяннай камісіі назваў стратэгічнымі партнёрамі Беларусі Расію, Кітай, высокаразвітыя ўсходне-азіяцкія і арабскія дзяржавы, Лацінскую Амерыку і Афрыку. Ён таксама нагадаў, што ў лістападзе адбылося першае пасяджэнне беларускай часткі міжурадавай беларуска-кітайскай камісіі па супрацоўніцтве ў галіне высокіх тэхналогій.

У Савеце Рэспублікі ўжо сфарміраваны склады нацыянальных дэлегацый 12 міжпарламенцкіх арганізацый. Заканчваецца фарміраванне міжпарламенцкіх камісій і працоўных груп па супрацоўніцтве з заканадаўчымі органамі іншых дзяржаў.

## ПРА АДНОСІНЫ З ЕС

— У развіццё кантактаў на еўрапейскім напрамку захоўваюцца праблемы, — прызнаў парламентарый. — Працягваецца практыка прымянення еўрапейскімі структурамі шаблонных абмежавальных рэзалюцый па Беларусі. У сваім ціску на беларускія ўлады яны відавочна выдыхнуліся. Іх пазіцыя тупіковая, бо яны не ў стане прыдумаць хаця б трохі эфектыўныя інструменты ўздзеяння на беларускую ўладу.

Разам з тым, Уладзімір Сянько выказаў намер спакойна імкнуцца наладжваць канструктыўны дыялог з еўрапейскімі парламентамі як на пляцоўках міжпарламенцкіх арганізацый, так ў двухбаковым фармаце.

— Рэальныя магчымасці тут ёсць, — упэўнены ён. — Мы ясна бачым, што тыя, хто нам апаніруе, — не ў большасці, але яны задаюць тон (асабліва ў Бруселі) у фарміраванні крытычных падыходаў да Беларусі. Нямала ёсць палітычных дзеячаў, у тым ліку ў парламентах, якія валодаюць цвярозым і прагматычным поглядам на сітуацыю ў Беларусі і на пошук ўзаемадзеяння з намі. Мы ўпэўнены, што карпатлівая і канкрэтная праца ў гэтым напрамку будзе плённай.

## ПРА БЕЛАРУСКІ АБУТАК

Аб шляхах вырашэння праблем у гарбарна-абутковай галіне расказаў сваім калегам **дэпутат Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Мікалай МАРТЫНАЎ (генеральны дырэктар абутковай кампаніі «Marko»).**

— Праблемы заключаюцца ў вялікай долі імпарту ў сабекошце айчыннай абутковай галіны, што выклікана дрэнным забеспячэннем абутковых прадпрыемстваў айчыннай сыравінай і камплектуючымі для абутку. Асобныя гарбарныя камбінаты недастаткова глыбока выпрацоўваюць гарбарную сыравіну і прадаюць яе за мяжу, такім чынам яны атрымліваюць невысокую дабаўленую вартасць, а абутковыя фабрыкі вымушаны закупляць ужо дарагія, глыбока выпрацаваныя скуры за валюту, — патлумачыў ён парламентарыям.

У Беларусі цалкам адсутнічае выпрацоўка падкладачнага футра. Усё гэта ўплывае на тое, што айчыннага абутку ў нас недастаткова, і ў краіну завозіцца больш за 14 млн пар абутку з-за мяжы. Калі сітуацыя ў бліжэйшы час не зменіцца, то ўваход Расіі і Казахстана ў СГА, з якімі мы знаходзімся ў адной мытнай зоне, можа выціснуць беларускіх абутнікаў на задворкі рынку.

Для вырашэння гэтых праблем запланавана будаўніцтва да 2015 года новага камбіната па перапрацоўцы гарбарнай сыравіны з аб'ёмам вытворчасці 200 тысяч скур за год, рэканструкцыя і мадэрнізацыя пушнога (аб'ёмам у 500 тысяч штук) і футравага камбінатаў (больш як 100 тысяч штук аўчын). Гэта дазволіць зменшыць валютны складнік у выпуску абутку, а таксама нарасціць аб'ёмы вытворчасці (толькі Віцебшчына будзе вырабляць каля 12 млн пар).

**Працягваецца практыка прымянення еўрапейскімі структурамі шаблонных абмежавальных рэзалюцый па Беларусі. У сваім ціску на беларускія ўлады яны відавочна выдыхнуліся.**

Другая значная праблема галіны — кадры. Яе закліканы вырашыць кафедры на базе прадпрыемстваў, што дазволіць рыхтаваць спецыялістаў без адрыву ад практыкі.

— Зараз таксама ідзе праца па стварэнні двух скураных холдынгаў, адзін з іх даручана ўзначаліць мне, — пасвяціў у бліжэйшыя планы галіны бізнэсмен і сенатар. — Акрамя выпуску 5 млн пар абутку, трэба будзе пабудаваць унікальнае прадпрыемства, якое забяспечыць камплектуючымі і сыравінай усю рэспубліку. Плануем таксама за 2-3 гады пабудаваць два інтэрнаты, разглядаем пытанне аб прыватным пенсійным фондзе ў межах холдынга, які дазволіць даплачваць пенсіянерам. Гэта дапаможа замацаваць свае пазіцыі на рынках Беларусі і іншых краін.

## І САМІ ЗАКОНЫ

Члены Савета Рэспублікі выказалі ўпэўненасць, што прарыў у гарбарна-абутковай галіне пры такіх захадах магчымы, і перайшлі да разгляду законапраектаў.

На гэтым пасяджэнні сенатары ўхвалілі праект Закона Рэспублікі Беларусь «Пра ўнясенне змен і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях ажыццяўлення адміністрацыйных працэдур у вобласці прыродакарыстання». Прыняцце закона дазволіць спрасціць ажыццяўленне адміністрацыйных працэдур у галіне прыродакарыстання, будзе спрыяць развіццю прадпрымальніцкай ініцыятывы і стымуляваць дзелавую актыўнасць у Рэспубліцы Беларусь, пагадзіліся сенатары.

Ухвалены таксама шэраг законапраектаў аб ратыфікацыі міжнародных прававых дакументаў.

На пасяджэнні быў зменены склад Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі. У якасці намесніка старшыні Савета зацверджана Герасімавіч Святлана Міхайлаўна — старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, членамі Савета — Алена Алексіна і Наталля Гатоўчык, старшыні Буда-Кашалёўскага і Чэрыкаўскага раённых Саветаў дэпутатаў.

Парламентарыі таксама зацвердзілі намеснікаў старшыняў пяці пастаянных камісій Савета Рэспублікі.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

■ Прыёмная кампанія-2013

# «АДМЕНА ЛЬГОТ ДЛЯ АБІТУРЫЕНТАЎ — ЦЯЖКАЕ, АЛЕ ПРАВІЛЬНАЕ РАШЭННЕ»

**Падчас наступнай прыёмнай кампаніі ніжні парог тэставага бала для прэтэндэнтаў на студэнцкі білет плануецца павысіць да 10 балаў. Як варыянт, разглядаецца таксама магчымасць павелічэння ніжняга парога да 12 балаў.**

— Хутчэй за ўсё, спынімся пакуль што на 10 балах, але мы адпраўляем сігнал і моладзі, і грамадству, што ў далейшым патрабаванні на ўступных іспытах будуць расці, — заявіў на калегіі Міністэрства адукацыі **першы намеснік міністра адукацыі Аляксандр ЖУК**. — Самая вялікая колькасць абітурыентаў, якія не здолелі пераадолець устаноўлены сёлета парог у 7 балаў, здавалі тэсты па фізіцы і матэматыцы (да 10 працэнтаў ад агульнай колькасці), а на гуманітарных дысцыплінах колькасць тых, хто «адсеяўся» пасля тэсціравання, вагалася ўсяго ад 0,5 да 1,5-2 працэнтаў. Падняўшы ніжнюю планку адразу ўдвая, мы проста рызыкуем не дабраць абітурыентаў па звышзапатрабаваных рынкам працы спецыяльнасцях...

Па выніках прыёмнай кампаніі 2012 года студэнтамі ВНУ сталі 88 тысяч чалавек. Пры гэтым незапоўненымі на дзённай форме навучання засталося 200 бюджэтных месцаў, або каля 2% ад кантрольных лічбаў прыёму — у асноўным на спецыяльнасцях педагагічнага профілю. На платную форму навучання прыём у ВНУ скараціўся на 7,5 тысячы чалавек, або на 12 працэнтаў.

### ЦІ ПАТРЭБНЫ НАМ «ЗАВОЧНЫЯ» ВНУ?

Па словах Аляксандра Жука, нягледзячы на праведзеную работу, працэнт абітурыентаў, залічаных у ВНУ на завочную форму атрымання адукацыі, асабліва ў прыватныя ВНУ, застаецца дастаткова вялікім. Паколькі план прыёму на дзённае навучанне ў прыватныя вышэйшыя навучальныя ўстановы быў выкананы толькі на трэць (недабор склаў 3,9 тысячы чалавек), удзельная вага залічаных на завочную форму аўтаматычна выраслa там з 55 да 77% ад агульнай колькасці студэнтаў. У дзяржаўных ВНУ доля прыёму на завочную форму складае менш за палову ад агульнай колькасці залічаных (43—44%).

— Для аптымізацыі прапорцыі паміж дзённай і завочнай формамі атрымання вышэйшай адукацыі плануецца, што на завочную форму будуць залічвацца толькі асобы, занятыя працоўнай дзейнасцю, у тым ліку пры паступленні на бюджэтную форму — толькі асобы, занятыя працоўнай дзейнасцю не менш як 10 месяцаў, — сказаў А. Жук.

### ЭКАНАМІСТАЎ РЫХТУЮЦЬ «НА КОЖНЫМ РАГУ»?

Асобная праблем— няпрофільная падрыхтоўка:

— Аналіз паказаў, што ў шэрагу ўстаноў прафесійнай адукацыі ажыццяўляецца падрыхтоўка па спецыяльнасцях, якія з'яўляюцца няпрофільнымі для гэтых устаноў. Напрыклад, у сярэдніх спецыяльных навучальных установах Мінсельгасхарча амаль трэць спецыяльнасцяў (26,3%) адносіцца да спецыяльнасцяў эканамічнага, юрыдычнага і IT-профілю. А выпускнікі каледжаў, якія атрымалі ў гэтых навучальных установах адукацыю на платнай аснове, затым рэгіструюцца ў службах занятасці насельніцтва і папаўняюць рады беспрацоўных. Акрамя таго, установы адукацыі ажыццяўляюць прыём па няпрофільных спецыяльнасцях, дзе якасць падрыхтоўкі пакідае жадаць лепшага.

**У 2012 годзе агульнаадукацыйную школу закончылі 63,8 тысячы чалавек, а ў 2015 годзе выпуск складзе каля 58 тысяч чалавек, таму ў абсалютных лічбах колькасць першакурснікаў будзе змяншацца.**

Самы нізкі ўзровень ведаў прадэманстравалі студэнты Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта, Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта, Інстытута прадпрымальніцкай дзейнасці, Магілёўскага ўніверсітэта імя Куляшова, Беларускага аграрнага тэхнічнага ўніверсітэта і Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны.

— Холіць кіраўнікам устаноў адукацыі «сядзець» на цёплых, старых і звыклых спецыяльнасцях, спасылаючыся на попыт з боку моладзі, які, дарэчы таксама можна і рэгуляваць, і накіроўваць у патрэбнае рэчышча. Трэба больш актыўна вывучаць сучасны рынак працы, знаходзіць працадаўцаў, здольных падказваць інавацыйныя напрамкі пошуку, адкрываць новыя спецыяльнасці, — падкрэсліў Аляксандр Жук.

### ІЛЬГОТЫ ЦІ ВЕДЫ?

Першы намеснік міністра адукацыі паведаміў, што ў 2013 годзе міністэрства плануе скараціць прыём на педагагічныя спецыяльнасці на 12-15%. Трэба мець на ўвазе, што ў сувязі са змяншэннем кантынгенту школьнікаў і аптымізацыяй сеткі ўстаноў адукацыі, галоўнае адукацыйнае ведамства планамерна скарачала прыём на педагагічныя спецыяльнасці і па дзённай, і па завочнай формах атрымання адукацыі апошнія тры гады. Разам з тым, заяўкі ўпраўленняў адукацыі на размеркаванне маладых спецыялістаў не толькі не змяншаліся, а раслі. Калі ў 2010 годзе паступіла заяўка на 6 180 маладых спецыялістаў, у 2011 годзе — на 6 200, то сёлета заяўка склала 6 300 чалавек.

— З улікам далейшага скарачэння сеткі школ і павелічэння напаўняльнасці класаў у гарадскіх і сельскіх школах, упраўленням адукацыі аблвыканкамаў і Камітэту па адукацыі Мінгарвыканкама неабходна тэрмінова і аб'ектыўна ўдакладніць патрэбу ў педагагічных кадрах і ўнесці абгрунтаваныя змяненні ў заяўку на 2013 год і наступныя гады, а таксама актыўна заняцца замацаваннем маладых спецыялістаў на месцах, — папярэдзіў Аляксандр Жук.

Сёння праект новай рэдакцыі Правілаў прыёму ў ВНУ знаходзіцца на разглядзе ў кіраўніка нашай дзяржавы, і ў Міністэрстве адукацыі вельмі спадзяюцца, што да канца бягучага каляндарнага года дакумент будзе зацверджаны.

Бадай што адно з самых прынцыповых новаўвядзенняў, якое знайшло адлюстраванне ў новым дакументе, — гэта адмена льгот пры паступленні ў ВНУ для дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без бацькоўскай апекі. Часта атрымліваецца, што абітурыенты-льготнікі залічваюцца па-за конкурсам з зусім невысокім агульным балам, у той час як абітурыенты з вельмі высокімі балamі ў сертыфікатах трапіць у кола студэнтаў не могуць.

— Мы стаім перад цяжкім рашэннем, але ў нас маюцца ўсе перадумовы і ўпэўненасць у тым, што яно будзе правільным, — падкрэсліў Аляксандр Жук. — Так, праведзены аналіз паказаў, што за апошнія пяць гадоў колькасць абітурыентаў з кола дзяцей-сірот, залічаных у вышэйшыя навучальныя ўстановы, вырасла на 12%. У 2012 годзе 55% з усіх дзяцей-сірот, што сталі студэнтамі, былі залічаны ў сталічныя ВНУ, прычым палова з іх выказалі жаданне навучацца ў БДУ, Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце, БНТУ і ў Мінскім дзяржаўным лінгвістычным універсітэце на прэстыжных спецыяльнасцях з традыцыйна высокімі прахаднымі баламі.

Аналагічная сітуацыя складвалася і з дзецьмі-інвалідамі да адмены ў 2008 годзе права на іх пазаконкурснае залічэнне. Пасля адмены льготы, пры залічэнні на агульных падставах колькасць дзяцей-інвалідаў, якія паступілі на навучанне за кошт сродкаў бюджэту, практычна не змяняецца (у 2008 г. — 223 чалавекі, 2009 г. — 229, 2010 г. — 258, 2011 г. — 224 і ў 2012 годзе — 204 чалавекі). Акрамя таго, мы прапануем захаваць для дзяцей-сірот і дзяцей, што засталіся без бацькоўскай апекі, права на пазаконкурснае іх залічэнне пры паступленні ва ўстановы сярэдняй спецыяльнай і прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■

## У БАБРУЙСКУ З'ЯВІЦЦА СКУЛЬПТУРА ШУРЫ БАЛАГАНАВА

**Такі падарунак роднаму гораду зробіць прадпрыемства «Водаканал». Паводле слоў дырэктара Алега Цітова, вядомы літаратурны герой будзе адлюстраваны вольна: 2-метровая скульптура Шуры Балаганава будзе ўмацавана на падаконніку рэстарана «Чырвоная вежа», якая належыць прадпрыемству.**

Аўтар — маскоўскі скульптар Яраслаў Барадзін, цяпер скульптуру адліваюць у Смаленску. Алег Цітоў паведаміў, што ўрачыстае адкрыццё плануецца на 28 снежня.

— Чаму менавіта Шура Балаганаў? — разважае дырэктар Бабруйскага «Водаканала». — Таму што Панікоўскі быў парушальнікам канвенцыі, Астап Бендэр толькі аднойчы скарыстаўся даходным іміджам «сына лейтэнанта Шміта», а сімпатычны Шура Балаганаў быў прафесіяналам сваёй махлярскай справы, марыў і спрабаваў атрымаць высокакультурны Бабруйск у распрацоўку. Таму менавіта яго скульптура будзе ў нас дарэчы.

**Ілона ІВАНОВА.**

## ДАША ПАЧАЛА З «СЕРАБРА»

**Беларуская біятланістка Дар'я Домрачава заняла другое месца ў індывідуальнай гонцы на першым этапе Кубка свету па біятлоне, які праходзіць у шведскім Эстэрсундзе, паведамляе БЕЛТА.**

На дыстанцыі 15 км з чатырма агнявымі рубяжамі Дар'я дапусціла 2 промахі і паказала вынік 45 мін. 36,7 сек. Яна ўступіла 1 мін. 3,2 сек. пераможцы гонкі Туры Бергер з Нарвегіі, якая адстралялася «па нулях». Пры гэтым перад чацвёртай стральбой Дар'я апярэджвала нарвежку на 2,1 сек., але надзеі на першае месца перакрэсліў промах беларускі на заключным агнявым рубяжы. Замкнула прызавую тройку расіянка Кацярына Глазырына. Ачкі ў залік Кубка свету, трапіўшы ў лік 40 лепшых, зарабілі Людміла Калінчык (17-е месца) і Надзея Скардзіна (20-е).

## КАБЫЛА ПРАВАЛІЛАСЯ Ў КАЛОДЗЕЖ

**У вёсцы Рашкоўка Докшыцкага раёна ў каналізацыйны калодзеж правалілася кабыла.**

— Выратавальнікаў на дапамогу а першай гадзіне дня выклікаў выпадковы мінак, які ўбачыў кабылу ў калодзежы. Па прыбыцці да месца было ўстаноўлена, што ў каналізацыйны калодзеж дыяметрам 1,5 метра і глыбінёй 2 метры правалілася кабыла, якая належыць адной з жыхарак вёскі, паведамілі ў Віцебскім абласным упраўленні па надзвычайных сітуацыях. Жывёліну работнікі МНС падымалі пры дапамозе гаспадарчых рукавоў, закладзеных пад тулава.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

■ Асоба

Мікалай АТРАХОВІЧ:

# «Усе былі абагрэты акіянічнай цеплынёй Кандрата Крапівы»

Фота Надзеі БУЖАН.

**МІКАЛАЙ Атраховіч — унук слыннага літаратара Кандрата Крапівы. А яшчэ — журналіст са стажам. (Прынамсі, зусім нядаўна займаў пасаду галоўнага рэдактара газеты «Вячэрні Мінск».) Карэспандэнт «Звязды» вырашыла сустрэцца з Мікалаем Атраховічам і распытаць яго пра стасункі са знакамітым дзедам, «пісьменніцкія» гены і ўласны шлях у прафесію.**

**— Ці праўда, што вы — выпускнік Акадэміі мастацтваў?**

— Так, па спецыяльнасці «Прамысловая графіка» — слова «дызайн» тады не прымянялася. Але мая спецыялізацыя датычылася і часопісна-газетнай графікі — на гэтую тэму я абараніў дыплом. У ліхія 1990-я я быў адным з першых, хто рвануў зарабляць грошы ўласнай працай. Тады ў нас з партнёрамі з'явілася выдавецкае прадпрыемства. У сваім жыцці я засноўваў і вёў некалькі невялікіх, але сродкаў масавай інфармацыі. Таму я зусім не навічок у газетна-часопіснай сферы.

**— А калі пачалі самі пісаць?**

— Я заўсёды шмат пісаў, аднак пісаў у стол. Бо я не бачыў сябе ў гэтым жыцці пісьменнікам — можа, я зрабіў памылку, а можа, я яе яшчэ выпраўлю (*усміхаецца*). Воляй лёсу, я аднойчы прыйшоў у агенцтва «Мінск-Навіны», зусім не па творчым пытанні. Разгаварыліся: пішаш, не пішаш — калі працуеш у гэтай сферы, то, натуральна, пішаш. Я прынёс некалькі сваіх прац. Гэта не былі ў поўным разуменні кнігі — хутчэй, нататкі пра тое, як пабудаваць дом. Таму што большую частку свайго жыцця я пражыў у прыватным доме, ведаю, як яго пабудаваць, каб не згубіць сям'ю, працу, сяброў і застацца жывым-здаровым. Мае сябры, зарабіўшы грошы ў 1990-я, таксама пачалі будавацца і распытваць мяне, як гэта рабіць. Я спачатку расказваў ім, пасля не вытрымаў, напісаў усё гэта, проста размясціў на дыск і даваў ім пачытаць, а ўжо пасля нешта каментаваў. Я нідзе яго не размяшчаў, не выдаваў — толькі для сябе і для сяброў. Я паказаў тое, што напісаў, у рэдакцыі гарадской газеты «Мінскі кур'ер». Так і атрымалася, што я пачаў і шмат гадоў вёў там сваю рубрыку «Сам сабе будаўнік». Рубрыка «Сталічны правінцыял» таксама амаль адразу стала маёй аўтарскай. Пачаў усё больш пісаць і ў выніку цалкам пагрузіўся ў журналістыку. Таму шлях ад пазаштатнага аўтара да галоўнага рэдактара я прайшоў.

**— Давайце ўзгадаем, што вы — унук вельмі знакамітага чалавека, таксама рэдактара, аднак літаратурнага, — Кандрата Крапівы. Можна сказаць, што ў вас нават рэдактарская дынастыя?**

— Так, мне пашанцавала жыць побач з такім чалавекам, як мой дзядуля Кандрат Крапіва. Для ўсіх ён класік беларускай літаратуры, аўтар слоўнікаў, а для мяне гэта блізкі чалавек, з якім я, дзякуй Богу, быў большую частку майго жыцця. Ён ніколі не павучаў мяне: «Рабі так, ідзі туды.» Аднак ён умудраўся мне такія кнігі ў патрэбны момант даваць, ад якіх я не мог адарвацца. Менавіта ў гэтым узросце, менавіта такая кніга (а бібліятэка ў яго была вялізная) аказвалася ў мяне ў руках, і я чытаў узахлёб, хаця ніхто ніколі не мог мяне прымусіць штосьці прачытаць. Ён ніколі не вучыў мяне штосьці рабіць. Але калі я стаў маладым мужчынам, раптам зразумеў, што ўмею насадзіць сякеру, лапату, выправіць і зрабіць касу, плесці лапці, плесці кошыкі, магу зрабіць свістульку. Ён не казаў мне: «Сядай, зараз будзем рабіць гэта». Ён проста сам браўся за справу і ўмеў падстроіць сітуацыю так, што мне было неверагодна цікава. Таму зараз я некаторыя рэчы ўмею рабіць так, быццам нарадзіўся з гэтым.

**Мне пашанцавала жыць побач з такім чалавекам, як мой дзядуля Кандрат Крапіва.**

**— Што яшчэ са звычак Кандрата Крапівы вам прыгадваецца?**

— У яго ніколі не было будзільніка, аднак ён заўсёды ўставаў і ішоў на працу. Ён пастаянна працаваў, толькі калі мяне стала пад 90 гадоў, ён працаваў дома, але ўсё роўна ўставаў своечасова і без будзільніка. Я таксама жыву без будзільніка. Я, зразумела, яго стаўлю, аднак устаю на дзве-тры хвіліны раней.

**— Любоў да тэкстаў, скрупулёзнасць у іх апрацоўцы ў вас таксама ад дзядулі?**

— Ёсць рэчы, якія немагчыма патлумачыць. Калі аналізіраваць, адкуль яны ўзяліся, тут вы, магчыма, маеце рацыю. Мне пашанцавала расці ў гэтым атачэнні, вельмі мяккім, вельмі тактоўным. Я не памятаю, каб ён закрычаў у сваім жыцці, лаянкавага слова я таксама ад яго ніколі не чуў. Пры гэтым усе вакол яго рабілі тое, што трэба. Заўсёды некалькі раз на год за вялікім сталом у нас дома збіралася ўся радня. Хто ж адмовіць Кандрату Крапіве, калі ён запрасіў у госці? Родныя з задавальненнем прыходзілі. Так было на працягу ўсяго жыцця. Калі яго не стала, гэта традыцыя сама сабой рассыпалася, прапаў стрыжань усёй сям'і. Можна было б дасылаць запрашэнні і ўсіх зваць, аднак яны ўсё адно не сабраліся б... Тады ж прыходзілі і блізкія, і вельмі далёкія сваякі, і нават зусім не родныя. Аднак яны былі абагрэты яго душэўнай цеплынёй, акіянічнай, і хіліліся да гэтага чалавека. Што гэта, генетыка, калі яго родныя людзі пасля прысвяцілі сябе мастацтву, творчасці? Не, гэта ўплыў, а дакладней — энергетыка. Таму я спадзяюся, што мне дасталося крыху гэтага зараду.

**— Мне расказвалі гісторыю, што, калі Кандрат Крапіва працаваў у выдавецтве, да яго прыйшлі і спыталі, як на беларускую мову перакласці «Яблоко от яблоньки не далеко падает»? Ён не стаў адразу прыдумваць адпаведнік і толькі на наступную раніцу сказаў: «Ад асінкі не народзіцца апельсінка». Вы таксама спаць не ляжаце, пакуль загаловак удалы не прыдумаеце?**

— Не, не лягу. А калі лягу, то прачнуся. Шліфаваць тое, што ты робіш, да абсалютнага бляску — гэта правільна. Паўфабрыкаты выдаваць нельга. Што б вы ні рабілі: газету з тыражом больш за 100 тысяч або школьную сценгазету выдавалі — усё адно, шліфаваць трэба да максімальнага бляску, наколькі вам гэта ўвогуле магчыма. Дарэчы, такі рытмічны ход дазваляе не прыхапкам рабіць сваю працу, калі ведаеш, што можна лепш, але не паспяваеш. Калі ёсць час давесці ўсё да максімальна добрага стану — гэта вельмі каштоўна. Калі праца ідзе ў мітусні, лётанні, то гэтага, на жаль, не атрымаецца — вы будзеце вымушаны пастаянна ісці на кампраміс.

**— Сям'я падтрымлівае вашы працоўныя пачынанні?**

— Мне пашанцавала ў жыцці. У мяне дзве выдатныя дачкі і цудоўная жонка. Мы ўжо 26 гадоў разам. Гэта не проста разуменне мяне і маёй працы, гэта суаўтары майго жыцця агулам. Не прац, не артыкулаў, якія я пішу, — яны мае суаўтары па жыцці. Гэта не проста разуменне, але глабальная ўзаемапавага і, безумоўна, любоў.

**Журналістыка — гэта погляд на жыццё, стан душы.**

**— Гэта значыць, вы лічыце, што ў прафесіі складана нечага дасягнуць, калі няма надзейнага, моцнага тылу?**

— Так. Калі побач ёсць людзі, якія не проста цябе разумеюць, а жывуць з табой адным жыццём, тады ты можаш самарэалізавацца на ўсе 100. Можа, у некага і атрымалася б прайсці такі шлях самому, у мяне — не.

**— А як адпачываеце? Можа, на рыбалку ходзіце?**

— *(Усміхаецца.)* Паўнавартасна адпачываць я не ўмею. Што дае мне сапраўдны адпачынак? Калі мы ездзім па Беларусі тры-чатыры дні. А мы вельмі любім гэта рабіць. У гэтым годзе таксама ездзілі, на Віцебскія азёры, з сябрамі, з дзецьмі, з намётамі. Пасля яшчэ вандравалі па Беларусі дзень-два — па тых месцах, у якія звычайна складана трапіць, калі няма вольнага часу. Здаралася, выязджалі ў Прыбалтыку, да мора. Аднак звычайна сям'я адпачывае дзесяць дзён, а я на апошнія два-тры прыеду, забяру іх, і мы вяртаемся разам дадому.

**У ліхія 1990-я я быў адным з першых, хто рвануў зарабляць грошы ўласнай працай.**

**— А з сябрамі ці часта бачыцеся?**

— Я вельмі люблю стасункі з сябрамі. У мяне проста выдатныя сябры. Я бываю ў іх, яны бываюць у нас. Калі я не бачу сваіх самых блізкіх сяброў больш за тыдзень, я пачынаю сумаваць.

**— Што яшчэ вам падабаецца рабіць у вольны ад працы час?**

— Я люблю займацца хатнімі справамі. Так атрымалася, што рукамі я ўмею рабіць амаль усё. Калі мне трэба «пераключыцца», я з задавальненнем раблю штосьці па доме. Вельмі люблю лазню — імкнуся бываць раз на тыдзень. Таксама я маржую: закальваюся, абліваюся ледзяной вадой.

**— Якое месца вера займае ў вашым жыцці?**

— Я веруючы чалавек, шчыры і адкрыты, праваслаўны. Я з вялікай павагай стаўлюся да веры і лічу, што тое, што яна ў наша жыццё вяртае духоўнасць, — гэта вялікае дасягненне. У мяне ёсць нават любімыя месцы, у якія я заходжу часцей, чым у іншыя. Напрыклад, царква Аляксандра Неўскага ў Заслаўі.

**— Што трэба для таго, каб пастаянна самаўдасканальвацца?**

— Самае галоўнае, я ўпэўнены, — гэта не стаяць на месцы. Як толькі вы спыніліся, лічыце, што гэта рух назад. Бо астатнія, хто хацеў, пайшлі наперад, а вам цяпер ужо трэба даганяць. І гэта не толькі будаваць планы на заўтра ці на год наперад (што само сабой зразумела), але прыдумваць штосьці новае, расці прафесійна, паспяваць за сучаснымі тэндэнцыямі і, суадносна, іх ведаць. Таму самае галоўнае — рухацца наперад. Штодзённа, пастаянна, заўсёды.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ**

■ Факт

## У МАГІЛЁВЕ АДБУДЗЕЦЦА НОЧ РАСПРОДАЖУ

Яе правядзенне запланавана напярэдадні Новага года, расказаў начальнік упраўлення гандлю і паслуг Магілёўскага аблвыканкама Алег Буянаў.

Ноч распродажу пройдзе ў адным з буйных гандлёвых аб'ектаў абласнога цэнтра. Магілёўцам абяцаюць тавары з палавіннай гандлёвай надбаўкай. Эканомія будзе адчувальная ў групе дарагіх нехарчовых тавараў. Напрыклад, тэлевізар за 5 мільёнаў можа стаць на мільён і нават болей таннейшым.

Сезон пераднавагодніх кірмашоў адкрыецца ў Магілёўскай вобласці 15 снежня. У гарадах запланавана больш за паўсотні кірмашоў з удзелам дзясяткаў прадпрыемстваў і арганізацый. Там таксама абяцаюць тавары па зніжаных цэнах. Плануецца, што крамы перад святамі падоўжаць працоўны дзень, а таксама будуць прывабліваць пакупнікоў менавіта значнымі зніжкамі.

**Ілона ІВАНОВА.**

## «СЭРЦА БЕЛАРУСІ» — ЛЕПШЫ АТРАД

Сёлета ў традыцыйным конкурсе «Моладзь за чысціню гарадоў і сёлаў» прадстаўнікі Віцебшчыны заваявалі пераважную большасць прызавых месцаў.

Па выніках сёлетняга конкурсу з 15 прызавых месцаў 9 — у маладых жыхароў Прыдзвінскага краю. А добраахвотніцкі атрад «Сэрца Беларусі» Аршанскага каледжа Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава прызнаны лепшым у рэспубліцы. Марыя Сталярова, навучэнка каледжа, прызнана лепшым валанцёрам года.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

Кацярына РАЖДЗЕСТВЕНСКАЯ:

# «КАЛІ ЎПЕРШЫНЮ ЗДЫМАЛА ГОЛУЮ НАТУРУ, ВЕЛЬМІ САРОМЕЛАСЯ»

**«Зорны» фатограф Кацярына Раждественская — дачка знакамітага паэта Роберта Раждественскага — ажыццявіла мару свайго знакамітага бацькі — пабываць у тым самым Віцебску, адкуль родам Шагал. У старажытны горад над Заходняй Дзвіной яна прыехала, каб адкрыць персанальную выставу сваіх фота.**

Вельмі нечакана аўтару гэтых радкоў было пачуць ад самой Кацярыны Раждественскай, што я — «выліты Пушкін». Праўда, да прапановы зняцца, каб папоўніць серыю фотаздымкаў, не дайшло.

Кацярына Робертаўна нарадзілася 17 ліпеня 1957 года ў Маскве ў сям'і паэта Раберта Раждественскага і літаратурнага крытыка Алы Кірэевай. Скончыла Маскоўскі дзяржаўны інстытут міжнародных адносін. Пасля інстытута працавала на Дзяржтэлерадыё. Потым — перакладчыкам мастацкай літаратуры з англійскай і французскай моў. Перавяла больш за дзясятак раманаў. Была хатняй гаспадыняй, выхоўвала дзяцей. З 1998 года пачала займацца фатаграфіяй. Раскошныя ўборы знакамітых людзей на ўручэнні прэміі «ТЭФІ» нагадалі ёй творы вядомых мастакоў. У сакавіку 2000 года яе здымкі пачалі публікаваць у часопісе «Караван гісторый» пад назвай «Прыватная калекцыя» — усе фота заснаваны на сюжэтах карцін вядомых мастакоў. Да канца мінулага года ў праекце ўжо зняліся вядомыя расійскія палітыкі, тэлевядучыя, акцёры і журналісты, спевакі, спартсмены.

**— З чаго пачыналі свой творчы шлях у якасці аўтара фота?**

— Нарадзіла дзяцей. Так усё і пачалося. Гэта рабілі ўсе — фатаграфавалі. Калі муж мне падарыў вялікі прыгожы дарагі фотаапарат, я вырашыла, што ўкладзеныя ў яго пакупку грошы трэба неяк адпрацаваць. І нешта трэба самой прыдумаць. Так вось я пачала працаваць для часопіса «Караван гісторый». Для «Прыватнай калекцыі» пачала здымаць сваіх знаёмых — такое фота сучаснікаў у вобразе герояў карцін славутых мастакоў. І калі паказала гэтыя фота мужу, ён (дарэчы, выдавец часопісаў, у тым ліку і «Каравана гісторый») сказаў, што гэта вельмі добра, такія творы запатрабаваны, бо для каляровага часопіса патрэбны цікавыя каляровыя фотапраекты. Так я і стала фатографам зусім нечакана для сябе.

**— Што ўпачатку: шукаеце вядомую карціну або мадэль?**

— Калі мой дырэктар — яна ж і мая хросная мама — запрашае кагосьці на фотасесію і ўжо прызначаны здымачны дзень, пачынаем шукаць карціну. І, бадай, гэта самае цяжкае, бо не заўсёды трапляеш у вобраз, не заўсёды ведаеш чалавека... Таму што калі ў першы раз прыходзіць чалавек, вельмі часта экранны вобраз і яго, скажам, жыццёвае ўвасабленне зусім не супадаюць. Таму некалькі твораў і зараз не апублікаваны, бо на 100 працэнтаў не трапіла. Таму, бывае, чакаю, каб зняць зноў. Дзякуй Богу, «зорак» многа. На жаль, зараз іх стала вельмі многа. Гэта не той варыянт, калі, напрыклад, Людміла Гурчанка на працягу ўсяго свайго жыцця паказвала і даказвала, наколькі яна геніяльная актрыса. Зараз зняўся ў серыяле — і ты ўжо на першых старонках часопісаў. І пра новаспечаную «зорку» ўсё хочуць ведаць: з кім жыве і гэтак далей. Лічу, што гэта, хутчэй, «зорны пыл», а не «зоркі»... Насця Заваратнюк — у прынцыпе, добрая актрыса, але да знакамітага серыяла яе ніхто не ведаў. І тут — раз і стала «зоркай». Мне не вельмі цікава працаваць з маладымі «зоркамі» — не з усімі, вядома. Бо ў іх няма вопыту, з імі сумна, яны «шэрыя» — прыйшлі і пайшлі. У іх дрэнна пастаўлена мова, няма пра што пагаварыць.

**Мне не вельмі цікава працаваць з маладымі «зоркамі». У іх няма вопыту, з імі сумна, яны «шэрыя», з імі няма пра што пагаварыць.**

ВІА «Песняры».

**— А было такое з вуснаў «зорак»: «Гэта не я, не трэба ў тыраж маё фота?»**

— Было, калі я здымала на плёнку і не было адразу відаць выніку. А калі перайшла на лічбавае фота (а ў мяне «выхад» з фотаапарата на манітор), адразу відаць выяву. І мы з чалавекам разам можам выбраць неабходны кадр — той, які яму падабаецца.

**— Як вам працавалася з «Песнярамі»?**

— Вельмі добра. Я іх любіла яшчэ ў дзяцінстве — вельмі класныя дзядзькі. Здымала іншых беларускіх «зорак»: Агурбаш, Дзіму Калдуна... Ёсць яшчэ некалькі ідэй аб супрацоўніцтве з вашымі землякамі.

**— Калі ёсць камп'ютарныя праграмы, якія дазваляюць на фота апрануць мадэль у тое, што пажадаеш, перанесці яго твар у любы кадр, навошта ж вам траціць час на поўнае капіраванне карціны?**

— Я не люблю лёгкіх шляхоў. За мной пайшлі многія, паўтараючы маю ідэю. І адразу відаць, што выяву твару (амаль што з фота ў пашпарце) пераносяць пры стварэнні канчатковага фота. Я збіраю такія «часопісы», у мяне іх ужо цэлая калекцыя. Гледзячы на гэта, вельмі весялюся... Мне цікавы сам працэс стасункаў з чалавекам. І людзі, якія прыходзяць здымацца, удзельнічаюць у творчасці. Адным усё роўна, а, напрыклад, Жырыноўскі падчас таго, як яго грыміравалі пад Івана Грознага, заснуў гадзіны на тры. А потым прачнуўся ўжо ў вобразе. І трэба было здымаць у Крамлі. Ён выйшаў на ганак і ўбачыў турыстаў з-за мяжы. Яны ўзрадаваліся, што ўрэшце ўбачылі рускага цара...

Вельмі цікава «калекцыяніраваць» людзей. Самым цікавым чалавекам для мяне была Гурчанка. Яна была маім настаўнікам. Гадоў дзесяць мы з ёй падтрымлівалі стасункі. Людміла Маркаўна прысутнічала на адкрыцці маіх выстаў, разам ездзілі за мяжу. Я зразумела, што больш шчаслівай і нешчаслівай жанчыны я ніколі да яе не бачыла. Яе гадзінамі можна было слухаць. Без грыму яе твар быў белы ліст, на якім можна было намаляваць і бабулю, і прыгажуню. Яна была лепшай мадэллю. Такога ўзроўню людзі да мяне больш не прыходзяць...

**— А сябе бачыце ў нейкім вобразе?**

— Не. Не люблю фатаграфавацца.

**— Кажуць, пабываць у Віцебску вы марылі даўно?**

— Мой тата ў свой час меў стасункі з Шагалам. І не быў у Віцебску, толькі ўвесь час марыў пабываць на яго радзіме. І ў мяне гэта з дзяцінства — Віцебск запаў мне ў душу. І я, безумоўна, з вялікім задавальненнем сюды прыехала. Памятаю, як бацька пытаўся ў яшчэ аднаго вашага вядомага Марка — Марка Фрадкіна — аб Віцебску: якія вуліцы, якія назвы, дзе, што? І пасля таго, як пачуў усё, што хацеў, напісаў верш, прысвечаны Шагалу. Хачу ў Віцебск прыехаць летам. Тут трэба здымаць фільмы. Шчасце жыць у такім месцы і бачыць усе гэтыя рашоткі, маленькія балконы. Вам — гараджанам — можна пазайздросціць, таму што тут вочы адпачываюць, асабліва пасля Масквы.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

**Аўтар артыкула Аляксандр ПУКШАНСКІ таксама мог бы стаць Аляксандрам Пушкіным (фота з архіва рэдакцыі газеты «Звязда»).**

# ШПАЦЫР ПА КАМАРОЎЦЫ

## Пераднавагоднія запасы: зніжкі на ікру і нятанны «Цешчын пачастунак»

**На навагодні стол, які прыйдзецца рыхтаваць кожнай гаспадыні праз колькі тыдняў, паставіць сёння ёсць магчымасць усё, на што хопіць грошай і фантазіі. Журналісты «Звязды» пацікавіліся, колькі зараз каштуюць «галоўныя героі» навагодняга стала на сталічным Камароўскім рынку, каб пасля параўнаць, як зменяцца цэны бліжэй да зімовых свят.**

ТЫЯ, каму «адпачыць» тварам у салаце аліўе альбо закусіць чарку халоднекай гарэлкі бутэрбродам з чырвонай ікрой не дазваляе здароўе ці яшчэ што-небудзь, найперш шукаюць на стале ў Новы год... Мандарыны! Пра твар у салаце і ўсё астатняе — гэта жарт, зразумела. А вось наконт мандарынаў можна цэлую сур'ёзную коштавую філасофію разгарнуць.

Прапаноўваюць, традыцыйна, іспанскія і мараканскія (тыя, на якіх многім дзецям важна было знайсці чорненькую налепку з надпісам «Magoc»).

— А якія смачнейшыя? — цікаўлюся.

— Мараканскія звычайна саладзейшыя. Падабаюцца многім. Але тыя, што з Іспаніі, звычайна большыя. А некаторыя пакупнікі кажуць, што і чысцяцца лепш, бо скурка танчэйшая, — адказвае мне прадавец і знаёміць з цэнамі:

— Ёсць па 15 тысяч, ёсць па 18.

У супрацьлеглым куце рынку ўдалося пабачыць мандарыны і па 14 тысяч рублёў (праўда, маленькія, некаторыя — з зеленаватымі бакамі), і па 20 тысяч (прыгожыя, нават з галінкамі і лісткамі). Найбольш дарагія каштавалі 25 тысяч рублёў. У прынцыпе, аранжавыя навагоднія фрукты на Камароўцы прадаюцца якраз у гэтай цэнавай катэгорыі — ад 14 да 25 тысяч рублёў.

«Якая гадасць гэтая ваша заліўная рыба...» Фраза з вядомага фільма закруцілася ў галаве адразу, як толькі пачала прыцэньвацца да марскіх, рачных і азёрных жыхароў, без якіх навагодні стол таксама не ўяўляецца. І не таму, што рыба — «гадасць», а таму, што фільм таксама навявае навагодні настрой. Карацей, за кіло «элітнага» карпа прадаўцы просяць 33 тысячы рублёў, у той жа час як «карп буйны» (без намёку на элітнасць, праўда, рыбіны крыху меншыя) каштуе на 4 тысячы танней. Хочаце набыць амура, рыхтуйце 28-29 тысяч рублёў, а кілаграм талсталобіка каштуе 24 тысячы.

Фотадымкі Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Купіць селядзец для «шубы» можна значна танней, чым удалося знайсці на Камароўцы, але ж Новы год як-ніяк, і кожны ведае, што для салаты гэтай селядзец патрэбны не ў выглядзе філе з упакоўкі, а сапраўдны, з якога здымаюць скуру і дастаюць косці. Гэта ўжо як перадсвяточны рытуал. Дык вось, акурат такі, тоўсты, тлусты, з галавой і хвастом, каштуе на Камароўцы 32.200 рублёў за кілаграм.

Найважнейшы інгрэдыент яшчэ для адной салаты, зялёны кансерваваны гарошак — ад 5,9 да 8 з лішкам тысяч рублёў. Можна не абмяжоўваць сябе ў колькасці і купіць адразу вялікую бляшанку за 15 тысяч рублёў, у якой змяшчаецца ажно 800 грамаў.

Слабасалёная сёмга для бутэрбродаў абыдзецца ў 250—270 тысяч рублёў за кіло. За невялікія кавалкі па 200-300 грамаў (такія набываюць найбольш часта) просяць ад 50 тысяч. Чырвоная рыбка ў вакуумнай упакоўцы таннейшая на 5—10 тысяч рублёў.

Далей накіроўваемся да мяса. Тут прадаўцы гатовы зрабіць зніжку. У сярэднім, за кілаграм свіной паляндвіцы просяць каля 70 тысяч рублёў. Дзесьці прапаноўвалі такое ж мяса па 68 тысяч, а дзесьці цэны даходзілі і да 80 тысяч рублёў. Эх, смажаніна, катлетка ці адбіўная з бульбяным пюрэ — акурат тое, чым патрэбна добра накарміць гасцей у пачатку навагодняга застолля, каб бутэрбродаў з ікрой і іншых далікатэсаў больш засталося.

Дарэчы, камароўскія цэны на ікру маюць досыць вялікую разбежку.

— А чым адрозніваецца чырвоная ікра за 95 тысяч ад той, што каштуе 140? Бляшанкі, здаецца, аднолькавай вагі — грамаў па 100?

— Таннейшую з замарожанай сыравіны робяць. Тая, што за 140 тысяч, сапраўды смачнейшая, — тлумачыць прадавец.

Такая ж колькасць чорнай ікры каштуе 180 тысяч рублёў. Але ў некаторых атрымліваецца дамовіцца на значна больш нізкую суму.

— Прыходзьце, я вам зніжку да 150 тысяч зраблю, — паабяцалі і мне.

Працягваючы тэму бутэрбродаў, варта ўспомніць пра сыравэнджаную каўбасу. Цэны на яе на камароўскіх прылаўках, у асноўным, пачынаюцца ад 110 тысяч рублёў. Ёсць і даражэйшыя варыянты — 125, 133 тысячы за кілаграм. І, нарэшце, самая нятанная каўбаса з правакацыйнай назвай «Цешчын пачастунак», якая каштуе 135 тысяч рублёў за кіло.

Тут жа варта ўспомніць і пра шпроты, бляшаначка якіх каштуе 11,5 тысячы рублёў.

Як высока падымуцца цэны перад самым Новым годам, прадаўцы расказваць не бяруцца. Што ж, паглядзім тыдні праз тры.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

■ Ведай нашых!

## «ЗОЛАТА» РАСІЙСКАЙ АЛІМПІЯДЫ — У ЮНЫХ ПРАГРАМІСТАЎ З МАЗЫРА

**Залаты і сярэбраныя медалі прывезлі з XIII Усерасійскай камандной алімпіяды школьнікаў па праграмаванні беларускія школьнікі.**

Фінал спаборніцтваў праходзіў з 23 па 25 лістапада адначасова ў Санкт-Пецярбургу, Барнауле, Ташкенце, Тбілісі і Алматы. А яго ўдзельнікамі сталі 176 камандаў з Расіі, Арменіі, Беларусі, Грузіі, Казахстана, Латвіі, Таджыкістана, Узбекістана і Украіны. Беларусь прадстаўлялі ў фінале 16 камандаў. Школьнікі з Мазыра сталі ўладальнікамі залатых медалёў і дыплома I ступені. Каманда ліцэістаў БДУ таксама прывезла дыплом I ступені і сярэбраныя медалі. Яшчэ тры беларускія каманды ўзнагароджаны дыпломамі III ступені.

Па ўмовах правядзення алімпіяды, яе удзельнікі, якія занялі першыя 12 месцаў, узнагароджваліся таксама медалямі: трое атрымалі «золата», чацвёра — «серабро», пяць школьнікаў сталі ўладальнікамі бронзавых медалёў.

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■ Ракурс

# «КІРОЎЦА, НЕ СПЯШАЙСЯ НА НАША МЕСЦА!»

## Людзі з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі маюць патрэбу не ў спачуванні, а ў рэальным безбар'ерным асяроддзі

**Як кіроўца аўто, які часта бывае за мяжой, у нашых суседзяў за рулём аўтамабіля, магу падзяліцца асабістымі назіраннямі наконт парковак. Дакладней, не наконт іх саміх, а наконт стаўлення кіроўцаў да вызначаных там правілаў. Мажліва, здараецца і інакш, але аўтару гэтых радкоў ніводнага разу ні ў Літве, ні ў Польшчы не даводзілася бачыць, каб месцы, прызначаныя для транспарту інвалідаў, былі заняты машынамі без адпаведных апазнавальных знакаў. І, мусіць, не толькі таму, што парушальнікі строга караюцца. Галоўная прычына — у менталітэце, сумленні. Займаць парковачныя месцы, прызначаныя для людзей з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі, лічыцца там недапушчальным, — непрыстойным...**

Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

**Зварот Гродзенскай абласной арганізацыі Беларускага таварыства інвалідаў па зроку да работнікаў грамадскага транспарту:**

*«Паважаныя кіроўцы! Звяртаемся да вас з просьбай. Калі вы ўбачылі на вуліцы чалавека з белай палкай — значыць, гэта сляпы альбо слабавідушчы чалавек. Звярніце ўвагу на такога чалавека, які стаіць на тратуары прыпынку. Спыніце свой транспарт як мага бліжэй да бардзюра, каб перашкоды (слупы, урны і г.д.) не перашкаджалі ўваходу і выхаду, аб'явіце нумар маршруту. Калі ваш транспарт не абсталяваны запісам прыпынкаў па маршруце руху, аб'яўляйце іх па радыё. Калі заўважылі, што невідушчы чалавек рыхтуецца выхадзіць, як мага бліжэй спыніцеся да тратуара і не спяшайцеся адчыняць дзверы».*

Нядаўна ў Гродне прайшоў маніторынг па пытаннях арганізацыі безбар'ернага асяроддзя для людзей з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі. Яго ўдзельнікі падзяліліся на групы і накіраваліся на аб'екты гарадской інфраструктуры — аховы здароўя, гандлю, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, транспарту. Што датычыцца аўтапарковак, то высновы несуцяшальныя. Нягледзячы на акцыі, што раз-пораз праводзяцца Дзяржаўтаінспекцыяй і арганізацыямі інвалідаў, на наклейкі, што пакідаюцца на машынах парушальнікаў («Паркуйся, як чалавек!», «Кіроўца, не спяшайся на наша месца!»), многім па-ранейшаму плюе на, здавалася б, элементарныя нормы. У чым пераканаўся і карэспандэнт «Звязды».

Гандлёвы цэнтр «Мока» на вуліцы Горкага. Побач — аўтапаркоўка, 6 метраў якой прызначаны толькі для транспартных сродкаў інвалідаў. Заступаю на «дзяжурства» каля слупа з адпаведнай таблічкай. Наўрад ці можна паскардзіцца, што яе дрэнна відаць, аднак... Калі б зараз тут захацелася спыніцца чалавеку, для якога адведзены гэты ўчастак асфальту, то не атрымаецца. Чаму? З гэтым пытаннем і звяртаюся да жанчыны, якая выйшла з крамы і накіравалася да свайго легкавіка. Мяркуючы па адсутнасці на заднім шкле знака «Інвалід», аўтамабіль прыпаркаваны з парушэннем правілаў дарожнага руху. Так і ёсць, а тлумачэнне кіроўцы наступнае: «А што? Усе тут становяцца». Праўда, жанчына абяцае больш гэтага не рабіць. І тое добра. Можа, і сапраўды будзе нейкая карысць ад маёй заўвагі.

Што, на жаль, малаверагодна ў дачыненні наступнага парушальніка.

— А вы хто такі, што я павінен даваць справаздачу? — абураецца мужчына ў адказ на пытанне, ці мае ён права тут паркавацца.

— Жыхар Гродна, — адказваю.

— Дык і ідзіце сабе... — раіць мужчына і накіроўваецца ў краму.

Аднак літаральна тут жа ў яго планах нешта мяняецца. Яўна не паспеўшы аставарыцца, ён выходзіць на вуліцу, сядае за руль і ад'язджае. Чаму раптам заспяшаўся? Хутчэй за ўсё, гэта было звязана зусім не з маральнымі перажываннямі (што не па-людску павёў сябе, заняўшы месца для транспарту інваліда), а з бояззю пратакола. Невядома ж, што на розуме ў гэтага нечаканага «кантралёра». А што, калі запіша нумар аўтамабіля і паведаміць у ДАІ? У далейшым так, мусіць, трэба і рабіць, асабліва калі сутыкаешся з агрэсіўным хамствам. Пакуль жа абмяжоўваюся «прафілактыкай» у дачыненні яшчэ трох кіроўцаў і накіроўваюся на прадпрыемства «Фільтр» грамадскай арганізацыі «Беларускае таварыства інвалідаў па зроку», дзе за «круглым сталом» былі абмеркаваны ўражанні ад вышэйзгаданага маніторынгу па безбар'ерных пытаннях гарадской інфраструктуры.

Маніторынг праводзіўся па ініцыятыве Гродзенскай абласной арганізацыі БелТІЗ. Прычым ён датычыўся не толькі інвалідаў па зроку, але і іншых людзей з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі.

— Даводзілася чуць, што мы вельмі назойлівыя і шмат чаго патрабуем. Аднак трэба разумець, што гэта вельмі надзённыя праблемы. У чым тут жа пераконваюцца, напрыклад, людзі, якія ўжо ў дарослым узросце страцілі зрок. Для іх гэта куды большая катастрофа, чым для невідушчых альбо слабавідушчых з нараджэння. Элементарныя пытанні — выйсці з пад'езда, дайсці да бліжэйшай крамы, аддзялення сувязі — становяцца праблематычнымі альбо наогул невырашальнымі. Таму людзі з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі маюць патрэбую не ў спачуванні, а ў разуменні і канкрэтнай дапамозе, у рэальным безбар'ерным асяроддзі, — зазначае **старшыня Гродзенскай абласной арганізацыі БелТІЗ Ірына НОВІКАВА**.

У цэлым за два апошнія гады на Гродзеншчыне зроблена нямала, каб дапамагчы такім людзям інтэгравацца ў грамадства. Летась, напрыклад, у вобласці 176 аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры абсталяваны пандусамі і поручнямі, за 9 месяцаў гэтага года — 146. Значныя сродкі былі накіраваны і на пакупку нізкападлогавых аўтобусаў. Разам з тым, зазначае **галоўны спецыяліст Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гродзенскага аблвыканкама Вольга СІДЗЕЛЬНІК,** многае з запланаванага не зроблена. У Воранаўскім і Іўеўскім раёнах, адпаведна, з васьмі і трох праграмных аб'ектаў не выкананы ніводны. У Слонімскім — толькі адзін аб'ект запланавалі і таксама не зрабілі. Менш за палову аб'ектаў, вызначаных праграмай на сёлетні год, выканалі ў Ваўкавыскім, Гродзенскім, Карэліцкім, Мастоўскім, Астравецкім раёнах і ў абласным цэнтры.

— Пры гэтым наш маніторынг паказаў, што ў многіх выпадках для таго, каб вырашыць вельмі важныя для людзей з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі праблемы, патрабуюцца не вялікія фінансавыя сродкі, а жаданне і граматны падыход да гэтай справы, — лічыць **намеснік начальніка ўпраўлення ідэалагічнай работы Гродзенскага аблвыканкама Ірына СЦЕПАНЕНКА.**

Падчас абмеркавання вынікаў маніторынгу прадстаўнікі ўсіх службаў, якія адказваюць за прынцыпова важныя для людзей з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі сацыяльныя аб'екты, выказалі гатоўнасць вырашыць існуючыя праблемы безбар'ернага асяроддзя. Праўда, часта не хапае ведання, як гэта зрабіць на сучасным узроўні. У выніку, бывае, і выканалі мерапрыемства, а людзям нязручна. Што і пацвердзіў маніторынг.

— Трэба правесці ўніфікацыю параметраў безбар'ернага асяроддзя ў любой установе. Вызначыць, напрыклад, найбольш прымальную для інвалідаў па зроку шырыню кантрастных палос пры афарбоўванні першай і апошняй прыступак лесвічных маршаў пры ўваходзе і ўнутры будынкаў, мінімальны дыяметр кантрастнага круга для абазначэння зашклёных дзвярэй, а таксама мінімальны памер шрыфту для камфортнага чытання інфармацыйнага тэксту. Прычым вельмі важна, каб аптымальныя крытэрыі безбар'ернага асяроддзя ўлічваліся ўжо на стадыі праектавання аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры, — лічыць **намеснік начальніка ўпраўлення аховы здароўя Гродзенскага аблвыканкама Аляксандр КАШУЙ.**

Калі ж гэтага не адбываецца, то, відавочна, «безбар'ерная» праца павінна ісці на ўзроўні не проста пажаданняў, а перагляду існуючых дзяржаўных стандартаў, каб неабходныя для людзей з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі ўмовы на сацыяльных аб'ектах былі абавязковай нормай. Як паказаў маніторынг, пакуль так адбываецца далёка не ўсюды. Напрыклад, цяпер праводзіцца рэканструкцыя Гродзенскага чыгуначнага вакзала, фінансавыя затраты вялікія, аднак вышэйзгаданая «дробязь» у інтарэсах слабавідушчых (афарбоўка першай і апошняй прыступак лесвічных маршаў) не ўлічана. Дык што, цяпер бракуе за афарбоўку гэтых прыступак давядзецца, калі аб'ект пакінуць будаўнікі? Няўжо гэта невырашальная праблема — своечасова задзейнічаць будаўнічыя матэрыялы адпаведнага колеру, згодна з сучаснымі тэхналогіямі безбар'ернага асяроддзя?

Мяркуецца, што па выніках маніторынгу безбар'ернага асяроддзя на аб'ектах сацыяльнай інфраструктуры ў Гродзенскім аблвыканкаме будуць падрыхтаваны даручэнні адпаведным арганізацыям. Што ж датычыцца кіроўцаў, якія займаюць парковачныя месцы для інвалідаў, то, можа, трэба хаця б на некаторых паркоўках устанавіць відэарэгістратары і ўвесці адпаведныя штрафныя санкцыі да парушальнікаў?

**Барыс ПРАКОПЧЫК**

■

# КРОКІ НАСУСТРАЧ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

На складанасць фарміравання памяркоўнага стаўлення да інвалідаў як на галоўную праблему ў сістэме адукацыі асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця наракаюць і ў Міністэрстве адукацыі. Гэта ўжо праблема грамадства, усіх нас.

### Права на годнае жыццё, працу і адпачынак

Што тычыцца дзяржавы, то яна лічыць, што людзі з інваліднасцю заслугоўваюць не спагады, а перш за ўсё гарантыі іх правоў на годнае жыццё, працу і адпачынак. Што ж робіцца для забеспячэння гэтых правоў?

**У Беларусі пражываюць 519 тыс. інвалідаў (каля 5,5% агульнай колькасці насельніцтва), у тым ліку 25 тыс. дзяцей-інвалідаў.**

Сёння ў мэтах паляпшэння якасці жыцця людзей з інваліднасцю ў рэспубліцы рэалізуецца Комплексная праграма развіцця сацыяльнага абслугоўвання на 2011-2015 гады.

Як паведаміў **начальнік упраўлення дзяржаўнай сацыяльнай падтрымкі насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі Анатоль РАЖАНЕЦ,** наймальнікам штогод устанаўліваецца браня для працаўладкавання інвалідаў. У 2012 годзе яна ўстаноўлена для прыёму на працу 2,1 тыс. інвалідаў, за дзевяць месяцаў гэтага года ў лік броні на працу былі прыняты 680 чалавек.

У гэтым годзе быў павялічаны памер фінансавання на стварэнне працоўных месцаў для інвалідаў. Са студзеня па верасень 2012 года ў органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне звярнуліся 3,1 тыс. інвалідаў, з іх былі працаўладкаваны 1,7 тысячы. Акрамя таго, аказваецца падтрымка прадпрымальніцкай ініцыятывы людзей з абмежаванымі магчымасцямі шляхам іх кансультавання і прадастаўлення субсідый.

У Беларусі сфарміраваны раённыя электронныя банкі будынкаў і збудаванняў, дзе неабходна стварыць безбар'ернае асяроддзе.

Для садзейнічання сацыяльна-бытавой, сацыяльна-працоўнай і сацыяльна-псіхалагічнай рэабілітацыі інвалідаў ва ўсіх 149 тэрытарыяльных цэнтрах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, пачынаючы з 2010 года, працуюць аддзяленні дзённага знаходжання для інвалідаў.

Акрамя таго, інваліды ў Беларусі, паводле слоў Анатоля Ражанца, змогуць скарыстацца паслугай пражывання, якое суправаджаецца дапамогай спецыялістаў. Гэта паслуга заклікана садзейнічаць інвалідам у адаптацыі да ўмоў побыту і працоўнай дзейнасці, падрыхтоўваць іх да самастойнага жыцця па-за стацыянарнымі ўстановамі. Паслуга прадугледжана новай рэдакцыяй закона Беларусі «Аб сацыяльным абслугоўванні».

Укараняюцца новыя формы работы з улікам міжнароднага вопыту. Так, у Веснаўскім доме-інтэрнаце для дзяцей-інвалідаў Магілёўскай вобласці і Багушэўскім доме-інтэрнаце для дзяцей-інвалідаў Віцебскай вобласці створаны дамы кватэрнага тыпу самастойнага пражывання. Галоўнай мэтай адкрыцця такіх дамоў з'яўляецца адаптацыя дзяцей-інвалідаў да самастойнага жыцця.

Усяго ў краіне функцыянуюць 77 стацыянарных устаноў сацыяльнага абслугоўвання, у якіх пражываюць 17,9 тыс. чалавек. У мэтах забеспячэння даступнасці сацыяльнага абслугоўвання для жыхароў вёскі, у першую чаргу інвалідаў і састарэлых, у цэнтрах ствараюцца сацыяльныя пункты і філіялы. На 1 кастрычніка 2012 года ў Беларусі працуюць 913 такіх сацыяльных пунктаў і 16 філіялаў.

Міністэрства працы і сацыяльнай абароны сумесна з зацікаўленымі бакамі распрацавала і ўнесла ў Савет Міністраў Беларусі праект закона «Аб далучэнні Беларусі да Канвенцыі аб правах інвалідаў». Зараз гэты законапраект дапрацоўваецца. У канвенцыі не замацаваны нейкія асаблівыя правы інвалідаў, але ў ёй паказаны шлях рэалізацыі ўжо існуючых агульнапрызнаных правоў чалавека, у тым ліку права на працу, ахову здароўя, адукацыю і паўнацэнны ўдзел у жыцці грамадства. Гэты дакумент прынялі 154 краіны. Што тычыцца нашай, то, па словах **каардынатара офіса па правах людзей з інваліднасцю Сяргея ДРАЗДОЎСКАГА,** сёння і мы гатовы далучыцца да канвенцыі.

**Святлана БУСЬКО**

■

# ПА АДУКАЦЫЮ — НА КАЛЯСКУ

## Дыплом аб заканчэнні ВНУ маюць толькі два працэнты інвалідаў

**У заходнееўрапейскіх універсітэтах — звычайная з'ява, калі ў вучэбнай аўдыторыі поплеч са здаровымі студэнтамі вучацца і іх аднагодкі з абмежаванымі магчымасцямі. А вось для Беларусі гэта не характэрна. Па звестках Офіса па правах людзей з інваліднасцю, у краіне на ўліку ў органах па працы, занятасці і сацыяльнай абароне знаходзяцца больш за паўмільёна чалавек з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Але вышэйшую адукацыю з кожнай сотні такіх людзей набываюць усяго двое. З гэтай нагоды ў Інстытуце інфармацыйных тэхналогій Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі прайшла навукова-метадычная канферэнцыя, прысвечаная пытанням бесперапыннай прафесійнай адукацыі людзей з абмежаванымі магчымасцямі.**

Начальнік упраўлення спецыяльнай адукацыі Міністэрства адукацыі Антаніна Змушко прызнае, што сёння перад інвалідамі, якія хочуць атрымаць вышэйшую адукацыю, стаіць шмат праблем:

— Па-першае, не ва ўсіх вышэйшых навучальных установах створана безбар'ернае асяроддзе. Значная частка вучэбных карпусоў пабудавана больш чым паўстагоддзя таму, калі аб праблемах інвалідаў проста не задумваліся. Па-другое, не хапае матэрыяльна-тэхнічнай базы. Напрыклад, без спецыяльнага праграмнага забеспячэння невідушчы чалавек не зможа працаваць на камп'ютары. Хаця інваліда мала вучыць. Рана ці позна перад ім паўстане пытанне працаўладкавання. А пералік магчымых прафесій для яго значна меншы, чым для здаровага чалавека. Але згодна з Дзяржаўнай праграмай развіцця спецыяльнай адукацыі ў Беларусі на 2012-2016 гады гэтыя пытанні будуць паступова вырашацца.

Пакуль у краіне толькі распрацоўваецца спецыяльная методыка навучання людзей з абмежаванымі магчымасцямі, каб яны маглі атрымліваць вышэйшую адукацыю. Першапраходцам тут стаў БДУІР. Дырэктар Інстытута інфармацыйных тэхналогій гэтай установы Валерый Назарэнка перакананы, што вырашаць гэтую праблему жыццёва неабходна:

— Трэба ўлічваць, што зараз у айчынных вышэйшых навучальных установах агульнага тыпу атрымліваюць адукацыю толькі два працэнты інвалідаў. Калі параўноўваць гэтую лічбу з Расіяй і Украінай, а тым больш з краінамі Заходняй Еўропы, яна мізэрная. У той жа час у Расіі гэтым займаюцца, сярод іншых навучальных устаноў, Маскоўскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт імя Баўмана, ва Украіне — Нацыянальны ўніверсітэт імя Тараса Шаўчэнкі — аўтарытэтнейшыя ВНУ. Таму мы распрацавалі інавацыйны праект «Сацыяльная адаптацыя асоб з абмежаванымі магчымасцямі», які налічвае больш за два дзясяткі прапаноў. Акрамя таго, там прадугледжана распрацоўка метадычных комплексаў як для выкладчыкаў, так і для студэнтаў-інвалідаў, мадэрнізацыя матэрыяльна-тэхнічнай базы, стварэнне спецыялізаванага праграмнага забеспячэння. Таксама трэба стварыць адмысловы інфармацыйна-адукацыйны партал і базу вакансій для асоб з абмежаванымі магчымасцямі.

Зараз у Беларусі асобныя групы для студэнтаў з парушэннямі слыху, зроку, апорна-рухальнага апарату існуюць толькі ў чатырох навучальных установах. Загадчык аддзялення сярэдняй спецыяльнай адукацыі Мінскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа электронікі Аляксандр Пугач гаворыць, што ў іх асобныя групы для інвалідаў будуць аб'яднаны са звычайнымі:

— Хоць інваліды ў нас і вучацца ў сваім асяродку, але гэта ні ў якім разе не перашкаджае іх зносінам з астатнімі навучэнцамі. Перыядычна мы праводзім розныя мерапрыемствы, каб між імі ўсталёваліся цесныя кантакты. Але мы не стаім на месцы. Хутка на вуліцы Кнорына адкрыецца спецыялізаваны вучэбны корпус, разлічаны на 350 чалавек. Групы ў ім будуць інтэграваныя. Гэта значыць, што на кожную з іх прадугледжана 1-2 месцы для інвалідаў. Ды і колькасць навучэнцаў у групе зменшыцца да 15-20, што таксама пойдзе на карысць.

Акрамя Мінскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа электронікі, такія асобныя групы для студэнтаў-інвалідаў цяпер дзейнічаюць у Гомельскім дзяржаўным машынабудаўнічым тэхнікуме, Магілёўскім дзяржаўным эканамічным прафесійным-тэхнічным каледжы, а пры Мінскім дзяржаўным гандлёвым каледжы створаны эксперыментальны Цэнтр рэабілітацыі інвалідаў.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

■ Побач з намі

# КРЫХУ СОНЦА Ў ХАЛОДНАЙ ВАДЗЕ

**Знешне яны амаль нічым не адрозніваюцца ад тых людзей, якіх мы сустракаем штодня на вуліцы. Аднак, на жаль, у іх пашкоджана псіхіка. Зрэшты, ад такога крутога павароту ў жыцці не застрахаваны ніхто. Кагосьці гэтая бяда напаткала ўжо ў сталым узросце. А здараецца, што душэўнага здароўя ў чалавека не хапае яшчэ з нараджэння. У грамадстве існуе стэрэатып, што ад такіх людзей трэба трымацца далей. Але гэта няправільна. Бо яны ні ў чым не вінаваты. Яны таксама могуць і ўмеюць кахаць, радавацца жыццю, весці (з дапамогай) хатнюю гаспадарку, ствараць нешта новае. Проста ім не пашанцавала, аднак жа гэта не можа служыць важкай прычынай для непрымання ў соцыуме...**

ЛЮДЗІ з парушэннямі псіхікі, якіх суд прызнаў недзеяздольнымі, абавязкова павінны атрымаць апекуна. Але, па праўдзе кажучы, не кожны чалавек гатовы дабравольна ўзяць на сябе такі цяжар, кардынальна змяніць уласны лад жыцця. Таму ў краіне функцыянуюць дамы-інтэрнаты для людзей, якія пакутуюць на псіханеўралагічныя расстройствы. Там для іх створаны ўсе ўмовы, каб яны не адчувалі сябе адарванымі ад жыцця і атрымлівалі належны догляд. У адзін з такіх інтэрнатаў, размешчаны ў вёсцы Новы Уборак, што ў Пухавіцкім раёне, і выправіўся ў камандзіроўку карэспандэнт «Звязды».

Кожнага госця адразу пасля ўезду на тэрыторыю Пухавіцкага дома-інтэрната для псіханеўралагічных хворых сустракаюць драўляныя скульптуры, уласнаручна зробленыя выхаванцамі. Дырэктар інтэрната Аляксандр Ляшэнка кажа, што лячэнне карыснай працай вельмі дапамагае традыцыйнай лекавай тэрапіі:

— Я прытрымліваюся думкі Бялінскага аб тым, што праца надае чалавеку годнасць. Вынікі такога падыходу можна бачыць няўзброеным вокам. У чатырохпавярховым прасторным корпусе паўсюль вісяць малюнкі і аплікацыі. Цэлы стэнд прысвечаны прыгожым выцінанкам. Справа ў тым, што псіхічна нездаровы чалавек выдатна разумее і адчувае эмоцыі. Зусім як малое дзіця. Калі такога чалавека шчыра пахваліць, то ў яго на нейкі перыяд паляпшаецца самаадчуванне. Вядома ж, пільны кантроль пры гэтым з боку супрацоўнікаў інтэрната ніхто не адмяняў.

Так, бываюць у хворых і абвастрэнні, але ў гэтым нічога незвычайнага для кваліфікаванага персаналу няма. Сярэдні ўзрост падапечных — а іх каля 387 — сорак пяць гадоў. Некалькі чалавек знаходзяцца ў інтэрнаце ледзь не з часоў яго адкрыцця — а гэта больш за паўстагоддзе. Усе яны пазбаўлены дзеяздольнасці па рашэнні суда. Амаль палова мае набытыя захворванні. У мінулым жыцці гэтыя людзі былі вайсковымі афіцэрамі, педагогамі, медыцынскімі работнікамі. Звычайныя, на першы погляд, прафесіі, а жыццё вось як распарадзілася...

Такім хворым жыццёва неабходны догляд і клопат. Аляксандр Ляшэнка запэўнівае: праца наладжана належным чынам:

— Мы карыстаемся развітай сістэмай відэаназірання, ва ўстаноўцы якой нам дапамог Нацыянальны банк. І гэта вельмі дапамагае, бо псіхічна нездаровыя людзі не заўсёды і не ў адпаведнай ступені могуць кантраляваць свае дзеянні. Садзейнічаюць нам таксама прамысловыя і будаўнічыя арганізацыі. Яны пастаўляюць прадукты харчавання, сельскагаспадарчыя тавары. Мы трымаем вялікую падсобную гаспадарку: агульнае пагалоўе набліжаецца да чатырохсот. Іх таксама (пад дбайным кантролем санітараў) даглядаюць нашы падапечныя. Вырошчваем садавіну і гародніну. І гэта прыносіць плён: мы цалкам забяспечваем сябе бульбай і мясам. Дарэчы, харчуюцца выхаванцы чатыры разы на дзень. Адметна, што нормы харчавання выражаюцца не ў грашовым эквіваленце, а ў натуральным.

Не забываюцца і на культурнае жыццё. У корпусе знаходзіцца вялізная бібліятэка, і хутка яна пераедзе ў большае памяшканне. Кожны знаходзіць літаратуру на свой густ. Камусьці падабаюцца ваенныя прыгоды, нехта схільны да гістарычных кніг... Не так даўно з'явіўся ў інтэрнаце малельны пакой. Рэгулярна сюды прыязджае айцец Аляксандр, які праводзіць службу, а пеўчыя нават арганізуюць міні-канцэрты. Кожны аўторак установу наведвае ксёндз Уладзіслаў. Завітваюць сюды і валанцёры з міжнародных гуманітарных арганізацый. Не так даўно інтэрнат прымаў дэлегацыю з Ірландыі. Акрамя іншага, госці са Смарагдавага вострава згулялі з выхаванцамі сапраўдны футбольны матч, дзе ніхто не хацеў саступаць.

— Цікаўлюся, ці бывае так, што чалавек вяртаецца да нармальнага жыцця.

— Безумоўна, — адказвае Аляксандр Ляшэнка. — Некалькі гадоў таму да нас трапіў Аляксей Д. *(з этычных меркаванняў усе імёны і прозвішчы тых, хто пражывае ў доме-інтэрнаце, зменены. — **Аўт.**)*. Яму было ўсяго дваццаць шэсць гадоў. Зусім малады, прыгожы хлопец, але вельмі любіў выпіць. Загана давяла да страты працы, а потым яго накіравалі да нас. Прабыў у нас каля чатырох гадоў, а потым яго забрала дадому маці. Пазней праз суд ён аднавіў сваю дзеяздольнасць, і зараз у яго ўсё добра.

Здараецца, што чалавек у інтэрнат паступіў, а пасля пра яго «забыліся». Яго гадамі не наведваюць родныя, не забіраюць хоць на некаторы час да сябе. Але, на шчасце, такіх людзей можна пералічыць па пальцах.

РАЗАМ з намеснікам дырэктара дома-інтэрната Анатолем Вяжэвічам заходзім у адну са шматлікіх палат, дзе знаходзяцца трое хворых. Анатоль Віктаравіч тлумачыць:

— Двое з іх здружыліся ўжо вельмі даўно. Малодшаму, Аляксандру, нядаўна споўнілася трыццаць шэсць гадоў. Але ў яго з нараджэння дзейнічае толькі адна нага. Ён крыху чуе і разумее гаворку людзей, але сам размаўляць і рухацца не можа. Своеасаблівым перакладчыкам для яго стаў Іван, які можа крыху гаварыць. Вось так у нас утварыўся сапраўдны дуэт. Да Аляксандра рэгулярна прыязджае маці, якая жыве ў адной з памежных з Беларуссю краін.

— Які гасцінец ты хочаш ад маці? — пытаецца Анатоль Вяжэвіч у Аляксандра праз Івана.

Той праз некалькі секунд адказвае:

— Ноўтбук... Бачыць маці... Часцей...

Заўважаю, што Аляксандр пальцам нагі пераключыў на пульце тэлевізійны канал. І тут жа мой погляд падае на прыгожы рушнічок. Аказваецца, такую прыгажосць ён вышыў сам — адной нагой. Настойлівасці гэтага чалавека можна толькі пазайздросціць...

Інструктар па працатэрапіі Святлана Паніна кажа, што імкненне такіх людзей да фізічнай працы можна толькі вітаць. Але і тут ёсць свае асаблівасці:

— Я родам з Узбекістана, але няпросты лёс закінуў мяне ў Беларусь. І вось ужо дзесяць гадоў працую ў інтэрнаце. Спецыфіка працы ў тым, што псіхічна нездаровага чалавека ўвогуле нельга крыўдзіць, яму трэба паказваць сваё ўменне цярпець. Калі штосьці ў яго атрымліваецца дрэнна — усё роўна неабходна пахваліць за старанне. Пасля ўжо разам з урачом папраўляем агрэхі на вырабах, але выхаванцы гэтага не павінны бачыць. Гэта як табу. Цікава, што нашы падапечныя часта робяць адно і тое ж з дня ў дзень, і пераключыцца на іншую працу не хочуць. Мабыць, яны імкнуцца да дасканаласці, спрабуюць яшчэ і яшчэ. Пры гэтым кожны стварае, што жадае, кошык з лазы, мадэль музычнага рога, грашовае дрэва, фігурку з паперы. Галоўнае — не перашкаджаць, а дапамагаць.



НАПЭЎНА, ніводны чалавек у дзяцінстве не любіў прымаць лекі альбо пераносіць уколы. І доктару даводзілася яго ўгаворваць і пераконваць. Гэты ж падыход спрацоўвае і тады, калі перад урачом знаходзіцца дарослы чалавек з асаблівасцямі псіхікі. Хіба што тут доктар абавязаны быць вельмі асцярожным, каб неспадзявана не пакрыўдзіць хворага. Гэта пацвярджае і ўрач-тэрапеўт інтэрната Людміла Рагожная:

— У адрозненне ад звычайнай паліклінікі, мы працуем з аднымі і тымі ж пацыентамі. Іх дыягназы вядомыя, хворыя знаходзяцца пад пастаянным медыцынскім наглядам. Але ж людзі хварэюць яшчэ на прастуду, гіпертанію... Калі да доктара ў звычайную паліклініку прыходзіць пацыент, ён скардзіцца на здароўе і тлумачыць, што і дзе ў яго баліць. Але ж гэтага не можа зрабіць наш падапечны. Калі ўрачу даводзіцца пускаць у ход дыпламатыю, то кабінет ператвараецца ў сапраўдны тэатр двух артыстаў.

Не так даўно сюды паступіў Сяргей П. Цяпер у гэта цяжка паверыць, але спачатку ён быў сапраўдным бамжом — зарослым і брудным. Нічога не хацеў рабіць, знаходзіўся ўвесь час на «ўзводзе». Але праз пару месяцаў уцягнуўся ў працу па гаспадарцы і кардынальна змяніў свае погляды. Цяпер выглядае як звычайны мужчына.

Для псіхічна нездаровага чалавека няма нічога больш страшнага за нашу апатыю і пагарду. Яго самаадчуванне напрамую залежыць ад стаўлення навакольных. Гэта закон прыроды, і змяніць яго немагчыма. Таму найлепшы шлях паразумецца з такім чалавекам — не ставіць сябе вышэй за яго. Для персаналу дома-інтэрната ў Новым Уборку гэта — аксіёма.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота аўтара.**

*Мінск — Новы Уборак — Мінск*

■

■ 1 снежня — Сусветны дзень барацьбы са СНІДам

# БЕЗ БЕЛЫХ ПЛЯМ

**ВІЧ застаецца сур'ёзнай невылечнай хранічнай хваробай. Лячэнне ВІЧ-інфекцыі — сур'ёзная праца ўрача і пацыента, а таксама блізкіх яму людзей. Прафілактыка вышэйзгаданага заражэння — гэта ў першую чаргу паводзіны і лад жыцця канкрэтнай жанчыны або мужчыны. І гэта пэўныя веды кожнага з нас.**
**Урач-эпідэміёлаг аддзела прафілактыкі ВІЧ/СНІДу Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Валянціна БЫКАВА адказвае на некалькі распаўсюджаных пытанняў.**

**У якім выпадку чалавек сутыкаецца са стапрацэнтнай верагоднасцю заражэння ВІЧ-інфекцыяй? Што робіцца для прафілактыкі ў гэтым выпадку?**

Аднаразовае пераліванне інфіцыраванай ВІЧ крыві прыводзіць да заражэння амаль у 100% выпадкаў. З 2006-га ў Беларусі не адзначана выпадкаў перадачы ВІЧ праз донарскую кроў. У краіне адпрацавана сістэма адбору донараў — у 100% выпадкаў праводзіцца абследаванне донарскай крыві на ВІЧ і іншыя ўзбуджальнікі інфекцыйных хвароб, ажыццяўляецца карантынізацыя крыві на працягу 100 дзён. У лячэбныя ўстановы прадукты крыві выдаюцца толькі пасля паўторнага абследавання донара. Укараняюцца сучасныя падыходы да прафілактыкі перадачы ВІЧ праз донарскую кроў з выкарыстаннем малекулярна-генетычных метадаў даследавання (палімеразна-ланцуговай рэакцыі).

**Наколькі высокая рызыка заражэння пры аднаразовым палавым кантакце? Якая гэта рызыка пры аральным сэксе? Хто больш рызыкуе — мужчына ці жанчына?**

Дакладнага разліку рызыкі інфіцыравання пры аднаразовым палавым кантакце няма, паколькі на гэта ўплывае мноства фактаў (узровень віруснай нагрузкі партнёра, наяўнасць запаленчых працэсаў палавых органаў, від палавога кантакту і інш.). Устаноўлена, што верагоднасць заражэння ВІЧ ніжэй, чым для інфекцый, якія перадаюцца палавым шляхам. Пры наяўнасці фактараў рызыкі верагоднасць заражэння ВІЧ узрастае на 10-15%.

Што тычыцца аральнага сэксу, то сліна чалавека, які жыве з ВІЧ, не змяшчае дозы, дастатковай для інфіцыравання партнёра. Аднак калі на слізістай ротавай поласці ёсць пашкоджанні і ў сліне прысутнічае прымесь крыві, то ёсць і некаторая верагоднасць заражэння ВІЧ для прымаючага боку.

Перадача віруса імунадэфіцыту чалавека ад мужчыны жанчыне прыкладна ў 2 разы вышэй, чым ад жанчыны мужчыну, што звязана з анатама-фізіялагічнымі асаблівасцямі жанчыны.

**Ці абараняе прэзерватыў ад ВІЧ?**

Пры вытрымліванні правілаў захоўвання, выкарыстання пры кожным палавым кантакце латэксныя прэзерватывы забяспечваюць амаль 100-працэнтную абарону.

**Наколькі высокая распаўсюджанасць ВІЧ-інфекцыі сярод беларускіх прадстаўнікоў сэкс-бізнэсу?**

Паводле даследаванняў 2011 года, распаўсюджанасць ВІЧ сярод жанчын, якія прадастаўляюць сэксуальныя паслугі, складае 2,4 працэнта.

**Ці праўда, што ёсць людзі, якія не заражаюцца ВІЧ?**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Сярод насельніцтва Скандынаўскіх краін сапраўды рызыка інфіцыравання ніжэй, што абумоўлена генетычнымі асаблівасцямі будавання клетак.

**У чым сутнасць лячэння ВІЧ-інфіцыраваных? Ці існуе ў нашай краіне праблема з забеспячэннем такімі лекамі?**

Сутнасць — у камбінаваным прымяненні антырэтравірусных прэпаратаў, якія ўздзейнічаюць на розныя структуры ВІЧ. Абавязковай умовай з'яўляецца бесперапыннасць лячэння і наяўнасць адчувальнасці ВІЧ да антырэтравірусных прэпаратаў. Пры гэтым дасягаецца падаўленне размнажэння ВІЧ і зніжаецца нагрузка на імунную сістэму. Усе, хто мае патрэбу, назіраюцца ва ўрача-інфекцыяніста і бясплатна атрымліваюць антырэтравірусныя прэпараты.

**Ці сутыкаюцца дзеці са статусам ВІЧ з сацыяльнай праблемай афармлення ў садок ці школу?**

У мінулым такія выпадкі сустракаліся. Сёння перашкод для наведвання дзецьмі з ВІЧ-інфекцыяй дзіцячай дашкольнай установы або школы няма.

**На якім этапе знаходзіцца распрацоўка прафілактычнай вакцыны?**

Сёння ў свеце створана каля 20 вакцын. Аднак ні адна з іх не рэкамендавана для шырокага прымянення, што абумоўлена высокай зменлівасцю віруса.

**У нашай краіне са 100 тысяч чалавек — 116 ВІЧ-інфіцыраваныя. Найбольшая колькасць інфіцыраваных выяўлена ў Гомельскай і Мінскай абласцях, а таксама ў сталіцы. Прыкладна ў 75% выпадкаў заражэнне адбываецца палавым шляхам.**

## ВІДЫ ТЭСТАЎ НА ВІЧ

Выявіць вірус у арганізме можна толькі з дапамогай спецыяльных тэстаў. Працэс тэсціравання заключаецца ў выяўленні антыцелаў, якія выпрацоўваюцца арганізмам у адказ на з'яўленне віруса, або ў вызначэнні ДНК самога віруса.

1-ы тэст — імунаферментны аналіз. Самы распаўсюджаны метад дыягностыкі, які прымяняецца пры стандартным абследаванні ў паліклініках і бальніцах. ІФА вызначае наяўнасць антыцелаў да ВІЧ ў крыві. Дакладны вынік можна атрымаць праз 3-6 месяцаў пасля таго, як вірус трапіў у арганізм. Толькі за гэты час у крыві назапашваецца тая колькасць антыцелаў, якую можа выявіць такі аналіз.

Адмоўны вынік такога тэста азначае, што ў крыві няма антыцелаў і, адпаведна, самога віруса. Аднак існуе і паняцце псеўдаадмоўнага выніку, калі антыцелы не паспелі выпрацавацца, і тэставанне было праведзена ў «перыяд акна» — менш чым праз тры месяцы трапляння ВІЧ у арганізм. Станоўчы вынік азначае, што ёсць антыцелы і, адпаведна, вірус. Псеўдастаноўчы вынік ў такім выпадку можа мець месца ў пацыентаў з хранічнымі інфекцыйнымі, аўтаімуннымі, анкалагічнымі і некаторымі іншымі захворваннямі, а таксама ў выпадку цяжарнасці. Таму любы станоўчы вынік абавязкова правяраюць на больш адчувальным тэсце.

2-і тэст — імунаблот. Гэты тэст вызначае наяўнасць спецыфічных антыцелаў да ВІЧ. Станоўчы вынік імунаблоту азначае, што ў крыві ёсць ВІЧ.

Палімеразна-ланцуговая рэакцыя выкарыстоўваецца для вызначэння РНК, спадчыннага матэрыялу віруса. Гэта вельмі эфектыўная і адчувальная рэакцыя. Адчувальнасць гэтага тэста вельмі высокая: РНК віруса выяўляецца ў сыроватцы крыві праз 10 дзён з моманту мяркуемага заражэння.

**Працэдура здачы аналізу.** Спачатку запаўняецца бланк з указаннем імені ці без. Затым адбываецца забор крыві з вены. Перад аналізам можна папрасіць спецыяліста расказаць, у чым сутнасць аналізу. Таксама спецыяліст можа на падставе расказу аб нейкай канкрэтнай сітуацыі ацаніць, наколькі высокай была рызыка перадачы ВІЧ.

Пасля атрымання выніку тэста таксама варта пагаварыць са спецыялістам. Як правіла, пасля тэста абмяркоўваецца атрыманы вынік і наступныя дзеянні. Кансультацыя ананімная.

## САМЫЯ БЕСТУРБОТНЫЯ — КАМУ ЗА 30

За 30 гадоў, якія чалавецтва жыве з ВІЧ/СНІДам, устойлівы стэрэатып «СНІД — чума XX-XXI стагоддзя!» адназначна састарэў. Па сутнасці, ён быў брэндам гэтай тэмы. На жаль, нават сёння некаторыя журналісты выкарыстоўваюць падобныя выразы ў сваіх публікацыях. Спецыялісты адзначаюць, што падобны брэнд — вельмі шкодны. Шматлікія даследаванні паказваюць, што страх, які выклікаюць падобныя выразы, не прыводзіць чалавека да выбару правільнай мадэлі паводзін. Такім чынам, тэма, хутчэй, наогул адмаўляецца і выціскаецца са свядомасці звычайнага абывацеля. Адначасова страх нарадзіў шэраг міфаў.

**Міф першы. ВІЧ=СНІД=смерць.** Сёння гэта адназначна не так. Дзякуючы антырэтравіруснай тэрапіі можна захаваць якасць жыцця, жыць доўга і не сутыкнуцца з такім захворваннем, як СНІД. ВІЧ — гэта не СНІД. Паміж імі нельга ставіць знак роўнасці.

**Міф другі. Ізаляцыя людзей з ВІЧ вырашыць праблему распаўсюджвання інфекцыі.** Вынікам становіцца толькі дыскрымінацыя інфіцыраваных людзей. Навешванне ярлыкоў звычайна проста ўзмацняе праблему.

**Міф трэці. ВІЧ можа перадавацца падчас дотыку.** У нашы дні вядомы выпадкі, калі з ВІЧ-станоўчым дзіцем кантактуюць праз гумавыя пальчаткі. ВІЧ не перадаецца падчас дотыкаў, пацалункаў.

**Паводле слоў намесніка міністра — Галоўнага дзяржаўнага санітарнага ўрача Рэспублікі Беларусь Ігара ГАЕЎСКАГА, беларусы добра ведаюць асноўныя шляхі перадачы ВІЧ, аднак гэта не дае гарантыі, што маладыя людзі будуць карыстацца прэзерватывам. Звыш 40 працэнтаў ВІЧ-інфіцыраваных — гэта людзі ва ўзросце 30-39 гадоў. Яны чамусьці перакананы, што прафілактыка ВІЧ — не актуальная для іх тэма. Да іх Міністэрства аховы здароўя і будзе спрабаваць звяртацца ў бліжэйшай перспектыве.**

**Такім чынам, тэма ВІЧ/СНІДу мае патрэбу ў рэбрэндынгу, і заключаецца ён, галоўным чынам, у тым, што кожны з нас павінен зрабіць свой унёсак у прафілактыку распаўсюджвання інфекцыі.**

**Святлана БАРЫСЕНКА**

■ Страчанае сумленне

# ПРЫЙШОЎ, УБАЧЫЎ, ПАШКОДЗІЎ...

Мемарыял ва ўрочышчы Гай.

**У чэрвені 1942 года ў Баранавічы прыбыў эшалон. У ім «...былі прывезены чэхаславацкія падданыя з сем'ямі з розных гарадоў гэтай краіны, пераважна інтэлігенцыя (урачы, інжынеры, настаўнікі і інш.) у колькасці 3 тыс. чалавек. Па прыбыцці эшалона на станцыю прывезеным было прапанавана пакінуць усе свае рэчы, сесці ў машыны і паехаць на абед. Пад выглядам абеду іх вывезлі за горад на адлегласць 2 км ва ўрочышчы Гай і там расстрэльвалі. Частка людзей памерла падчас перавозак у «душагубках». Усе іх рэчы з вагонаў былі перавезены ў СД, а затым працяглы час немцы гэтыя рэчы адпраўлялі ў Германію сваім сем'ям». (З акта баранавіцкай гарадской камісіі аб масавым знішчэнні савецкіх грамадзян у горадзе Баранавічы і яго наваколлях і аб згоне іх у фашысцкае рабства гітлераўскімі захопнікамі ў 1941-1944 гг.). Цела расстраляных каты звальвалі ў два равы. Старажылы распавядалі, што зямля ва ўрочышчы «дыхала» яшчэ некалькі дзён...**

У 1972 годзе на месцы гібелі чэхаславацкіх грамадзян (у асноўным яўрэяў) з'явіўся мемарыяльны комплекс. Нават у пагодлівы сонечны дзень тут, ва ўрочышчы Гай, на ўскраіне Баранавічаў, жудасна. Ад подыху ветру разгойдваецца бронзавы звон, умацаваны на двух бетонных пілонах, і быццам стогн нясецца ўгару... Да неба цягнуцца рукі, дарожка вядзе да сцяны расстрэлу, да парога, за якім — смерць.

Зрэшты, у апошні час аб спакоі ў месцы мемарыяла казаць не прыходзіцца. Ужо двойчы на працягу гэтага года ён пацярпеў ад дзеянняў вандалаў. Злачынцам спадабалася медзь, з якой выраблены барэльефы. Першы раз кавалкі металу з помніка былі выразаны яшчэ ў сакавіку. Аднаўленне пашкоджанага барэльефа абышлося ўладальніку — прадпрыемству «Баранавічырэмбуд» — у суму каля 8 мільёнаў рублёў. Але гэта кошт матэрыяльны, так бы мовіць. Даць ацэнку маральнаму боку справы цяжка, бо немагчыма падабраць прыстойныя словы.

Дарэчы, вясной злачынцаў так і не знайшлі. А магчыма, ніхто ўзмоцнена і не шукаў. Таксама ніхто не паклапаціўся аб ахове мемарыяла — да прыкладу, аб арганізацыі відэаназірання за ім. Вынік быў заканамерны. Некалькі дзён таму вандалы зноў паздзекаваліся з помніка. У гэты раз пашкоджанні больш сур'ёзныя. Відаць, што зладзеі працавалі, грунтоўна падрыхтаваўшыся. Пашкоджаны помнік заўважыла жыхарка Баранавічаў, якая гуляла ва ўрочышчы. Яна і паведаміла пра гэта ў адну з мясцовых газет.

Вандалы выразалі кавалкі медзі з тыльнага боку барэльефа.

— Я не разумею тых, хто робіць падобнае. Гэта варварства, здзек з памяці загінулых людзей, — не ўтойвае свайго абурэння дырэктар «Барановічырэмбуд» Уладзімір Кудласевіч.

Цяпер па факце псавання мемарыяла, які, дарэчы, унесены ў рэестр помнікаў, што ахоўваюцца дзяржавай, праводзіцца праверка. Супрацоўнікі міліцыі старанна абследавалі ўскраіну ўрочышча. Зрэшты, без дапамогі неабыякавых людзей, тых, хто заўсёды нешта бачыць, нешта чуе і нешта ведае, ім, мабыць, не абысціся. І дапамагчы ім — наш абавязак.

**Таццяна ГРЫНКЕВІЧ. Фота аўтара.**

## КАНТРАБАНДНЫЯ ТЭЛЕВІЗАРЫ

На аўтадарозе Брэст — Мінск — мяжа РФ непадалёк ад вёскі Рэдзькі Дубровенскага раёна супрацоўнікі праваахоўных органаў затрымалі аўто, на якім перавозілі 52 кантрабандныя тэлевізары.

Аўтамашынай «Мерседэс-Бенц» кіраваў жыхар Мінска. Тэлепрыёмнікі маркі «Самсунг» наш зямляк перавозіў з Масквы ў Мінск. Тэлевізары агульным коштам больш як 203,5 мільёна рублёў канфіскавалі, бо яны падлягаюць маркіроўцы кантрольнымі (ідэнтыфікацыйнымі) знакамі. А значыць, былі ўвезены на тэрыторыю нашай краіны з парушэннем закона.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

■ Супраць раку

# «ХІМІЯ» НЕ ШКАДУЕ НЫРАК

**Рак ныркі сустракаецца ў 2 разы часцей у мужчын, чым у жанчын. Амаль у палове выпадкаў гэты від раку выяўляецца ўжо на позніх, 3-й і 4-й стадыях, што значна пагаршае прагноз лячэння і выздараўлення.**

Што такое ныркі для нармальнай жыццядзейнасці нашага арганізма? Гэта рэгуляцыя водна-солевага балансу, кіслотна-шчолачнага стану, утварэнне гармону рэніну — біялагічна актыўнага рэчыва, якое ўплывае на ўзровень артэрыяльнага ціску, нарэшце, утварэнне мачы. Паводле статыстычных даных, рак такога парнага органа, як нырка, складае 4% ад усіх злаякасных пухлін у дарослых. Сярод уралагічных пухлін рак ныркі займае трэцяе месца пасля раку прастаты і мачавога пузыра.

На працягу апошніх дзесяці гадоў у Беларусі назіраецца рост колькасці выпадкаў ныркаклетачнага раку ў 1,5 раза. Толькі ў Мінску захваральнасць вырасла з 14 да 20 выпадкаў на 100 тысяч насельніцтва, кажа **загадчык аддзялення онкаўралогіі Мінскага гарадскога клінічнага анкалагічнага дыспансэра Ігар МАСАНСКІ**.

— Адзіным з даказаных фактараў рызыкі захворвання на рак ныркі з'яўляецца курэнне. Аднак далёка не ўсе хворыя з'яўляюцца курцамі або мелі гэту шкодную звычку раней. У апошні час у медыцыне вялікая ўвага надаецца вывучэнню ролі так званых хімічных канцэрагенаў — рэчываў, здольных выклікаць або паскорыць развіццё злаякасных пухлін. **У развіцці раку ныркі можа адыграць ролю кантакт з такімі хімічнымі злучэннямі, як цыклічныя вуглевадароды, нітразазлучэнні, прадукты перапрацоўкі нафты, азбест. Найбольш часта гэтыя рэчывы сустракаюцца на дубільнай, лакафарбавай і нафтаперапрацоўчай вытворчасцях. Павышае рызыку развіцця ныркаклетачнага раку і працяглы прыём анальгетыкаў з фенацэцінам.** Да фактараў рызыкі развіцця гэтага захворвання адносіцца таксама атлусценне, асабліва ў жанчын.

***— Што можна сказаць аб прыкметах і сімптомах гэтага віду раку?***

— На ранніх стадыях хвароба працякае бессімптомна. У працэсе развіцця хваробы можа з'явіцца прымесь крыві ў мачы, боль у жываце і пояснічнай вобласці, аб'ёмнае ўтварэнне ў вобласці жывата. Нягледзячы на тое, што гэтыя прыкметы з'яўляюцца класічнымі, яны выяўляюцца літаральна ў 15% хворых. Развіццё хваробы можа суправаджацца і такімі неспецыфічнымі сімптомамі, як агульная млявасць, пахудзенне, страта апетыту, павышэнне тэмпературы цела, анемія, артэрыяльная гіпертанія. Нярэдка заяўляюць аб сабе задышка, кашаль, боль у касцях, што звязана з метастазамі ў лёгкіх і касцях.

***— Як дыягнастуецца рак ныркі?***

— Асноўны метад абследавання пацыентаў з падазрэннем на рак ныркі — агульны і біяхімічны аналіз крыві з вызначэннем ныркавых і пячоначных тэстаў, аналіз мачы, ультрагукавое даследаванне і камп'ютарная тамаграфія органаў брушной поласці, рэнтгенаграфія лёгкіх, экскраторная ўраграфія. Пацыентам з болем у касцях паказана радыенукліднае сканіраванне коснага шкілету. Дадаткова па паказаннях можа прызначацца магнітна-ядзерная тамаграфія, кантраснае рэнтгенаўскае даследаванне сасудаў нырак і полай вены, пункцыйная біяпсія пухліны пад ультрагукавым кантролем.

***— Якое лячэнне прымяняецца пры ўстаноўленым дыягназе?***

— Асноўны метад лячэння — хірургічны. Найбольш часта, асабліва пры вялікіх пухлінах, выкарыстоўваецца поўнае выдаленне органа разам з навакольнай тлушчавай клятчаткай, лімфатычнымі вузламі і прылеглай брушынай. Такая аперацыя называецца радыкальнай нефрактаміяй. Падчас яе можа быць выдалены і наднырачнік, асабліва калі пухліна размяшчаецца ў верхняй частцы ныркі. Пры пухлінах малых памераў, двухбаковым раку, парушэнні функцыі процілеглай ныркі выконваецца выдаленне паражонага ўчастка органа з пухлінай. У хворых з першай стадыяй захворвання хірургічнае лячэнне прыводзіць да выздараўлення больш як у 80% выпадкаў.

***— Як часта рак ныркі дае метастазы?***

— Прыкладна ў адной трэці хворых выяўляюцца метастазы падчас першай дыягностыкі і яшчэ ў 40-50% хворых іх выяўляюць у наступныя пяць гадоў пасля правядзення радыкальнага лячэння. Нягледзячы на бурнае развіццё анкалогіі за апошняе дзесяцігоддзе, лячэнне метастатычнага раку ныркі застаецца адносна неэфектыўным. Прымяненне імунатэрапіі, гармональных і хіміяпрэпаратаў у розных камбінацыях дае станоўчыя вынікі менш як у 15% выпадкаў. Ныркаклетачны рак таксама з'яўляецца неадчувальным да прамянёвай тэрапіі.

### ДЛЯ ПАПЯРЭДЖВАННЯ РАЗВІЦЦЯ РАКУ НЫРКІ НЕАБХОДНА:

***1.*** *У харчаванні — дастатковая колькасць агародніны, садавіны, малака і малочных прадуктаў. Ужыванне не менш як 1,5 л вадкасці ў суткі.*

***2.*** *Звядзенне да мінімуму прафесійных кантактаў з хімічнымі канцэрагенамі.*

***3.*** *Сістэматычнае праходжанне ўльтрагукавога абследавання асобам, занятым на дубільных, лакафарбавых і нафтаперапрацоўчых вытворчасцях.*

***4.*** *Не курыць.*

***5.*** *Не ўжываць моцнаградусныя напоі.*

***6.*** *Не дапускаць бескантрольнага, без прызначэння ўрача, ужывання цэлага шэрагу анальгетыкаў, якія змяшчаюць фенацэцін, анальгін, кадзін, ацэцілсаліцылавую кіслату і інш., а таксама гіпатэнзіўных сродкаў, якія змяшчаюць рэзерпін.*

**Святлана БАРЫСЕНКА**

## ШТО ТАКОЕ ЗЛАЯКАСНАЯ ПУХЛІНА?

**Арганізм чалавека складаецца з бясконцага мноства клетак. У нармальным стане клеткі, адпрацаваўшы пэўны час, гінуць і замяшчаюцца іншымі, аналагічнымі. Працэс гібелі і ўтварэння новых клетак адбываецца ў строгай адпаведнасці з парадкам, генетычна ўстаноўленым для кожнага віду органаў і тканак. Аднак часам, пад уплывам мноства фактараў, арганізм аказваецца няздольным арганізаваць іх нармальную работу. Такі бескантрольны рост і называецца пухлінай. Найбольшую небяспеку для жыцця чалавека ўяўляюць злаякасныя пухліны. Для іх характэрны хуткі рост, паражэнне навакольных органаў і тканак, распаўсюджванне па ўсім арганізме (метастазы), развіццё інтаксікацыі і агульнага знясілення. Акрамя таго, злаякасныя пухліны могуць выклікаць шэраг ускладненняў. Найбольш небяспечныя — кровацячэнні, перфарацыі полых органаў, пераломы касцей, сціскванне спіннога мозга. Адной з цяжкіх анкалагічных хвароб з'яўляецца рак ныркі.**

■ Інфарм-укол

# БУСЛА НЕ ВЫКЛІКАЛІ?

**Узровень абортаў у краіне знізіўся дзякуючы больш актыўнаму выкарыстанню метадаў кантрацэпцыі. Або... грамадзяне Беларусі пачалі менш займацца сэксам, што малаверагодна, мяркуе старшы навуковы супрацоўнік Інстытута дэмаграфіі НДУ «Вышэйшая школа эканомікі» Расійскай Федэрацыі, кандыдат эканамічных навук Вікторыя САКЕВІЧ. Калі ў 1990 годзе на 100 жыванароджаных прыпадала 183 аборты, то ў 2010 годзе — 31.**

— Для нашых краін галоўны аргумент на карысць кантрацэпцыі — гэта магчымасць мець пажаданых дзяцей ў тыя тэрміны, якія сям'я лічыць для сябе аптымальнымі, — кажа Вікторыя. — Пажаданы памер сям'і ў нас — у сярэднім два дзіцяці, і ён слаба залежыць ад якіх-небудзь фактараў. Нашы жанчыны ў выпадку незапланаванай цяжарнасці — а яна можа здарыцца і з-за збою кантрацэпцыі — больш схільныя зрабіць аборт, чым раджаць непажаданае дзіця...

Паводле Multiple Indicator Cluster Survey 2005, у Беларусі 75 працэнтаў замужніх жанчын рэпрадуктыўнага ўзросту або жанчын, якія маюць партнёра, выкарыстоўваюць кантрацэпцыю. Праўда, 16,5 працэнта прымяняюць толькі так званыя традыцыйныя метады, якія лічацца не надта эфектыўнымі. Спецыялісты мяркуюць, што праблема не столькі ў недаступнасці кантрацэптываў, колькі ў недастатковай інфармаванасці, адсутнасці сэксуальнай адукацыі і пастаяннага доступу да кваліфікаванага спецыяліста.

Такое паняцце, як «незадаволеная патрэба ў планаванні сям'і» (стандартны паказчык, які прымяняецца ў публікацыях ААН), адлюстроўвае ўдзельную вагу пар, якія не жадаюць заводзіць дзіця ў бліжэйшы час, здольныя да зачацця, сэксуальна актыўныя, але пры гэтым не прымяняюць ніякіх сродкаў засцярогі ад цяжарнасці. У Беларусі гэты паказчык складае, паводле ацэнкі Multiple Indicator Cluster Survey 2005, 16 працэнтаў. Менавіта столькі пар маюць высокую рызыку незапланаванай цяжарнасці, а значыць, і аборты.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**
**открытого акционерного общества «МОТОВЕЛО»**
(г. Минск, проспект Партизанский, 8)
**СОСТОИТСЯ 7 декабря 2012 г.**
**по адресу: г. Минск, проспект Партизанский, 8**
**В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ**
Орган, по решению которого созывается общее собрание акционеров:
**Наблюдательный совет ОАО «МОТОВЕЛО».**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об утверждении результатов закрытой подписки на простые (обыкновенные) акции ОАО «МОТОВЕЛО».
2. Об утверждении решения о выпуске простых (обыкновенных) акций ОАО «МОТОВЕЛО».
3. Об утверждении изменений и дополнений в устав ОАО «МОТОВЕЛО».
4. Об утверждении цены выкупа простых (обыкновенных) акций ОАО «МОТОВЕЛО» по требованию акционеров.

Бюллетени для заочного голосования акционеры получают с 3 декабря по 4 декабря 2012 г. по адресу: г. Минск, проспект Партизанский, 8, юридический отдел ОАО «МОТОВЕЛО», с 9.00 до 17.00 (обеденный перерыв с 13.00 до 14.00), под роспись при предъявлении паспорта (для представителей акционеров — паспорта и доверенности).

Акционеры обязаны возвратить заполненные бюллетени для заочного голосования по указанному адресу не позднее 17.00 4 декабря 2012 г.

С проектом решений собрания, решения о выпуске простых (обыкновенных) акций ОАО «МОТОВЕЛО», изменений и дополнений в устав ОАО «МОТОВЕЛО», формой и текстом бюллетеня для заочного голосования акционеры могут ознакомиться с 3 декабря по 4 декабря 2012 г. по адресу: г. Минск, проспект Партизанский, 8, юридический отдел ОАО «МОТОВЕЛО», с 9.00 до 17.00 (обеденный перерыв с 13.00 до 14.00).

Список лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, составлен на основании данных реестра владельцев акций ОАО «МОТОВЕЛО» по состоянию на 30 ноября 2012 г.

Выкуп акций по требованию акционеров производится по номинальной стоимости. Заявления от акционеров о выкупе акций по требованию акционеров принимаются 7 декабря 2012 г.

УНП 190017558

Наш культурны асяродак

# Жыроандоля

Выпуск № 37 (167)

■ Праз экран

## КІНААМАТАР ЯК ЛЕТАПІСЕЦ

**Гэтыя словы справядлівыя для той справы, якую робіць найстарэйшы кінааматар Беларусі Анатоль Антонавіч Шнэйдэр з Талачына. Больш за 50 гадоў ён фіксуе на кінакамеру тое, чым жывуць людзі ў яго родных мясцінах. Яму зараз больш за 80 гадоў, а ён здымае фільмы пра сваіх землякоў, баючыся ўпусціць імгненні рэальнага, непадробнага жыцця вяскоўцаў, якое пакрысе сыходзіць разам з імі. А рэжысёр Вольга Дашук вырашыла зняць фільм пра тое, як ён гэта робіць. Дакументальная стужка «Кінааматар. Асенні сон» сёлета была паказаны на шэрагу міжнародных кінафестываляў, нават за акіянам, у Амерыцы, акрамя таго, была адабраны для ўдзелу ў конкурсе на «Прыз Еўропы», які адбываецца ў Берліне і трапіў у шасцёрку фільмаў (з 24 прадстаўленых) для паказу шырокай аўдыторыі. Шырокая аўдыторыя для гэтага фільма на радзіме — у Беларусі — павінна была паглядзець гэты фільм у дакументальным конкурсе на фестывалі «Лістапад». Гэта адзіная з сёлетніх прадстаўленых беларускіх стужак, якая была адзначана прызам Парламенцкага сходу Саюза Беларусі і Расіі.**

Дакументальнае кіно пра тых, хто здымае кіно — не рэдкасць, нават на тэлеэкране — нам, бывае, паказваюць пасля нейкага шматсерыйнага фільма, як яго здымалі, як працавалі на здымачнай пляцоўцы «зоркі», як кантактавалі з рэжысёрам і гэтак далей. Але тут — асаблівая гісторыя. Таму што Анатоль Антонавіч, «зорка» гэтага фільма, сам здымае кіно пра тых людзей, якія жывуць зусім не напаказ. Але яны вельмі шчырыя і сумленныя, стомленыя жыццём, але моцна любяць яго — жыццё ціхай і простай беларускай вёскі, дзе яшчэ захоўваецца цяпло дзякуючы нешматлікім насельнікам.

— У сваім фільме я ішла за Анатолем. Гэта адна з яго асноўных тэм — знікненне вёскі, знікненне людзей, якіх ён бачыў усё жыццё. Ён родам быў з вёскі Парэчча пад Талачыном. Там зараз вельмі мала жыхароў засталося. Гэта на поўначы Беларусі, вельмі прыгожыя мясціны, у якіх вельмі мала насельнікаў. Але гэта чароўныя людзі... Некаторыя людзі былі з дзяцінства вядомыя Анатолю, а некаторых ён бачыў першы раз. Але мне пашанцавала — і гэта было ўжо якасцю Анатоля: яны раскрываліся перад ім за кароткі час. Калі здымаеш фільмы пра людзей, то ў першую чаргу трэба ўвайсці да іх у давер. Я, як рэжысёр, арыентавалася на тое, што блізка самому Анатолю. Давялося назіраць цікавыя чалавечыя сітуацыі, паглядзець на людзей, якія яму блізкія, як яны жывуць. Гэта яму баліць, таму што гэта яго родныя мясціны. Ён бачыць, як мяняецца жыццё, эмацыянальна ўсё гэта ўспрымае, — распавядае Вольга Дашук.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Вольга ДАШУК атрымлівае спецпрыз на «Лістападзе-2012».

— Ніякай пастаноўкі не было ні ў маім фільме, ні ў Вользіным, — дадае сам герой, Анатоль Шнэйдэр. — Нават рэальна паказана тая бабулька, якая хавалася, каб яе не здымалі, таму што бачыла першы раз аб'ектыў кінааператара. А калі я падышоў са сваёй камерай, то яна памякчэла, стала распытваць: «А што вы за людзі?.. Адкуль прыехалі?.. А ці ёсць у вас дакументы?..» Я хуценька пашпарт дастаў. Але яна яшчэ ўсё хадзіла, малілася і казала: «Божа, барані мяне ад гэтых людзей...» А з мужам і жонкай, якія сядзелі ў валёнках, кантакт атрымаўся нармальны. Ён нічога не бачыць, вось чаму спытаў: «Ці яны паехалі?..» Гэтых людзей я абсалютна не ведаў. Я сапраўды здымаў так, як думаў і хацеў. А мяне ў гэты час здымалі...

Анатоль — аўтар актыўны, у яго шмат фільмаў, якія ён здымае не столькі для публікі, колькі для гісторыі, каб захаваць вобразы сваіх землякоў — шчырых, наіўных, але працавітых і вельмі добрых людзей.

**Ларыса ЦІМОШЫК**

# ТЭАТРАЛЬНЫ ДЭФІЦЫТ

**Спектакль у беларускім тэатры, на актуальную для сучасных беларусаў тэму, на беларускай мове... Ну, гэта я завярнула. Па максімуме — чаго ўжо сціпла задавольвацца чым-небудзь адным. Вось бы хто паказаў спектакль пра тое, што з намі беларускімі людзьмі адбываецца цяпер, дзе мы ёсць, якія мы. Можа быць, усё яшчэ «Людзі на балоце»? Ці «Тутэйшыя» на «Раскіданым гняздзе»? А можа, для нас у новым стагоддзі знайшлося б нейкае іншае вызначэнне? Хачу зразумець сябе. Хачу зразумець сябе ў спалучэнні з суграмадзянамі. І хачу пра гэта з некім пагаварыць. Мастацтва — найлепшая пляцоўка для падобных размоў. Яно можа знайсці ўдалы вобраз, прапанаваць трапны выраз, які пяройдзе ў азначэнне, калі яго агучыць нейкі герой, увасоблены класным артыстам. Сапраўды, у тэатральнай зале неяк жывей усё адчуваеш: словы напоўнены чалавечай энергетыкай, таму западаюць глыбока і потым, бывае, носіш іх у сабе, усведамляючы сэнс. Таму ад беларускага тэатра хочацца нечага свайго, з нашай энергетыкай і сэнсам. Але ў тэатрах нашай краіны ўсё-такі больш расійскай і заходняй класікі, чым беларускай, не гаворачы ўжо пра сучасную драматургію. Пры дапамозе чаго і як выправіць становішча? З гэтымі пытаннямі я звярнулася да драматурга Аляксея Дударава, старшыні Саюза тэатральных дзеячаў Беларусі, які сёлета ўзначальваў журы Нацыянальнай тэатральнай прэміі, і пачула адказ:**

— Беларуская драматургія заўсёды была ў дэфіцыце і гэты дэфіцыт захаваецца. Думаеце, 30 гадоў таму, калі быў яшчэ жывы Макаёнак, не ўзнікала пытанняў: «Чаму не ставяць маладых?» Гучалі, напрыклад: «Чаму нацыянальнай драматургіі няма на сцэнах беларускіх тэатраў?» Было, да скандалаў справы даходзілі. Мая п'еса «Парог», якая прайшла па ўсім Савецкім Саюзе, была ўпершыню пастаўлена не ў нас, а ў Маскве. А тут спектакль выйшаў на сцэну гады праз два...

***— У нашых тэатрах ёсць комплекс на ўспрыманне твораў, якія напісаны айчыннымі аўтарамі?***

— Не, не ўсё так проста. Тут разбірацца трэба доўга, у чым прычына. Ці прычыны. Цяпер іх, можа, больш. Бо раней доступ да заходняй літаратуры і драматургіі быў абмежаваны, а цяпер сеў, адкрыў ноўтбук, на кнопку націснуў — і атрымаў усё, што захацеў. І можна выбраць, што ставіць: я гэта адчуваю, я гэта так бачу, гэта крэатыўна, гэта будзе канцэптуальна. З усіх бакоў льецца паток матэрыялу — у ім няма недахопу. Я, можа, кажу рэзка, але я выхаваны ў іншых эстэтычных межах, на іншых аўтарах, з іншым падыходам да жыцця, чым маладыя. Не я прыдумаў слова «чарнуха». Але падаецца, што чамусьці тым, хто займаецца творчасцю, пісаць пра тое, што светлае, нецікава. Гэта не крэатыўна. Яшчэ кажуць: «Гэта будзе карыстацца попытам»... А варта было б схадзіць на «адстойныя» на думку некаторых спектаклі і паглядзець, як глядач на іх рэагуе. А ён на сапраўднае адкрыты. І атрымліваецца, што запатрабаванае адно, а кормяць другім. Таму што «чарнуха» нахабная...

***— У нас жа беларускай «чарнухі» ў тэатры няма...***

— Ёсць, яна проста не трапляе на сцэну. Некалькі п'ес мне ў рукі папалася, я пачытаў, пасля мне захацелася рукі памыць. Плынь свядомасці, як кажуць. Не ведаю... Можа, я адстаў і чагосьці не разумею. Але я разумею адно: нейкія галоўныя рэчы ніколі не мяняюцца. Кожнаму хочацца ў мастацтве сапраўднага, а не эрзацу.

***— Мне, напрыклад, у беларускім спектаклі хочацца сапраўднай беларускай мовы. Макаёнак пісаў па-беларуску, яго ставілі і на яго хадзілі...***

***Але дзе сучасныя п'есы на беларускай мове?***

— Гэта пытанне не зусім творчае... Я свае п'есы пісаў па-беларуску. Усе: «Вечар», «Парог», «Радавыя» і іншыя. Хадзілі. І ў Купалаўскі тэатр хадзілі, глядзелі па-беларуску. У нас у тэатры Арміі спектакль «Радавыя» ідзе на дзвюх мовах. Беларусы, якія ёсць у спектаклі, гавораць па-беларуску, а рускія гавораць па-руску. Яны адно аднаго разумеюць.

***— Аднак жа гэта канцэптуальна...***

— Справа ў тым, што так і было. Калі з нейкай беларускай вёскі, якую вызвалілі, прызвалі ў войска былога партызана, то на якой мове ён будзе гаварыць? Як ён скажа: «Есть!», «Раўняйсь!», «Смірна!»... Ён будзе казаць так, як казаў бы дома. А той салдат, які з-пада Ржэва, натуральна, па-руску гаварыў. І разумелі яны адзін аднаго, з аднаго кацялка елі. Дарэчы, ідзе ў нас спектакль «Вераб'іная ноч», дзе ёсць адзін герой з цікавай моўнай сітуацыяй: які б ён патрыёт Радзімы ні быў, якія б карані ў яго ні былі, але калі ён у царскай арміі служыць афіцэрам, то не можа ён па-беларуску размаўляць. А калі з вёскі з левага, ці з правага берага Дняпра прызвалі чалавека ў армію, то ён па-беларуску будзе размаўляць. І зразумеюць. Іншым разам гэта будзе гучаць так: «Човен трэба...» — «Што?» — «Лодку трэба...»

**Паміж радкоў павінна быць самае галоўнае ў п'есе. І калі яно ёсць — тады ёсць драматургія.**

***— Добра, але дзе працяг? Час ідзе, узнікаюць новыя тэмы для асэнсавання, а тэатр сёння з'яўляецца жывой пляцоўкай для нейкага грамадскага дыялогу. Дзе наша сучаснасць на сцэне?***

— Па выніках тэатральнай прэміі я быў усцешаны, таму што ўжо разуверыўся ў беларускай драматургіі: няма яе. Аўтары ёсць, а драматургіі — няма. А паглядзеў «Аднакласнікі» паводле Юліі Чарняўскай — цікава. Спектакль, які выклікае спачуванне, заклікае да разваг. Нейкія рэчы сучасныя там: нельга абысціся, каб не паказаць сёння хлопчыка-калеку, дзяўчынку-калеку... Такое ёсць у жыцці, я ведаю. Але ў жыцці шмат ёсць таго, пра што ўсе ведаюць, але яно не з'яўляецца досведам мастацтва. Даследаваць гэта павінны сацыёлагі, медыкі, журналісты. Але грамадства павінна ведаць пра гэта. Але не мастацтва гэта тады, калі гаворка пра вузкаспецыяльныя (напрыклад, медыцынскія) рэчы. Я, напрыклад, не разумею, чаму карыстаецца поспехам «Доктар Хаус»? Паглядзеў серыю — назва хвароб. Няўжо паталогія так прывабная?

***— А калі грамадства паталагічнае?..***

— Павінна быць наадварот. У паталагічным грамадстве павінна быць запатрабавана светлае. Ведаеце, што мне падаецца: адбыўся такі перакос, можа, нават на ўзроўні трагедыі. Мы (маю на ўвазе славян) за ўсю гісторыю пастаянна пакутавалі. І вельмі любілі казкі. А на Захадзе вельмі ўтульна і сыта жылі. Дык вось каб не быць соннымі, іх тузаюць: можаш захварэць, паглядзі, задумайся пра гэта. Будзе так, калі ты будзеш толькі жэрці, спаць, піва жлукціць, ні пра каго не думаць, абіраць сваіх бліжніх і нікому нічога не даваць. Будзе так — гэта як пакаранне. Магчыма. А тут, калі і без таго ты не ведаеш, куды прыткнуцца, а табе яшчэ нашэптваюць, што ўсё дрэнна і ты памрэш, адно на адно накладаецца і невядома, у што выльецца. Я не за тое, каб суцяшаць, я не за тое, каб карміць казачкамі. Але нельга чалавека пазбаўляць надзеі. Яна ўваходзіць у трыадзінства: вера, надзея і любоў. І калі надзею ў чалавека адабраць, не будзе ні веры, ні любові. Увогуле калі з гэтага трыадзінства нешта выкрасліць, парушаецца сэнс. Бо якая ж надзея без любові? Ці вера? Веры без любові не бывае. Таму калі мы прамяняем калькі, якія недзе існуюць, на сябе, парушаецца гармонія, у тым ліку ў мастацтве. І тады я не разумею: навошта яно такое?

Вазьміце любога генія. Чым ён здзіўляў? Ён здзіўляў сапраўднай гармоніяй. Здзіўляў нават тады, калі ўсім здавалася, што тут гармоніі быць не можа. А яна была. І адкрыта была толькі яму, і ён яе паказаў. Але цяпер, аказваецца, здзіўляць можна дысгармоніяй: так нельга, а я зрабіў!.. Пра гэта вельмі добра пушкінскі (а не рэальна) Сальеры расказаў: «Раз'яў як труп музыку і славу атрымаў з гэтага». З гэтага сапраўднага мастацтва ніколі не атрымаецца. Калі толькі канцэптуальна раскласці, не падключыўшы да гэтага сэрца і ўласную душу — сапраўдныя мастакі заўсёды гэта робяць.

***— Ці ёсць у тэатрах попыт на беларускую тэму і на беларускія тэксты?***

— А ці ёсць попыт у Амерыцы на амерыканскае? Вавілон. Гэта я пра Амерыку.

***— А ў нас жа пакуль не Вавілон.***

— І ў нас робіцца Вавілон. Таму што нейкай абмежаванасці нацыянальнай ці сацыяльнай няма. У нас усё ёсць. У нас усе дома. Як у Амерыцы, дарэчы. У Амерыцы галоўнае, каб ты від на жыхарства займеў. І ўсё. І ты дома. Паедзеш у нейкую краіну — які ты багаты ні будзь, якім статусам ні карыстайся, ты будзеш у гасцях. Добра гэта ці дрэнна — рытарычнае пытанне.

***— Калі мы можам спажываць усё, ці ёсць тады наогул наша грамадства ў нейкім асаблівым варыянце? Ці ёсць беларускае грамадства? Тэатр жа як паказчык.***

— Я магу адказаць гэтым жа пытаннем...

***— Ці можна як-небудзь стымуляваць, каб з'яўлялася беларуская драматургія? Ці можна стымуляваць гэта ў плане з'яўлення аўтараў, якія пішуць на беларускай мове і ў плане пастановак іх твораў у тэатрах?***

— Вельмі складана. Аднак неабходна. Спробы такія былі, але ж тут жа актыўныя асобы гвалт падымаюць: а дзе роўнасць? Дзе роўнасць моў? Я гэта асабіста чуў. Праблем багата ў беларускай мовы, яе трэба падтрымліваць. Калі ў нармальнай сям'і нехта захварэе — лепшае і даражэйшае для яго, каб ён аднавіўся, ачуняў. Так і тут. Але калі сам сябе паважаць не будзеш, ніхто цябе паважаць не будзе.

***— Ёсць адваротны бок медаля. Калі я пайду ў тэатр і пабачу: вось жа, я магу сябе паважаць — дык я і пачынаю сябе паважаць.***

— Пытанне пытанняў: няўжо калі сваё ці па-беларуску — дык яно ўжо з-за гэтага лепшае? Гэта няпраўда.

***— Вядома, калі дрэнная беларуская п'еса, то лепш паставіць добрую рускую.***

— Але бусел у дзюбе добрую п'есу не прынясе. Каб яна з'явілася, трэба ставіць. Вось гэтыя словы я сказаў 30 гадоў таму з трыбуны Дома літаратараў. Як сёння...

***— Ці можна навучыць пісаць п'есы?***

— Навучыцца можна. Навучыць нікога нельга. У творчасці гэта, мабыць, шкодна. Паставіць голас магчыма, трэніроўкай дасягнуць, што чалавек зробіцца больш пластычны — гэта можна. Але навучыць пісаць і патлумачыць, з чаго часам нараджаецца думка, немагчыма. П'есу чытаеш: тры-чатыры радкі — і зразумела, што нешта тут ёсць. Хоць яшчэ сюжэту не ведаеш. А то глядзіш: і сюжэт ёсць, і накручана, але пуста. Паміж радкоў пуста. А паміж радкоў павінна быць самае галоўнае ў п'есе. І калі яно ёсць — тады ёсць драматургія. А як гэта робіцца, я не ведаю. Калі б ведаў, расказаў бы, няхай бы карысталіся.

***— Тэатральная прэмія можа стымуляваць творчыя працэсы ў Беларусі?***

— Яна стымулюе пакуль існуе азарт — узяць. Можа, больш спартыўны, чым творчы. Творчы працэс — ціхі, ён паступовы. Але добра, што прэмія ёсць. Думаю, яна ўдасканаліцца арганізацыйна і будзе сапраўднай адзнакай лепшаму.

**Размаўляла Ларыса ЦІМОШЫК.**

# ДЗЕ ШУКАЦЬ НАТХНЕННЕ?

**У гэтыя задумлівыя, самотныя дні, калі ноч паглынае дзень, а сонцу ніяк не прабіцца скрозь вэлюм туману, унікальная не толькі на постсавецкай, але і еўрапейскай прасторы сярэдняя спецыяльная ўстанова — гімназія-каледж мастацтваў імя І.В. Ахрэмчыка святкуе сваё пяцідзесяцігоддзе.**

Сёння мы сюды завіталі па натхненне. І ў пошуках яго разам з выпускнікамі, вядомымі мастакамі і музыкантамі, здзейснілі невялікае падарожжа ў часе. Яны вучыліся тут у розныя гады, але ёсць тое, што іх яднае. Гэта ўнутраная свабода, акрыленасць і натхнёны пагляд. Кожнага мы папрасілі адказаць на адно пытанне: «Дзе шукаць натхненне?»

**Нацюрморт з юнацтва. (1960-я — 1970-я).**

**Леанід ЛУК'ЯНЦАЎ,** вядомы беларускі мастак-манументаліст, аўтар вітражоў для Палаца культуры саўгаса-камбіната «Мір», універсама «Талін», касцёла ў Налібаках і многіх іншых твораў:

*— Натхненне трэба шукаць у жанчынах.*

Але ў яго майстэрні вісіць не жаночы партрэт, а невялікі, вельмі багаты па каларыце нацюрморт, які ён напісаў яшчэ вучнем тады школы-інтэрната для адораных дзяцей, куды прыехаў вучыцца з вёскі Мормаль Жлобінскага раёна.

— Самае дарагое, што згадваецца з таго часу — гэта атмасфера. Жывая, творчая, вясёлая. Маімі аднакласнікамі былі скульптар Баразненкаў, мастак-манументаліст Крываблоцкі...

На год старэйшы Уладзімір Савіч быў заўзятым футбалістам. Крыху пазней прыехалі сюды вучыцца сёння вядомыя як лепшыя вучні Міхаіла Савіцкага і прызнаныя ў свеце жывапісцы Алесь Ксяндзоў, Віктар Альшэўскі, Фелікс Янушкевіч, скульптар Святлана Гарбунова (аўтар помніка С. Буднаму ў Нясвіжы)...

Дарэчы, сын А. Ксяндзова Павел таксама скончыў гімназію-каледж і пасля Акадэміі мастацтваў прыйшоў сюды выкладаць. А на музычным аддзяленні сёння вучацца дзеці Ф. Янушкевіча. Даволі рэдкі феномен — творчыя дынастыі. Што казаць, адораныя дзеці нараджаюцца па вялікім каханні. А выпускнікі «парната» здольныя бачыць гармонію і ў рэчах, і ў людзях, і ў каханні.

**Хор суладдзя душаў (1980-я).**

**Вольга ІЖЫК** выкладае харавыя спевы, дырыжыраванне і іншыя спецпрадметы на музычным аддзяленні:

*— Натхненне я асабіста знаходжу ў дзецях.*

Акрыленая, светлая, апантаная, яна, як я заўважыла, калі трэба, можа быць цвёрдай, рашучай, яна чуе і прыводзіць у суладдзе юныя галасы. Можа таму і даручылі ёй арганізацыю вечара сустрэчы выпускнікоў, дзе на сцэне і ў зале можна было ўбачыць не зоркі, а цэлыя сузор'і натхнёных творцаў.

У гімназіі-каледжы ёсць некалькі ўзорных музычных калектываў, хор, якія гастралююць і па Беларусі, і па розных краінах свету, актыўна ўдзельнічаюць у дабрачынных акцыях.

**Салярныя знакі для Савета Рэспублікі (1990-я).**

**Юрый ПЕЎНЕЎ,** мастак-графік, жывапісец, манументаліст, лаўрэат спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі:

*— Дзе я шукаю натхненне? Гэта можа быць акружэнне, сябры, дзеці. Нешта новае, што абуджае фантазію.*

Дасюль усе згадваюць снежныя скульптуры, якія яны з сябрамі стварылі ў дворыку гімназіі-каледжа, куды ён прыехаў вучыцца з вёскі Каменка Чачэрскага раёна. Памятаю яго дыпломныя, з таемным, містычным гучаннем ляўкасы «Поры года» і эксперыментальныя інсталяцыі, што экспанаваліся на многіх рэспубліканскіх, міжнародных выставах. Але самыя значныя сёння праекты Ю. Пеўнеў зрабіў разам са сваім аднакласнікам і аднакурснікам, мастаком-манументалістам Д. Чубуковым. Найперш гэта мазаікі для Храма Усіх Святых у Мінску. А гэтым летам яны распрацавалі і разам з маладымі мастакамі В. Грынь, П. Ксяндзовым, А. і Я. Багданавымі, А. Пуцыковічам, Т. Пасюцінай, Я. Чыстым выканалі ўнікальныя мазаікі і вітражы для новага рэканструяванага будынка Савета Рэспублікі (былая Нацыянальная бібліятэка імя У.І. Леніна). Там адлюстраваны і глыбокае веданне народных традыцый, гісторыі мастацтва, і смеласць эксперыменту, і вялікая праца (дробная італьянская смальта, і маленькія шкельцы вымагалі ювелірнай дакладнасці), і, вядома, натхненне. Што ж дзівіцца: усе вышэйназваныя мастакі, як і кіраўнік Цэнтра сучасных мастацтваў В. Альшэўскі, акрыленыя «парнатам».

Застаецца толькі дадаць, што цудоўныя мазаікі і вітражы надта дарэчы ў будынку Савета Рэспублікі: натхненне патрэбна і для заканатворчасці. У гарманічным асяроддзі будуць нараджацца гарманічныя законы.

**Васілёк на памяць (2000-я).**

**Валянціна ПІСКУН,** мастак па касцюмах ансамбля «Харошкі» і яе муж Аляксандр Масло, трубач ваеннага аркестра:

*— Натхненне трэба шукаць вакол сябе.*

Яны пазнаёміліся тут, у гэтых сценах. Яна, няўрымслівая, дзёрзкая, як і яе дзве старэйшыя сястры (Вольга, жывапісец, і Соня, графік), вучылася на мастацкім, ён — на музычным. У свой час на «Млыне моды» яе дыпломная калекцыя «Каралева дыска» мела вялікі поспех. Але сёння, як і яе бацькі, выдатныя нашы мастакі Алена і Юрый Піскуны, яна стварае гармонію ў рэчышчы нашых старадаўніх, народных традыцый, якія не проста ведае, адчувае. Сёлета ў Валянціны і Аляксандра нарадзіўся сын Васіль. Ён якраз на паўстагоддзя маладзейшы за той дом, дзе пазнаёміліся яго бацькі.

**Рукі, што ахінаюць ружы. (2010-я. Новая старонка).**

*— А сёння дзе тут шукаць натхненне?*

*— У кабінеце дырэктара, — пажартаваў хтосьці.*

Кожны, хто вучыцца ў гімназіі-каледжы, хоць раз ды бываў тут. У кабінеце магістра педагагічных навук Людмілы Мікалаеўны Шахавай, якая ўжо больш за 35 гадоў працуе з таленавітымі дзецьмі (спачатку настаўніцай малодшых класаў, потым завучам, дырэктарам), адразу звяртаеш увагу на зробленую з гліны невялікую кампазіцыю: жаночыя рукі пяшчотна ахінаюць ружы. Мне чамусьці падалося, што гэта яе, Людмілы Мікалаеўны, рукі. Аўтар — Саша Навасёлаў, у сярэдзіне 1990-х прыехаў вучыцца сюды са Шчучына. Незвычайна адоранаму, але вельмі адзінокаму, неабагрэтаму цяплом сямейнага агменю хлапчуку тады дапамагала толькі яго старэнькая бабуля, а яшчэ практычна ўсе выкладчыкі «парната», якія яго боль успрынялі як свой уласны. У шаснаццаць ён першы раз перамог у рэспубліканскім конкурсе, стаў стыпендыятам спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. І на тыя грошы купіў... інструменты для працы ў матэрыяле. Сёлета Аляксандр Навасёлаў, аўтар цудоўных скульптурных кампазіцый і нават некалькіх помнікаў, рыхтуецца да абароны дыплома ў Беларускай дзяржаўнай Акадэміі мастацтваў. Але галоўнае — ён, не зведаўшы, не спазнаўшы ў маленстве сямейнага цяпла, будуе сваю сям'ю. Сёлета ў яго ўжо нарадзілася другая дачушка.

Мы шмат пра што гаварылі з Людмілай Мікалаеўнай Шахавай. Яна, здаецца, ведае і турбуецца пра ўсіх вучняў, выпускнікоў, выкладчыкаў, стараецца зразумець, падтрымаць кожнага. Адчуваю, што тут, у кабінеце дырэктара, яны заўжды знойдуць не проста падтрымку, а надзею, веру, любоў. А без гэтага не набыць унутранай свабоды, а значыць, не адшукаць натхнення.

**Галіна БАГДАНАВА.**

**Гэтую навучальную ўстанову, куды паступаюць адораныя дзеці з усёй Беларусі, у свой час скончылі:**

піяністы В. Дамарацкая і П. Кашчэва, флейтыстка Ю. Шчасновіч, спявачка і прадзюсар А. Ціхановіч, саліст каралеўскага Лонданскага аркестра Л. Каўрыговіч, выкладчык славутай «Гнесінкі» С. Асташонак, салістка амерыканскага мюзік-хола І. Мозалева, актрыса Купалаўскага тэатра С. Анікей, музыкант, мастак, тэлевядучы А. Такінданг, старшыня Саюза мастакоў Беларусі У. Савіч, выдатныя нашы скульптары А. Дранец (аўтар помніка Ф. Скарыну каля Нацыянальнай бібліятэкі) і В. Янушкевіч (аўтар помніка А. Міцкевічу), мастакі-графікі П. Татарнікаў, Р. Сітніца, У. Вішнеўскі і яшчэ сотні вядомых не толькі на Беларусі, але і далёка за яе межамі спевакоў, музыкантаў, мастакоў і педагогаў, якія выкладаюць музыку і выяўленчае мастацтва практычна ва ўсіх кутках нашай краіны.

**Толькі за апошнія гады 89 навучэнцаў сталі стыпендыятамі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. Больш за 100 — пераможцамі міжнародных і рэспубліканскіх творчых конкурсаў.**

■ Формула ўдачы

## З ВАНДРОЎНАГА — У НАЦЫЯНАЛЬНЫ

**ператварыўся за 80 гадоў Рускі драматычны тэатр.**

30 лістапада адзін з вядучых тэатраў Беларусі адзначыў юбілей святочнай вечарынай з капуснікам, дзе можна было пабачыць адразу ўсіх «зорак» айчыннага тэатральнага мастацтва, для якіх стаў домам гэты тэатр. Сярод іх — Расціслаў Янкоўскі, Вольга Клебановіч, Андрэй Душачкін, Аляксандр Ткачонак, Аляксандр Суцкавер, Сяргей Чэкерэс, Юлія Кадушкевіч, Вераніка Пляшкевіч і іншыя. Трупа сёння вялікая і яркая.

Але ж пачыналася ўсё ў Бабруйску, ці нават яшчэ раней — калі ўтварылася трупа пад кіраўніцтвам Уладзіміра Кумельскага. Яна не мела канкрэтнага месца, да якога была прывязана: гэта быў вандроўны тэатр. Але менавіта ён стаў асновай для стварэння ў 1932 годзе Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра БССР, а месцам жыхарства спачатку быў вызначаны Бабруйск. Ужо ў 1940 годзе выспела рашэнне перавесці гэты тэатр у Мінск, аднак зрабіць гэтага не паспелі... Аднак тэатр усё адно імкнуўся выжыць у гады вайны — ён ператварыўся ў франтавы, база была ў Маскве. Ужо пасля вайны працягваўся пошук свайго месца — у Магілёве і Гродне. Але ўсё-такі ў 1947 годзе тэатр пераязджае ў Мінск, атрымлівае свой будынак, у якім да вайны працаваў Дзяржаўны яўрэйскі тэатр (да рэвалюцыі тут была сінагога). А ў 1955 годзе тэатр стаў насіць імя Максіма Горкага — ставіў шмат твораў рускай класікі, быў па сваёй сутнасці рускім дзякуючы як драматургіі, так і мове, на якой працаваў. Праўда, бывалі і бываюць выключэнні: на сцэну Рускага драматычнага тэатра стала прыходзіць беларуская драматургія — нездарма ж у 1999 годзе яму прысвоена званне «нацыянальны». Сёння ў рэпертуары 30 спектакляў паводле рускай, сусветнай, а таксама беларускай драматургіі (гэтую плынь пасля Барыса Луцэнкі падтрымлівае цяперашні мастацкі кіраўнік тэатра Сяргей Кавальчык).

Усе этапы развіцця тэатра можна будзе ўзгадаць у гэтыя дні, можна будзе звярнуцца да іх пасля таго, як прагучаць усе віншаванні ад калег і тэатразнаўцаў: Аляксея Дударава, Мікалая Пінігіна, Валянціна Елізар'ева, Аляксандра Гарцуева, Аляксея Ляляўскага, Таццяны Арловай, Рычарда Смольскага і іншых вядомых асоб, якія ствараюць беларускае тэатральнае мастацтва.

**Ларыса ЦІМОШЫК**

■ Імпрэза

## МЕЛОДЫІ ЗДЗЯЙСНЕННЯЎ

### А вы хацелі б запісаць жаданні на паперцы тым пяром, якім пісаў Якуб Колас?

**1 снежня праект «Музейныя лабірынты» запрашае ў Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа на святочную імпрэзу «У кожнай песні свае тоны...». Можна дадаць: у песнях кожнага пакалення ёсць асобныя тоны. Колас гэта разумеў — заўсёды з прыхільнасцю ставіўся да маладых талентаў. Таму дом народнага песняра з радасцю вітае маладых творцаў самых разнастайных плыняў і стыляў, якіх аб'ядноўвае любоў да Бацькаўшчыны, да традыцый нацыянальнай культуры.**

Свята пачнецца а 14-й гадзіне. Госці будуць мець магчымасць пабачыць старажытныя народныя танцы, паслухаць музыку, якая блізкая да фольк-року, ад гурта «Alta Mente». Можна наведаць выстаўку-кірмаш хэндмэйду ад лепшых сталічных майстрых, а таксама спасцігнуць сакрэты іх працы і нават паспрабаваць сёе-тое зрабіць уласнымі рукамі.

Але самае галоўнае, што можа чакаць чалавека, які прыйшоў у дом Коласа: тут можна запісаць жаданні на паперы тым самым пяром, якім пісаў калісьці народны паэт, седзячы за яго рабочым сталом. Паперкі захоўваюцца ў асобнай скрыні ў музеі, напітваюцца цудоўнай энергетыкай дома, а жаданні здзяйсняюцца. Шмат хто ўжо скарыстаў гэтую магчымасць і пераканаўся ў тым, што ў Коласавым доме цуды магчымыя.

**Ларыса ЦІМОШЫК**

# ПАД АДНЫМ НЕБАМ

**Восень — як палярная ноч: цёмна, калі прачынаешся, цёмна, калі выязджаеш на працу, цёмна, калі вяртаешся. Пробліск хіба адзін быў... У «асобе» ката — рыжага-рыжага. Ён — падобна, нічый — каля дома сядзеў, на лаўцы...**

**Пакуль забегла ў кватэру, пакуль сабрала, чым пакарміць, кот знік.**

**Можа, сышоў. А можа, нехта забраў? З сабой...**

**У якасці сонца.**

## ДЗЕДАВА НАВУКА

Колькі людзей — столькі меркаванняў. «Нанач есці можна... Усё», — кажуць адны, «Нанач есці нельга. Нічога!», — не згаджаюцца з імі другія, «Не, — сцвярджаюць трэція, — есці ўсё-такі можна, але толькі тое, што змяшчае сератанін — гармоны радасці: гэта значыць — бананы, шакалад...».

Днямі (дакладней, апоўначы) у сяброў машына зламалася. Пакуль глядзелі, у чым там справа, пакуль «адганялі» ў бяспечнае месца, ледзь паспелі ў метро (на апошнюю электрычку) — заехалі ў свой мікрараён. А там яшчэ прайшлі кіламетры са тры ад станцыі да дома. Ды па холадзе, слоце...

Знерваваліся, стаміліся, вымаклі... Каб не захварэць, як дзядуля вучыў, па чарцы выпілі. Закусілі салам з квашанай капустай.

І міжволі неяк выснову зрабілі, што найбольшую колькасць гармонаў радасці змяшчаюць зусім не шакалад і не бананы, а сала з капустай.

Ну і, магчыма, гарэлка.

## ТОСТ

Дома дзядзька Фролавіч не без спраў: зранку трэба «прыбраць сваю планету», прыгатаваць сняданак, падумаць пра абед, схадзіць у краму, па дарозе (туды ці адтуль) некага, магчыма, сустрэць, перакінуцца слоўцам, а то і пагаманіць (часам нават за чаркай)... Хоць нябожчыца-жонка гэтага і не ўхваляла...

У Амерыцы, куды дзядзька з'язджае на ўсю доўгую зімку, клопатаў ён не мае — ніякіх, нават у краму не ходзіць (хіба ў выхадны, разам з дачкой). І знаёмых у яго няма...

Дакладней — не было. І, пэўна, не было **б**... Калі б...

Ставок ён выпадкова знайшоў. Убачыў двух дзядоў-рыбакоў — на тым беразе. Назаўтра раніцай, з вудай, усеўся на сваім... Лавілася нешта... Але ж найбольш — думалася. Пра тое, што на радзіме бралася б часцей... І большая. Што там са смакам бы елася (тут дачка ўсё носам круціць)... Што рыбакі з таго берага даўно б падышлі (альбо ён да іх), што...

Аднойчы пакуль так думаў, нырнуў паплавок... Фролавіч, як звычайна, падсек...І ўслед той вялікай рыбіне, што сарвалася, загнуў такога мацюка... На тым беразе пачулі!

І адразу ж «прыбеглі»... І спыталі (па-руску!) адкуль ён. І сказалі, што самі — з Кастрамы!...

Потым разам паслалі маладзейшага, узялі па чарцы...

Яшчэ і за... рыбіну, што сарвалася з кручка, але ж справу зрабіла: іх пазнаёміла.

## ТОЕ, ШТО ТРЭБА?

Гэта відавочна: у новай кватэры маленькі пакой, ну вядома ж, будзе для маленькага, трохі большы — спальня для ягоных бацькоў, вялікі — зала — для ўсіх. Карацей, трохпакаёўка на траіх — гэта цуд, гэта тое, што трэба!

Але ж... было, бо «маленькаму» неўзабаве 18, цэлы сажань у плячах, пад два метры росту! А ў пакойчыку ў яго — канапа, стол для камп'ютара, тры гітары, кніжныя паліцы... Цесна.

І самае крыўднае, што ў межах кватэры ні з кім не памяняешся.

## МЕЎСЯ КОНЬ, ДЫ З'ЕЗДЗІЎСЯ...

Карпарацыя — паводле слоўніка — група асоб, аб'яднаных прафесіянальнымі, саслоўнымі ці іншымі інтарэсамі. Старое слова.

Карпаратыў — параўнальна новае, але на слыху, асабліва ў навагоддзе, бо пад іх, пад гэтыя карпаратывы, спехам шукаюцца яшчэ незанятыя залы ў кавярнях, рэстаранах ці аграсядзібах, купляюцца сукенкі, запрашаюцца госці, пішуцца сцэнары, дзе можа быць усё, што толькі заўгодна... Не тое, што раней: урачыстая частка з дакладам, канцэрт мастацкай самадзейнасці ды танцы з буфетам...

На вось гэту, завяршальную частку свята, жонка тады не засталася. І мужу не раіла. Прасіла: «Пойдзем дадому — там дзеці... Не маленькія, але ж адны». Ён спярша як быццам згаджаўся, нават скіраваў у бок гардэроба, ды зайграла музыка... І назад як чэрці панеслі!

Дадому — нейкі чужы, незразумелы — прыйшоў пад раніцу. Каб праз месяц, забраўшы рэчы, сысці зусім — да іншай жанчыны, з якой злюбіўся тады, на танцах.

У яе, у той маладзіцы, было сваё жытло і двое малых ад першага шлюбу.

Ён усынавіў іх, выгадаваў і вывучыў. Абодвум справіў вяселлі. Адзінае, плацячы аліменты, не наскладваў грошай — не купіў ім асобных кватэр, і таму тры сям'і «збіліся» ў адной, юрыдычна — матчынай.

Каб хоць крыху ў ёй прастарней было, бацька пераехаў у вёску. Лічылася, што часова, на лета, і што туды ж, следам за ім, пераедзе жонка...

Але не...

Адзін... Нават не звоніць ніхто: не патрэбен больш прыёмным дзецям.

Родным — не патрэбен даўно.

## ЯК НА ДЗІКІМ ЗАХАДЗЕ

«Четыре маленьких чумазеньких чертёнка чертили чёрными чернилами чертеж...»

Гэта — са старой дзіцячай песенькі.

А вось гэта ўжо з жыцця: «Дом. У чацвёртым пад'ездзе, на чацвёртым паверсе чатыры кватэры, у якіх на працягу чатырох гадоў жывуць... чатыры чалавекі: па два, калі дакладней, у дзвюх... Яшчэ дзве стаяць пустымі.

Што, вядома ж, не можа не абураць, бо ў сталіцы, у час такога дэфіцыту.... І ў той жа час не можа не... радаваць. Бо нехта ж змог, узбіўся на грошы, пабудаваў і мае — ва ўласнасці... З усімі адсюль наступствамі: гэта значыць, не хоча і не жыве, не здае кватарантам, не прадае, не мяняе.

Бо мае права.

## БЫЛА Б ШЫЯ...

Малады, адукаваны, з досведам работы і без шкодных звычак, працу Стас знайшоў. І нават аб'ёмаў яе не спужаўся, бо плацілі добра, абяцалі — яшчэ лепш... Але — праз паўгода, калі ён наладзіць вытворчасць, арганізуе продаж...

Грошы былі патрэбны... Дняваў і начаваў на працы... Але свайго дамогся: лічы, наладзіў... Значна раней!

Чакаў адмысловага візіту начальства, чакаў пахвалы.

Чаго дачакаўся?

Таго, што дырэктар (і ён жа ўласнік фірмы), выклікаў, таго, што агаломшыў кароткім, як стрэл:

— Вы не апраўдалі нашых надзей... І будзеце звольнены...

Стас з такой неспадзеўкі кіўнуў і выйшаў з кабінета.

«Правы качаць» не пайшоў. Як водзіцца, для пачатку напіўся. І толькі потым даведаўся, што на той фірме ім проста скарысталіся: яго рукамі расчысцілі месца — для свайго чалавека.

А ён быў чужым...

І таму цяпер зноўку шукае працу.

## ПРЫ ЎСІМ БАГАЦЦІ ВЫБАРУ...

«Каб любіць Беларусь нашу мілую, трэба ў розных краях пабываць...».

Каб уявіць багацце мовы, варта разгарнуць слоўнік. У тым ліку — сінонімаў і блізказначных слоў... На любой старонцы. **Дагаджаць**, напрыклад, тое, што і *наравіць, падладжвацца, падлашчвацца, выслужвацца, падлагоджвацца, выдыгаць, падлабуньвацца, падлізвацца, выстачаць, пад'язджаць, танцаваць, насіць на руках, гладзіць па поўсці, хадзіць на пальчыках, рассыпацца макам, слацца лістам...* **Плакаць** — тое, што і *рыдаць, прычытаць, галасіць, румзаць, хліпаць, крычаць, раўці, выць, заходзіцца плачам, ліць слёзы, залівацца слязамі, душыцца ад слёз, разводзіць сырасць...*

***А запомніць*** *— значыць не забыць.*

Так, прынамсі, было... У той час, калі стваралася слоўнік... Цяпер жа (мае рацыю гумарыст Жванецкі) трэба яшчэ падумаць, у якім выпадку сказаць: «Я цябе не забуду», а ў якім — «Я цябе запомню».

## НЕ ПАКІДАЙ!

З кім павядзешся... На працы адна з маладзіц расказвала, як сынок яе (12 гадоў) на спаборніцтвы з'ездзіў.

Не, першынство не заваяваў, але ж яна ўсё адно пахвалілася. Тым, у прыватнасці, што пасялілі хлапцоў у студэнцкім інтэрнаце, выдалі пасцельную бялізну, і ніхто з сябрукоў не ведаў, як падкоўдранік надзець, толькі сын: бо змалку прывучаны, бо «трэба»...

Гэта, апошняе слова, сяброўка прынесла дамоў. Загадала сыну бульбу абабраць, прасачыла, каб потым посуд памыў. І ў ванны пакой за сабой павяла: паказала, у якім парашку і што яна зранку замачыла, сказала, чым і якія месцы на джынсах трэба цяпер пацерці...

Змоўкла, адчуўшы нешта не тое:

— Мама, — вочы падлетка былі поўнымі слёз. — Ты куды гэта сабралася?

## ПАД АДНЫМ НЕБАМ

Як там у класіка: «Не сядзіцца ў хаце хлопчыку малому...»

І большых не ўтрымаць — ходу з вялікага шумнага горада пры любой магчымасці! Каб убачыць вясковых сваякоў, каб пагладзіць знаёмага сабаку, каб паслухаць цішыню і проста падыхаць — свежым паветрам...

Але ж перш...

Нейкі затор напарадзе: машыны (ва ўсіх чатырох радах) падтарможваюць, спыняюцца, хвілінудругую стаяць, кранаюцца з месца, метры два-тры едуць і зноўку стаяць. У некага ўжо кіпіць рухавік, у многіх паляцца нервы...

Каб таго ж сабе не дазволіць (залатое правіла: калі нічога не можаш змяніць, пастарайся хоць не нервавацца), уключаем музыку, гамонім, глядзім па баках — на чужыя машыны, на дамы абапал вуліцы, на вокны-балконы.

На адзін з іх маладзіца выходзіць... Нездаровая, відаць, бо захутаная з ног да галавы.

Але ж, бач, і ёй не сядзіцца... Яна таксама мкнецца на вуліцу, каб падыхаць «свежым» паветрам.

**Валянціна ДОЎНАР**

■

## Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** Напружаная праца на пачатку тыдня можа аслабіць вашы сілы, затое фінансавыя перспектывы стануць значна больш вызначанымі і прыемнымі, што акупіць усе нязручнасці. Утоеныя праблемы стануць відавочнымі для навакольных, але вы паспееце прыняць своечасовыя меры па іх вырашэнні. Субота — удалы дзень, каб паспець тое, што вы даўно сабе абяцалі зрабіць, але раней не маглі дазволіць.

**ЦЯЛЕЦ.** Паспрабуйце суцішыць запыты і амбіцыі і прыслухайцеся да мудрых парад навакольных. Вы зможаце пераадолець цяжкасці і дамагчыся выдатных вынікаў толькі ў тым выпадку, калі не станеце патрабаваць ад жыцця ўсё і адразу. Вельмі спатрэбіцца цярпенне.

**БЛІЗНЯТЫ.** На пачатку тыдня вы можаце пераацаніць свае магчымасці, таму лепш пазбягаць удзелу ў сур'ёзных мерапрыемствах. Парушэнне планаў і цяжкасці могуць быць звязаны з тымі людзьмі, з якімі давядзецца мець зносіны па-за ўласным жаданнем. Неабходна праяўляць ініцыятыву і набываць новы досвед.

**РАК.** Ваша энергія і напор акажуць вялікі ўплыў на ўсіх навакольных. Жаданне вылучыцца з агульнага натоўпу можа прывесці да даўняй мэты. Калі ліміт на адпачынкі, адгулы і паездкі вычарпаны, паклапаціцеся пра тое, каб прапановы аб працы пасыпаліся як з рога дастатку. Пакідаць старое, звыклае месца пры гэтым не варта, але вось данесці да начальніка думку пра тое, які вы таленавіты і запатрабаваны, будзе дарэчы.

**ЛЕЎ.** Не варта рэагаваць на патрабаванні начальства занадта эмацыянальна, беражыце свае нервы. Знойдзеце дыпламатычны спосаб пазбегнуць непрыемнай гутаркі і, напэўна, здолееце дамагчыся патрэбнага рашэння. Напружаная праца прынясе хуткі поспех. Можаце разлічваць, што атрымаецца многае. Нават калі сілы будуць на зыходзе, то можа адкрыцца другое дыханне.

**ДЗЕВА.** Жыццё будзе віраваць, хоць планы давядзецца ў кожным разе перагледзець. Сабраўшыся з сіламі, удасца рэалізаваць асабістыя праекты. Давядзецца змагацца нават з самым нязначным праяўленнем няўпэўненасці ва ўласных сілах. Паспрабуйце знайсці падтрымку ўсюды, дзе толькі можна. Лепш скарыстацца дапамогай старонніх, чым адмовіцца ад дзеянняў зусім.

**ШАЛІ.** Вышэйшыя сілы будуць падтрымліваць вас — памятаеце пра гэта і давярайце інтуіцыі. Будзе вялікая спакуса разыграць сяброў, але праявіце асцярожнасць у сваіх дзеяннях і асабліва ў жартах, бо вас могуць няправільна зразумець. Не ўвільвайце ад прамога адказу. Гаварыце толькі тое, што сапраўды думаеце, у чым упэўнены.

**СКАРПІЁН.** Здольнасць пускацца ў філасофскія разважанні і рабіць у выніку рэалістычныя высновы дазволяць выбраць правільны кірунак і сабрацца з сіламі для чарговага рыўка. Варта звярнуць увагу на парады, якімі будуць шчодра дзяліцца навакольныя. Сярод гэтага россыпу слоў зможаце знайсці ў літаральным сэнсе «залатую ідэю».

**СТРАЛЕЦ.** З'явіцца магчымасць выправіць некаторыя памылкі. Паспрабуйце ёю скарыстацца. Поспех на працы будзе шмат у чым залежаць ад намаганняў, якія вы прыкладаеце, і акуратнасці ў падборы слоў пры зносінах з калегамі і кіраўніцтвам. Важна захоўваць раўнавагу і кантраляваць уласныя эмоцыі.

**КАЗЯРОГ.** Няўрымслівая энергія будзе дзівіць навакольных. Інтуіцыя павінна падказаць, дзе схаваны ключ ад практычна невырашальнай праблемы. Не вельмі расслабляйцеся, лёс яшчэ знойдзе спосаб вас здзівіць.

**ВАДАЛЕЙ.** Будзе нялішнім падагульніць тое, што пражыта, і адкрыць для сябе новую старонку, запаўненне якой варта пачаць з засваення атрыманага досведу. Багацце інфармацыі складзецца ў новую фармулёўку, пры дапамозе якой можна адказаць на шматлікія жыццёва важныя пытанні.

**РЫБЫ.** Зможаце арганізаваць навакольных на перспектыўную агульную справу, аднак без вашага асабістага ўдзелу ўсё рассыплецца, так што застацца «за кулісамі» не атрымаецца. Ва ўсім шукайце нагоду для радасці, не дапускайце негатыўных эмоцый і дрэнных думак. Будзьце асцярожнымі ў выказваннях: вы можаце незнарок пазбавіць спакою і сну кагосьці з блізкіх .

**Публичная оферта (предложение)**
**о начислении поощрительного дополнительного процентного дохода по срочным банковским вкладам в белорусских рублях и изменении размера дохода по срочному банковскому вкладу в белорусских рублях «Юбилейный-90»**

1. ОАО «АСБ Беларусбанк» устанавливает с 1 декабря 2012 года поощрительный дополнительный процентный доход по следующим срочным банковским вкладам (депозитам) в белорусских рублях:
- **«Классик плюс», «Сберегательный», «Ваш выбор»** (вне зависимости от ежедневного остатка вклада) — в размере **9% годовых**;
- **Накопительный, Премиально-накопительный «Детский», «Новый 2010»** — в размере **7% годовых**.

Начисление поощрительного дополнительного процентного дохода производится на ежедневные фактические остатки указанных видов вкладов за период с 01.12.2012 или дня открытия вклада (депозита) после указанной даты по 31.12.2012 (включительно), исходя из количества дней, установленных условиями конкретного вида вклада, для начисления процентного дохода.

Присоединение к остатку вклада поощрительного дополнительного процентного дохода производится в первый рабочий день января 2013 года. При этом поощрительный дополнительный процентный доход не выплачивается:
- при возврате вкладчику суммы вклада в связи с наступлением срока возврата и совершении любой другой расходной операции в период с 01.12.2012 по 31.12.2012 (включительно);
- в случае если на 01.12.2012 по вкладу начисляется пониженная процентная ставка (в том числе по вкладам, срок возврата которых наступил до 01.12.2012).

Начисление дохода на сумму поощрительного дополнительного процентного дохода производится с 01.01.2013.

2. По вкладу **«Юбилейный-90»** с 1 декабря 2012 года устанавливается доход в размере **37% годовых**.

3. Акцептом публичной оферты (предложения), указанной в пункте 1, является получение вкладчиком поощрительного дополнительного дохода.

4. Акцептом публичной оферты (предложения), указанной в пункте 2, является получение вкладчиком дохода по вкладу по установленной процентной ставке.

**Более подробную информацию можно получить в отделениях банка, в Контакт-центре по телефону 147 и на сайте www.belarusbank.by**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 28.08.2008 г., выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

**Уважаемые акционеры**
**ОАО «Промэлектромонтаж»**
**27 декабря 2012 г.**
**СОСТОИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ.**

**Повестка дня:**
1. Увеличение номинальной стоимости акции ОАО «Промэлектромонтаж» за счет собственных средств Общества.
2. Утверждение нового размера уставного фонда Общества.
3. Внесение изменений в Устав Общества.

Местонахождение ОАО «Промэлектромонтаж»: **г. Минск, ул. Аранская, 13.**

Место проведения собрания: **г. Минск, ул. Аранская, 13, к. 9 (второй этаж).**

Начало собрания: **09 часов 30 минут.**

Время регистрации участников — в день проведения собрания с 09 часов 00 минут до 09 часов 30 минут по адресу: **г. Минск, ул. Аранская, 13, к. 9 (второй этаж).**

**Регистрация акционеров проводится по паспорту, а представителей акционеров — по паспорту и доверенности.**

Список акционеров для регистрации участников собрания составлен по данным реестра акционеров **на 30 ноября 2012 г.**

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни **с 01.12.2012 г. по 26.12.2012 г. (с 9.00 до 17.00)** по месту нахождения Общества, а в день проведения собрания — по месту проведения собрания.

УНП 100088916 *Наблюдательный совет ОАО «Промэлектромонтаж»*

**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона)**
**по поручению ОАО «СтанкоГомель» (продавец)**

**извещает о проведении 19 декабря 2012 года открытого повторного аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, кабинет 2-16**

| № лота | Наименование | Адрес объекта | Начальная цена продажи объекта, с учетом НДС, бел. руб. | Начальная цена продажи имущества одним лотом | Задаток, с учетом НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Вертикально-фрезерный станок модели 6Т13Ф20-1 с ЧПУ инв. № 9870, 1990 г.в. | г. Гомель, ул. Интернациональная, 10 | **42 000 000** | **42 000 000** | **8 000 000** |

**Продавец:** Открытое акционерное общество «СтанкоГомель», 246050, г. Гомель, ул. Интернациональная, 10.

**Шаг аукциона – 5% от начальной цены лота.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

1. Оплатить задаток на расчетный счет Продавца (Открытое акционерное общество «СтанкоГомель») р/с 3012111882016 в Региональной дирекции № 300 ОАО «БПС-Сбербанк», код 153001369, УНП 400085002 **по 17 декабря 2012 года** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: ул. Гагарина, 20, каб. 2-16, г. Гомель **по 17 декабря 2012 года** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 от даты опубликования настоящего извещения.

Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, объекты аукциона (имущество продается одним лотом) продаются этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%.

Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается продавцом в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в срок не позднее 20 календарных дней от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество в сроки, определенные в договоре купли-продажи, и возместить затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы по изготовлению и предоставлению участникам аукциона документации, необходимой для его проведения в течение 3 банковских дней с момента подписания протокола. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников до начала аукциона. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с действующим гражданским законодательством Республики Беларусь, в т.ч. Положением ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 21.06.2012 г.

**Дополнительная информация по телефонам организатора аукциона: 8 (0232) 74 17 34, 74 89 64 и на сайте gomeloblreklama.by.**

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

**на «Комплекс многоквартирных жилых домов со встроенными помещениями общественного назначения по ул. Курганная в г. Минске»**

Информация о застройщике:

Застройщик: Иностранное частное торгово-строительное унитарное предприятие «ГЕРБЕЛИНВЕСТ», зарегистрировано Минским горисполкомом решением от «26» сентября 2008 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191068402.

Адрес: 220004, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Димитрова, 5, пом. 1.

Режим работы: пн.–пт. с 9.00 до 18.00, перерыв с 13.00 до 14.00.

Телефон: (017) 203 32 78, (017) 203 38 49, Факс: (017) 306 24 52.

До настоящего проекта организация не осуществляла функции застройщика жилых домов и иных объектов недвижимости.

Информация о проекте строительства: Застройка шести домов 3-ей и 4-ой очереди.

Цель проекта строительства — строительство шести 9-этажных многоквартирных жилых домов №№ 03/1, 03/2, 03/3, 03/4, 04/1, 04/2 по генплану:

- 3-я и 4-я очередь строительства – блок-секции серии М464-У1 ОАО «МАПИД»;

Здание каждого многоквартирного жилого дома запроектировано из 1-й секции. Общая площадь жилых зданий №№ 03/1, 03/3, 04/1 по генплану 2 645,01 м², из них жилых помещений (квартир) — 2 267.53 м². Количество жилых помещений (квартир) — 52, из них: однокомнатных — 42, двухкомнатных — 10.

Общая площадь жилых зданий №№ 03/2, 03/4, 04/2 по генплану 2 651,31 м², из них жилых помещений (квартир) — 2 309,25 м². Количество жилых помещений (квартир) в каждом доме — 53, из них в: однокомнатных — 43, двухкомнатных — 10.

Каждая секция оборудована мусоропроводом, одним грузопассажирскими лифтом. Во всех квартирах предусмотрены летние помещения (остекленные лоджии). Конструкция здания — сборные железобетонные конструкции с эффективным минераловатным утеплителем. Высота этажа – 2,7 м.

Объект долевого строительства расположен в г. Минске в границах ул. Курганная – ул. Космонавтов, с севера – вдоль лесопарковой зоны по проектируемой улице № 1, с запада и юга существующей усадебной застройкой по ул. Курганной, с востока существующей жилой застройкой по ул. Космонавтов.

Начало строительства 3-ей очереди — май 2012 г. Начало строительства 4-ой очереди — ноябрь 2012 г.

Ориентировочные сроки окончания строительства жилых домов 3-ей очереди — июнь 2013 г. Ориентировочные сроки окончания строительства жилых домов 4-ой очереди — сентябрь 2013 г.

Застройщиком получены:

- экспертное заключение Государственного комитета по стандартизации Республики Беларусь (РУП «Главгосстройэкспертиза») от 20.04.2012 г. № 279-15/12; от 04.07.2012 г. № 564-15/12;

- экспертное заключение Государственного комитета по стандартизации Республики Беларусь (РУП «Главгосстройэкспертиза») от 17.10.2012 г. № 939/15/12;

- решение Минского городского исполнительного комитета от 08.10.2010 г. № 2320 «Об изъятии, предоставлении земельных участков и разрешения строительства»;

- решение Минского городского исполнительного комитета от 10.05.2012 г. № 1457 «О продлении (прекращении) срочных прав на земельные участки, предоставлении земельных участков в целях продления срочных прав на них и внесении изменения в решение Мингорисполкома».

- решение о разрешении проведения проектно-изыскательских работ, строительства и реконструкции объектов, внесения изменений в проектно-сметную документацию и завершения строительства объектов по проекту с изменениями, внесения изменений в решения Мингорисполкома № 1041 от 29.03.2012 г., от 09.08.2012 г. № 2565;

- разрешение специализированной Инспекции департамента контроля и надзора за строительством по г.Минску на производство строительно-монтажных работ № 2-203Ж-067/10 от 11.10.2010, 05.11.2010, 28.12.2010, 27.01.2011; 10.08.2012 г.

- разрешение специализированной Инспекции департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску на производство строительно-монтажных работ № 2-203Ж-044/12 от 21.11.2012 г.

Застройщику на праве временного пользования на период строительства выделены земельные участки площадью 3,2181 га (свидетельство о государственной регистрации № 500/986-3352) и 0,0051 га (свидетельство о государственной регистрации № 500/986-3351).

Генеральный подрядчик ООО «СУ-75».

Заключение договоров создания объектов долевого строительства будет проводиться поэтапно.

Для физических лиц, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц и индивидуальных предпринимателей предлагаются к заключению по договорам создания объектов долевого строительства 80 (восемьдесят) квартир (однокомнатные, двухкомнатные, общей площадью от 37.49 м² до 67,57 м²).

Стоимость одного метра квадратного жилых помещений эквивалентна 1200 (одна тысяча двести) долларов США по курсу Национального банка Республики Беларусь. Стоимость неизменна до окончания строительства. Указанная в настоящей проектной декларации цена за 1 м² общей площади по проекту соответствующих квартир и их количество считается действительным до момента опубликования новой декларации.

Уплата цены договора производится дольщиком единовременно либо поэтапно в установленный договором период по графику платежей, который является неотъемлемой частью договора (п.9 Правил заключения, исполнения и расторжения договора создания долевого строительства, утвержденных Указом Президента Республики Беларусь от 15.07.2006 г. № 396).

Работы по внутренней отделке жилых помещений, выполняемые Застройщиком:

- бетонная подготовка под укладку полов, гидроизоляция полов в санузлах без окраски стен и потолков;

- электроснабжение – поквартирная разводка электропроводки с установкой розеток, электросчетчиков и выводом на кухне для подключения электроплиты;

- вентиляция – естественная;

- горячее и холодное водоснабжение – стояки с приборами учета, установка и подключение унитаза, выводы для кухни и ванны;

- канализация – стояки с поквартирной разводкой трубопроводов к точкам подключения;

- отопление – водяное;

- телефонизация, радиофикация, телевидение – поквартирная разводка.

Внутренняя отделка мест общего пользования: общие коридоры, лифтовые, лестничные пролеты, входные группы, технические помещения.

Иные работы по внутренней отделке Застройщиком не выполняются, в том числе не устанавливаются внутренние дверные блоки, а так же не производится чистовая отделка помещений.

Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет в общей долевой собственности дольщиков после ввода объекта в эксплуатацию: межквартирные лестничные клетки, лестницы, лифты, лифтовые, вентиляционные и иные шахты, коридоры, крыши, технические этажи и подвалы, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами жилых и (или) нежилых помещений, но обеспечивающее их жизнедеятельность, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания. Данное имущество поступает в общую собственность дольщиков, если финансирование этих объектов производилось дольщиками, и передаются Застройщиком по акту приемки передачи представителю товарищества собственников, если на момент ввода дома в эксплуатацию это товарищество создано. В случае если такое товарищество не создано, лицу, определяемому общим собранием Дольщиков, либо уполномоченному местным исполнительным и распорядительным органом.

После выполнения строительно-монтажных работ на прилегающей территории жилого дома будет выполнено благоустройство и озеленение согласно утвержденного генерального плана.

Срок действия настоящей проектной декларации — до момента опубликования новой проектной декларации, которая отменяет действие опубликованных ранее.

**Информацию по объекту долевого строительства и условиям заключения договоров можно получить в уполномоченной риэлторской организации ООО «РиэлтХаус», лиц. № 02240/225, 18.05.2011-16 Минюст Республики Беларусь, риэлт. услуги. УНП 191441618 по адресу: г. Минск, ул. Димитрова, д. 5, каб. 2, тел.: (017) 306-08-20, (029) 504-08-20.**

**ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА, НАХОДЯЩЕГОСЯ В ГОСУДАРСТВЕННОЙ СОБСТВЕННОСТИ, РАСПОЛОЖЕННОГО В БРЕСТСКОЙ ОБЛАСТИ**

| | |
|---|---|
| **Наименование предмета аукциона** | **Участки межплощадочного блокировочного трубопровода в Брестском, Каменецком, Жабинковском районах Брестской области** |
| | один лот |
| **Местонахождение недвижимого имущества** | **Жабинковский район, направление Пелище-Подлесье, межплощадочный блокировочный трубопровод**<br>Хмелевский сельсовет:<br>0,7 км сев.-западнее д. Подлесье (участок № 1),<br>0,8 км сев.-западнее д. Подлесье (участок № 2),<br>1,0 км севернее д. Подлесье (участок № 3),<br>1,1 км севернее д. Подлесье (участок № 4)<br>**Каменецкий район,** Пелищенский с/с, в 0,4 км севернее д. Стрели<br>**Жабинковский район, Каменецкий район, Брестский район, направление Орепичи-Лыщицы, межплощадочный блокировочный трубопровод**<br>**Каменецкий район:** Пелищенский с/с, в 0,4 км севернее д. Стрели<br>Видомлянский с/с: в 1,1 км сев.-восточнее д.Турна Большая,<br>в 1,3 км северо-восточнее д.Турна Большая,<br>в 2,00 км сев.-восточнее д.Турна Большая<br>**Жабинковский район,** Хмелевский с/с:<br>1,1 км сев.-западнее д. Подлесье (участок № 1),<br>1,1 км севернее д. Подлесье (участок № 2)<br>**Каменецкий район, Брестский район, Жабинковский район, направление Жабинка-Орепичи, межплощадочный блокировочный трубопровод**<br>**Каменецкий район**:<br>Пелищенский с/с, в 0,4 км севернее д. Стрели<br>**Брестский район,** Чернавчицкий с/с, в 5,1км восточнее д. Ивахновичи<br>**Жабинковский район**, Хмелевский с/с:<br>0,3 км западнее д. Саки (участок № 3),<br>1,1км сев.-западнее д. Саки (участок № 2),<br>0,5 км западнее д. Рудка (участок № 1) |
| **Продавец недвижимого имущества** | Государственное учреждение «Барановичское эксплуатационное управление Вооруженных Сил»,<br>тел.: (0163) 41 28 05, 41 25 92, 41 26 78 |
| **Сведения о предмете аукциона** | Капитальное строение (межплощадочный блокировочный трубопровод) (трасса № 10/1 (пл.1/1 – 1/3), трасса 10/2(пл.1/1-1/3), трасса №10/3(пл.1/1-1/3) протяженность 10789,3 м (в Жабинковском районе – 2661,6 м).<br>Капитальное строение (межплощадочный блокировочный трубопровод) (трасса № 11/1 (пл.1/2-пл.2-л), протяженность 36240,1 м.<br>Капитальное строение (межплощадочный блокировочный трубопровод) (трасса № 8 (пл.3/ж-пл.1/2), протяженность 26070,3 м.<br>Земельные участки площадью соответственно 0,8570 га, 0,1942 га, 0,3094 га, 0,1195 га, 0,8838 га, 0,8785 га, 0,0404 га, 0,4565 га, 0,6503 га, 0,1033 га, 0,2775 га, 0,7978 га; 0,4461 га (использовать земельный участок для целей демонтажа межплощадочного блокировочного трубопровода не нарушая градостроительных регламентов, природоохранных требований, противопожарных, санитарных, строительных и иных норм и правил), 0,2112 га, 0,1580 га , 0,2343 га; срок аренды – 10 лет |
| **Условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка** | • осуществить государственную регистрацию права на земельные участки в течение двух месяцев со дня подписания договора аренды земельных участков;<br>•• разработать в течение одного года проектно-сметную документацию на демонтаж межплощадочного блокировочного трубопровода и получить в установленном порядке разрешение на производство работ по демонтажу; выполнить работы по демонтажу межплощадочного блокировочного трубопровода в сроки, установленные проектно-сметной документацией; выполнить рекультивацию нарушенных в результате демонтажа земель и не позднее срока, на который предоставлен земельный участок, возвратить его государственному лесохозяйственном учреждению «Брестский лесхоз» в состоянии, пригодном для использования в лесном хозяйстве;<br>• разработать проектно-сметную документацию на демонтаж межплощадочного блокировочного трубопровода и получить в установленном порядке разрешение Жабинковского, Каменецкого районного исполнительного комитета на производство работ по демонтажу; выполнить работы по демонтажу межплощадочного блокировочного трубопровода в сроки, установленные проектно-сметной документацией; выполнить рекультивацию нарушенных в результате демонтажа земель и не позднее срока, на который предоставлены земельные участки, возвратить их Государственному лесохозяйственном учреждению «Брестский лесхоз» в состоянии, пригодном для лесохозяйственного использования |
| **Начальная цена предмета аукциона, руб.** | 10 178 086 948 |
| **Задаток для участия в аукционе, руб.** | 2 000 000 000 |
| **Реквизиты счета для перечисления задатка** | ***р/с 3642941148018, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Брестской области (код 739), получатель платежа – фонд «Брестоблимущество», УНН 200020538, срок внесения суммы задатка – до подачи заявления на участие в аукционе*** |
| **Организатор аукциона** | **Фонд «Брестоблимущество», г. Брест, ул. Ленина, 11,**<br>**тел.: (0162) 21 19 82, 23 44 06, 23 44 78, 23 12 63, 20 87 85, www.brest-region.by, www.gki.gov.by** |

*Условие по земельному участку площадью 0,4461 га, расположенному по адресу: Брестская область, Брестский район, Чернавчицкий с/с, в 5,1км восточнее д. Ивахновичи.

Аукцион проводится **21 декабря 2012 года** в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан: подписать протокол в день аукциона; в течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола возместить затраты на организацию и проведение аукциона, включая расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения, формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этих участков, и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлеж




Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.

**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** Кегельбан. Трэст. Ату. Латка. Рым. Пласт. «Атос». Аванс. Рувім. Мінск. Пат. Краска. Гта. Ра-жон. Кардата. Вета. Чын. Арас. Самара. Кар. Удда. Мыс. Кавс. Арала. Ага. Салата. Атам. Тура. Юнак. Радзіны.

**Па вертыкалі:** Вальфрам. Ратамка. Манеж. Вакса. Опера. Кон. Тэрмас. Гра. Бас. Сан. Салата. Тунава. Ла-тук. Агат. Эмарад. Брэст. Амар. Каска. Сад. Нітрат. Дача. Арал. Мак. Сустрэча. «Ака». Тыпса. Вена. Лана. Сліны.

## Даты. Падзеі. Людзі

**1856** год — у будынку бібліятэкі Віленскага ўніверсітэта адкрыўся музей старажытнасцяў, заснаваны ў 1855 годзе беларускім археолагам і гісторыкам Яўстафіем Тышкевічам. Уласныя калекцыі перадалі музею Канстанцін Тышкевіч, адзін з заснавальнікаў беларускай навуковай археалогіі, паэт Уладзіслаў Сыракомля, член-карэспандэнт Імператарскага археалагічнага таварыства Адам Кіркор, беларускі гісторык і археолаг Тэадор Нарбут, паэт і празаік Францішак Багушэвіч. У музеі былі створаны аддзелы археалогіі, этнаграфіі, мастацтва, мінералогіі, арніталогіі і зброевы. У канцы XIX стагоддзя ў яго фондах налічвалася больш за 12 тысяч экспанатаў, у тым ліку старажытныя рукапісы, рэдкія выданні XV-XVIII стагоддзяў, багатыя калекцыі зброі, слуцкіх паясоў, габеленаў, графікі, скульптуры, гербаў гарадоў, вырабаў з фарфору і бронзы, манет і партрэтаў вядомых прадстаўнікоў з роду Радзівілаў, Тышкевічаў, Сапегаў і іншых. Музей існаваў да Першай сусветнай вайны. Большасць экспанатаў зараз захоўваецца ў гісторыка-этнаграфічным музеі Акадэміі навук Літвы, Дзяржаўным гістарычным музеі ў Маскве і Народным музеі ў Варшаве.

**1922** год — нарадзіўся легендарны савецкі футбаліст і хакеіст Усевалад Баброў. Нарадзіўся, як кажуць, «у кашулі»: у 1950 годзе Баброў «загуляў» і не патрапіў на самалёт, у якім разбілася ўся хакейная каманда ВПС. Ён сябраваў з сынам «бацькі народаў» Васілём Сталіным, быў у добрых адносінах з ваенным міністрам Булганіным, з кіраўніком урада Касыгіным. Ведаў сабе цану, не выносіў фамільярнасці і неяк з'ездзіў па фізіяноміі дэпутату Вярхоўнага Савета СССР, які асмеліўся назваць яго мянушкай Бабёр. Шэсць гадоў (з 1947-га па 1953 год) Баброў сумяшчаў свае выступленні ў футболе з хакеем. Ён быў адзіным у гісторыі спорту ўдзельнікам Алімпійскіх гульняў у якасці і капітана футбольнай (у 1952-м) і капітана хакейнай (ў 1956 годзе) каманд. Але шматлікія траўмы прымусілі яго зрабіць канчатковы выбар на карысць хакея з шайбай. Параўноўваючы гэтыя два віды спорту, ён казаў: «У хакеі трэба больш бегаць, а ў футболе трэба шмат думаць».

**1946** год — нарадзілася (вёска Сокалы Лагойскага раёна) Надзея Мікалаеўна Беляковіч, беларускі сацыёлаг, філосаф і палітолаг, доктар сацыялагічных навук, кандыдат філасофскіх навук, прафесар. Аўтар навуковых прац па праблемах палітычнай і сацыяльна-класавай трансфармацыі сучасных грамадстваў, сацыяльных адносін, правоў і свабод чалавека.

**Было сказана**

**Васіль Быкаў (1924—2003), народны пісьменнік Беларусі, грамадскі дзеяч:**

***«Напэўна, самае дзейснае, самае практычнае — прымусіць чалавека заглянуць у сябе, прымусіць яго ўбачыць, які ён ёсць, што ў ім ёсць подлае, а што добрае. Калі ён разбярэцца ў сабе з дапамогай мастацтва, то і будзе вынік».***

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

## ПЕРШАЯ ЁЛКА — ДА ПЕРШАГА СНЕЖНЯ

**Дзе ў Мінску паставілі сёлета першую навагоднюю ёлку? Зразумела, у цэнтральным дзіцячым парку насупраць галоўнай сцэны. Фотаапарат убачыў той момант, калі супрацоўнікі парку вешалі гірлянды, і зняў аднаго з тых, хто выконваў гэтую прыемную справу — Валерыя Шайтуру.**

### НЕСПРЫЯЛЬНЫЯ ДНІ І ГАДЗІНЫ Ў СНЕЖНІ

2, нядзеля, **8.00 — 24.00**
3, панядзелак, **0.00 — 3.30**
5, серада, **2.00 — 13.00**
7, пятніца, **11.30 — 19.30**
9, нядзеля, **1.30 — 23.00**
11, аўторак, **14.00 — 23.30**
13, чацвер, **10.00 — 22.30**
15, субота, **22.00 — 23.00**
16, нядзеля, **13.30 — 24.00**
17, панядзелак, **19.00 — 24.00**
18, аўторак, **0.00 — 2.00**
20, чацвер, **6.30 — 9.00**
22, субота, **14.00 — 19.30**
25, аўторак, **7.00 — 9.00**
27, чацвер, **8.00 — 21.00**
28, пятніца, **15.30 — 24.00**
29, субота, **0.00 — 24.00**
30, нядзеля, **0.00 — 9.00**

## ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПАКАШТУЙЦЕ!

### Катлеты капусныя

**Спатрэбіцца:** *на 1 кг капусты — 1/2 шклянкі манных круп, 1/2 шклянкі малака, 3 яйкі, 1/2 шклянкі сухароў і 3 ст. лыжкі алею, соль.*

Капусту дробна нашаткаваць і скласці ў каструлю. Туды ж уліць гарачае малако і тушыць да гатоўнасці, прыкладна 30-40 хвілін. У гатовую капусту паступова ўсыпаць манныя крупы, бесперапынна памешваючы, каб не атрымліваліся камякі, і працягваць тушыць яшчэ 5 хвілін. Пасля гэтага каструлю зняць з агню, дадаць яечныя жаўткі, соль, добра вымешаць і астудзіць. З астуджанай масы прыгатаваць катлеты, намачыць іх у яечным бялку, абкачаць у сухарах і абсмажыць. Катлеты падаць да стала з малочным ці смятанным соусам.

### Пірог з морквай

**Спатрэбіцца:** *мука пшанічная — 200 г, яйка — 5 шт., алей — 2 ст. л., морква — 500 г, чабор (сушаны) — 1 ч. л., цыбуля рэпчатая — 2 шт., соль, перац, вяршкі (20—25% тлустасці) — 200 мл, сыр галандскі (ці любы іншы) — 120 г, семечкі сланечніку — 1 ст. л., масла сметанковае (змазаць форму).*

У місцы змяшаць 2 яйкі, соль, 2 ст. л. алею і 2 ст. л. халоднай вады. Дадаць муку і вымесіць цеста.

Цеста будзе ліпкае, але мукі больш дадаваць не трэба. Загарнуць цеста ў харчовую плёнку і прыбраць на 30 хвілін у халадзільнік.

Моркву нарэзаць кружочкамі і 5 хвілін адварваць у падсоленай вадзе. Адкінуць на друшляк, абліць халоднай вадой і даць ёй сцячы.

Цыбулю здрабніць. Змяшаць моркву, цыбулю, чабор, перац, пасаліць.

Духоўку нагрэць да 200 °С. Форму змазаць сметанковым маслам ці маргарынам. Выкласці цеста ў форму, рукі намазаць алеем ці намачыць вадой, цеста размеркаваць рукамі па форме, зрабіўшы высокі борцік. Корж накалоць відэльцам. Выкласці на цеста гародніну.

З яйкі ўзбіць з надзёртым сырам, соллю і вяршкамі. Заліць гародніну атрыманай сумессю. Верх пасыпаць семкамі.

Выпякаць у духоўцы 40 хвілін. Падаваць пірог можна цёплым ці астуджаным да пакаёвай тэмпературы.

**-2896-**

ЗАКОНЫ СТЫЛЮ

### Чырвоны колер: насіць ці не насіць?



**Чырвоны колер падабаецца многім, але далёка не ўсе асмельваюцца яго насіць. Псіхолагі лічаць, што тыя людзі, якія часта носяць чырвонае, поўныя аптымізму і жыццёвай энергіі, заўсёды гатовы да гарачай спрэчкі, каб абараніць сваё меркаванне, і не заўсёды цярпліва ставяцца да людзей з іншым пунктам гледжання.**

Чырвоны — гэта стымулюючы і энергічны колер. Але калі глядзець на яго занадта доўга, то ён можа выклікаць не толькі раздражненне, але і агрэсію. Так што не варта выбіраць чырвоную сукенку, калі збіраецеся насіць яе на працу. Абмяжуйцеся толькі адным чырвоным прадметам гардэробу — спадніцай, блузкай ці пінжаком.

Калі вы збіраецеся выступаць перад вялікай аўдыторыяй, прыняць удзел у тэлепередачы ці даваць тэлеінтэрв'ю, то таксама не варта апранацца ў чырвонае: у гэтай сітуацыі такое адзенне не будзе выглядаць досыць эфектна. А вось калі трэба зрабіць чорна-белае фота на дакумент, то чырвоная блузка пасуе для гэтага ідэальна.

Чырвоны колер падыдзе ўсім жанчынам — важна толькі правільна падабраць яго адценне. Жанчынам розных тыпаў пасуюць розныя адценні чырвонага.

**Для жанчыны-«вясны»** лепш за ўсё выбіраць аранжава-чырвонае, жаўтавата-чырвонае, каралава-чырвонае, агніста-чырвонае, цаглянае, таматавае адценне.

**Для «летняй» жанчыны** падыдуць колеры маліна-выя, цёмна-вінныя, пунсовыя і чырвоныя з адценнем блакітнага колеру.

**Жанчына-«восень»** павінна выбіраць чырвона-карычневы, гранатавы і колер іржы.

**Жанчыне зімовага тыпу** варта спыніцца на свежым вінна-чырвоным ці выбраць яркі блакітнавата-чырвоны колер.

ПАРАДАК У ДОМЕ

### Чысцім ручкі ў пліты

**Здаецца, што можа быць прасцей: зняў, замачыў у мыльным растворы, прамыў саму паверхню, пад ручкамі — і гатова... Але ёсць такія пліты, з якіх так проста гэтыя самыя ручкі не здымаюцца.**

Нам спатрэбяцца: нашатырна-анісавыя кроплі (чысты нашатырны спірт выкарыстоўваць не раю: задыхняцеся, нават у масцы), вата, ватныя палачкі (каб залезці пад ручку), старая зубная шчотка (для рэльефных паверхняў). Бяром вату, змочаную нашатырна-анісавымі кроплямі, і праціраем ручкі, а дзе дрэнна адціраецца — карыстаемся зубной шчоткай. Паверхню пад ручкамі праціраем палачкамі. І нашы ручкі зноў як новенькія.

**-2897-**

■ Песню бярыце з сабой

# БАЦЬКАЎШЧЫНА

Песня «Бацькаўшчына» Уладзіміра Караткевіча і Ларысы Мурашкі — перлінка беларускай вакальнай музыкі. Гучыць вольна, надзвычай раздольна-велічна, выклікаючы пранікліва-шчымлівыя перажыванні. Суладнасць мастацкага слова з напеўна-задумлівай мелодыяй стварае ўражанне неабсяжнасці роднага краю, яго вечнасці і ўзнёсласці.

У аснову песні пакладзены аднайменны верш У. Караткевіча. Кампазітар выбрала толькі яго асобныя часткі — і стварыла выразна адухоўлены малюнак беларускай прасторы, напоўненай нябесна-зямным ззяннем і па-бацькоўску ласкавай утульнасцю.

Верш «Бацькаўшчына» лірычнай канвой пераклікаецца з лермантаўскім творам «Выхожу один я на дорогу» і з'яўляецца яго духоўным працягам. Адлюстроўваючы юнацкае светаўспрыманне, паэты (а ім на час напісання гэтых вершаў было па 26 гадоў) з абвостраным пачуццём выяўлялі сваё стаўленне да з'яў рэчаіснасці і да асабістага спасціжэння. У беларускім творы з узрушанай цеплынёй распавядаецца пра духоўную злітнасць лірычнага героя з наваколлем — і ў гэтым яго несмяротнасць...

Песні, напісаныя ўжо пасля смерці паэтаў, набылі вядомасць. Да лермантаўскага верша неаднаразова звярталіся многія кампазітары, але асаблівую папулярнасць мае песня, створаная Е. Шашынай сто пяцьдзясят гадоў таму. Вакальны твор «Бацькаўшчына» Уладзіміра Караткевіча і Ларысы Мурашкі паступова пашыраецца. Ён увайшоў у рэпертуар і прафесійных, і самадзейных выканаўцаў.

**БАЦЬКАЎШЧЫНА**

**Верш Уладзіміра Караткевіча**
**Музыка Ларысы Мурашкі**

*Дагарэў за брамай небакрай,*
*Месяц паміж воблачкаў плыве.*
*Выйду зноў, як у мінулы май,*
*Басанож прайдуся па траве.*
*Лашчыцца трава да босых ног.*
*З дальніх паплавоў плыве ракой*
*Чуць заметны сумны халадок —*
*Подых юні ўходзячай маёй.*

*Ціха цмокае у сне рака.*
*О, як добра, як прыгожа жыць!*
*Раска, як русалчына луска,*
*На вадзе ад месяца гарыць.*
*А вакол травіцы роснай рай*
*І бярозак белая сям'я.*
*Мой чароўны беларускі край,*
*Бацькаўшчына светлая мая!*

**Падрыхтаваў Міхась ШАВЫРКІН**




■ У рэгіёне

## «Бярэзінская рампа» збірае тэатралаў

**Прыхільнікі тэатральнага мастацтва Міншчыны змогуць пабачыць пастаноўкі па п'есах Максіма Горкага, Георгія Марчука, Сяргея Кавалёва, Уладзіміра Гуркіна, Сцяпана Лабазёрава, а таксама аўтарскую работу рэжысёра тэатра «Відарыс» з Барысава Ігара Куніцкага.**

Шэсць аматарскіх калектываў Міншчыны пакажуць свае творчыя набыткі падчас VIII абласнога фестывалю народных тэатраў «Бярэзінская рампа», які праходзіць у горадзе Беразіно з 30 лістапада па 2 снежня. У фестывалі прымуць удзел заслужаны аматарскі калектыў Рэспублікі Беларусь драматычны тэатр «Відарыс» Палаца культуры імя М. Горкага, Слуцкі народны тэатр драмы і камедыі імя У. Галубка, народны тэатр Палаца культуры Беларускага аўтамабільнага завода г. Жодзіна, народны тэатр Бярэзінскага раённага дома культуры і іншыя калектывы.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

## «Мерседэс» затрымалі ў Жыгулях

У вёсцы Жыгулі Верхнядзвінскага раёна супрацоўнікамі міліцыі быў затрыманы мікраўтобус «Мерседэс», на якім без адпаведных дакументаў вадзіцель перавозіў тры тоны мяса буйной рагатай жывёлы на суму 150 мільёнаў рублёў. Кіраваў аўто непрацуючы жыхар Шаркаўшчыны. Праводзіцца праверка.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 9.05 | 16.52 | 7.47 |
| Віцебск | 9.02 | 16.34 | 7.32 |
| Магілёў | 8.55 | 16.42 | 7.47 |
| Гомель | 8.44 | 16.46 | 8.02 |
| Гродна | 9.19 | 17.08 | 7.49 |
| Брэст | 9.12 | 17.17 | 8.05 |

**Месяц**

***Поўня 28 лістапада.***
***Месяц у сузор'і Рака.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Мікалая, Платона, Рамана.*
***К.*** *Наталлі, Эдмунда, Элігіума.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**Ну што там накшталт канца свету вырашылі? Мне зімовыя боты купляць ці не?**

Дзве сяброўкі.
— А мяне Васіль на рыбалку запрасіў!
— Абавязкова зрабі прыгожую прычоску і пагалі ногі!
— А я, дурніца, чарвякоў накапала...

**Як высветлілася, файл «моя_самая_страшная_тайна.txt» змяшчаў толькі словы: «Паважаны таварыш жонка! Прашу не лазіць у мой камп'ютар!».**

— Будзеш апельсін?
— Не.
— А калі пачышчу?
— Так.

**Як растлумачыць дзіцяці, што 8 гадзін раніцы ў выхадны — гэта глыбокая ноч?..**

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. КАРПЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), В. КЛЮЧНІК (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by,

(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар.
Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 26.520. Індэкс 63850. Зак. № 5309.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 30 лістапада 2012 года.